Людміла КЛАСКОЎСКАЯ
Аляксандр КЛАСКОЎСКІ

# Станіслаў ШУШКЕВІЧ

## ПУЦЯВІНА ЛЁСУ



Людміла
КЛАСКОЎСКАЯ
Аляксандр
КЛАСКОЎСКІ

# Станіслаў ШУШКЕВІЧ

## ПУЦЯВІНА ЛЁСУ

ПАРТРЭТ ПАЛІТЫКА,
НАВУКОЎЦА, ЧАЛАВЕКА

Мінск
«Полымя»
1994

ББК 66.3(4Беи)6
К47
УДК 323(476)(092) + 929 Шушкевіч

К $\frac{3230000000 — 025}{М\ 306(03) — 94}$ Без аб'яўл.

ISBN 985-07-0061-0

© Л. У. Класкоўская,
А. У. Класкоўскі, 1994

## ТРЫВОЖНЫ СВІТАНАК

Хлопчыка назвалі Стасем — як бацьку. Сын — першынец! — з'явіўся ў сям'і беларускага паэта і журналіста Станіслава Пятровіча Шушкевіча 15 снежня 1934 года.

У драўляным дамку на ціхай мінскай ускраіне, дзе толькі зрэдчас разганялі курэй вазы ехаўшых пад чаркаю з кірмашу сялян, прагучалі традыцыйныя для такой падзеі тосты. Немаўляці і ягоным бацькам зычылі доўгага жыцця і шчаслівага лёсу. Каб заўжды радасна і заможна жылося пад гэтым дахам, куды на агеньчык да вясёлага, кампанейскага гаспадара і гасціннай, ветлай гаспадыні так любілі зазіраць шматлікія сябры — пераважна гэткія ж маладыя літаратары.

Але тосты, як і ўвогуле размовы ў іх даўнім таварыскім коле, на той час ужо страчвалі пакрысе ранейшую акрыленасць і непасрэднасць. І ўсё часцей нават у звыклых пажаданнях адчуваўся нейкі новы, трывожны сэнс. Бы то гучала патаемная малітва: каб не зачапіла, каб зліТавалася, каб згінула ўрэшце тая жахлівая пачвара, драпежнае дыханне якой кожны, здавалася, ужо адчуваў за сваёй спінай.

І ўжо не адна ахвяра была на страшным рахунку. І хто ведае, каму наканавана стаць наступнай...

* * *

На двары — глыбокая ноч.

Даўно разышліся госці, спарадкаваны посуд, соладка заснуў у калысцы віноўнік урачыстасці, а яны, Стась і Алена, усё сядзяць ля стала і сцішана гутараць. Што ні кажы, а іх жыццё пайшло цяпер на новы круг, і, як часта здараецца ў такіх выпадках, чарадой набеглі ўспаміны.

— А памятаеш, як сустрэліся ў інстытуце?

— А то не... Адразу ўсіх кавалераў адпудзіў!

Пасмяяліся. Але ж і сапраўды было, як у старых

раманах,— «з першага погляду». Так і хадзіў за сваёй каханай па пятах, не адпускаючы ні на крок, увесь час, пакуль вучыліся разам у Беларускім педінстытуце. Калі зблізіліся, то высветлілася, што і ў лёсах, і ў захапленнях — шмат агульнага, сугучнага. Пачынаючы з таго, што і ён, і яна выраслі ў вялікіх сем'ях, дзе кавалак хлеба ніколі не даваўся без мазаля, але сэнс жыцця, перш за ўсё дзякуючы бацькам, зусім не зводзіўся да прымітыўных клопатаў пра сытыя страўнікі.

Іх цяперашняе жытло прыдбаў у свой час бацька Алены, Людвік Антонавіч. Ведама ж, не харомы — вось гэты пакойчык, дзе яны вядуць гаворку, ды яшчэ кухня і спальня,— але і такі набытак каштаваў Людвіку Антонавічу нямала. Хоць і захоўваў ён атрыманае ў 1913 годзе аж з Санкт-Пецярбурга, з дэпартамента герольдыі царскага сената, пасведчанне аб тым, што з'яўляецца патомным дваранінам, але папера тая магла хіба што цешыць самалюбства, бо ўвогуле іх, Раманоўскіх, род вёўся ад прыгонных сялян і ніколі не ведаў вяльможных раскошаў. Сам жа Людвік Антонавіч мусіў зарабляць капейчыну нялёгкай працай чыгуначнага правадніка, а пазней, калі пагоршала са здароўем, і ўвогуле стаў рабіць у лазні. Да рэвалюцыі ягоная пасада на чыгунцы называлася даволі гучна — обер-кандуктар, і жонка Францішка надзвычай тым ганарылася. Дарэчы, нарадзілася ў іх ні многа ні мала — трынаццаць дзяцей! І каб яны выбіліся ў людзі, займелі добрую працу, трэба было найперш, ахвяруючы многім, даць малым належную адукацыю. Здольная, кемлівая Алена скончыла спачатку сямігадовую школу, потым — тэхнікум, а крыху панастаўнічаўшы на вёсцы, паступіла ў інстытут. Тут яна хутка вылучылася першымі літаратурнымі поспехамі, а таксама бліскучым веданнем польскай мовы (культура суседняй краіны ўвогуле была адным з вялікіх яе захапленняў). Праз нейкі час дзяўчыне даверылі нават чытаць лекцыі па польскай літаратуры малодшым студэнтам. А пазней, пасля інстытута, узялі на Беларускае радыё — весці перадачы па-польску. Ну, і, вядома ж, як даўно было дамоўлена, атрымаўшы дыпломы, пажаніліся са Стасем.

То быў увогуле багаты на падзеі год. Іх імёны загучалі ў літаратурным асяродку. Убачыў свет першы зборнік Стасевых вершаў. А яна, ужо чакаючы дзіця, пабывала на Першым з'ездзе савецкіх пісьменнікаў у Маскве. Бачылася нават з Крупскай, паказвала ёй свае кніжкі. Але цяпер усе творчыя дасягненні адступілі перад гэтай доўгачаканай падзеяй — нарадзіўся сын!



Маці — Алена Людвікаўна

— Пацяплее — давай з'ездзім са Стаськам у Шчытоміравічы, да маіх...

Алена згодна кіўнула мужу. Ведама ж, хочацца, каб усе сваякі хутчэй пабачылі нашчадка.

Там, у вёсцы, што ў дзесяці кіламетрах ад Мінска, жыў Пятро Іосіфавіч, мужаў бацька. Алена паспела ўжо добра пасябраваць са свёкрам — разумным, дасціпным селянінам. У ягоных вялікіх, натруджаных руках часта можна было бачыць старыя, дарэвалюцыйныя календары, газеты з вершамі Коласа, Купалы. Усё гэта старанна захоўвалася шмат гадоў, з таго часу, як Пятро Іосіфавіч упершыню быў зачараваны простымі і мілагучнымі радкамі, складзенымі на роднай, «сялянскай», мове. Ён вельмі хацеў, каб сын стаў адукаваным чалавекам. Урэшце, Стася не трэба было цягнуць у навуку за вушы: той сам з ахвотай карпеў пры газнічцы над кніжкамі, потым падаўся на вучобу ў Мінск і таксама, як



Бацька — Станіслаў Пятровіч

і ягонае будучая жонка, не пазбег салодкай спакусы ўласных літаратурных спроб.

Сталіца сустрэла хлопца сапраўдным віраваннем маладога творчага жыцця. Хутка з'явілася шмат сяброў — пераважна гэткіх жа сялянскіх сыноў, што, паклаўшы ў торбачку бохан хлеба ды некалькі аркушаў з наіўнымі рыфмаванымі радкамі, рушылі ў сталічны горад, каб здабыць веды, а мо — чым чорт не жартуе! — і паэтычную славу.

То быў час прастадушнай юначай веры ў гучныя лозунгі «новага жыцця», абвешчаныя партыяй бальшавікоў. Усталяваўшы сваю жалезную ўладу на каласальных абсягах ад Палесся да Камчаткі, партыя паабяцала пабудаваць тут нябачаны ў гісторыі зямны рай для мільёнаў і мільёнаў людзей, для дзесяткаў народаў. І замардаванаму вайной, галечай, разрухай простаму люду так хацелася, каб гэты цуд збыўся! Здавалася, ягоныя абрысы паўстаюць ужо на гарызонце — і ахоплены рамантычным імпэтам літаратурны маладняк 1920-ых гадоў спаборнічаў ва ўзнёслым рыфмаванні сваіх шчырых ілюзій.

Радасць мая звоніць
Словам маладым
Ад сялянскіх гоняў,
Ад сялянскіх ніў.
Ад дуброў шумлівых,
Ад вясковых хат,
Дзе жыцця імклівы
Крочыць новы лад.

Так напісаў ён, паэт-пачатковец, восем гадоў назад, у 1926-ым.

«Крочыць новы лад». І ў рамантычным ап'яненні яшчэ не заўважаўся злавесны, драпежны поступ пачвары, якая неўзабаве распачне свой крыважэрны баль, раз-пораз выдзіраючы са знаёмага асяродка новыя і новыя ахвяры.

...Здалося, рыпнулі веснічкі. Яны абодва на хвіліну сціхлі, прыслухоўваючыся. Не, нікога.

За акном — глухая, чорная ноч. І зіма — сцюдзёная, лютая. Але ў хатцы цёпла, утульна, і бесклапотна пасопвае ў калысцы маленькі чалавечак — іх крывінка.

* * *

Лейтэнант дзяржбяспекі дзюбнуў пяром у чарніліцу (ох, чарніла ўжо ледзь-ледзь на донцы, столькі пісаць даводзіцца — проста катарга!) і хуценька закончыў чарговую службовую паперу:

«Я... разгледзеўшы следчую справу... знайшоў, што літаратурны супрацоўнік газеты «Звязда» Шушкевіч Станіслаў Пятровіч з'яўляецца актыўным удзельнікам контррэвалюцыйнай фашысцкай арганізацыі, выкрытай у Мінску. А таму пастанавіў: Шушкевіча С. П. ... арыштаваць і ў кватэры зрабіць вобыск».

Ага, пра дату ледзь не забыўся. Так, пазначаем: «1936 г., 14 лістапада».

Ну, вось, цяпер засталося толькі завізаваць у начальніка аддзела ды ў пракуратуры. А за гэтым справа не стане — можна не сумнявацца. План па выкрыццю ворагаў народа ўсім выконваць трэба, інакш нядоўга і самім загрымець да чорта на рогі — за страту рэвалюцыйнай пільнасці...

* * *

Цень пачвары ахінуў усю агромністую дзяржаву. Але і ў гэтым змроку зіхацелі іскрынкі творчага розуму, неардынарнасці, таленту. І яны прыводзілі пачвару ў шаленства. Ёй патрэбна была суцэльная цемра. У гэтай цемры ўлада пачвары будзе непадзельнай і вечнай.

* * *

...Стасік прачнуўся ад грукату і чужых галасоў. У пакоі былі нейкія незнаёмыя дзядзькі. Чаму гэта яны без дазволу бяруць таткавы кніжкі?

Малы пратэпаў па падлозе і з цікаўнасцю дакрануўся да бліскучай скуранай цацкі на рамяні аднаго з дзядзькоў. Той адскочыў, бы ўджалены, рэзка крутнуўся, ліхаманкава расшпільваючы кабуру,— перакошаны твар, вылупленыя вочы...

Убачыўшы, што перад ім дзіця, з палёгкай выцер раптоўна ўзмакрэлы лоб і сіпла растлумачыў здзіўленым таварышам:

— Фу, ты, ч-черт — думал, нападение... Хозяйка, ну-ка, убери своего постреленка!

Стасік, бы шукаючы паратунку, зірнуў на тату. У таго быў нейкі зусім незнаёмы твар — стары і шэры.

* * *

Змрочны калідор Мінскай турмы НКУС. Гулкае рэха крокаў. Яго вядуць на чарговы допыт. Які гэта па ліку? Пятнаццаты? Дваццаты? І што цяпер — раніца ці вечар? У галаве звініць ад невыноснай стомы, думкі блытаюцца...

Следчы павалі ўздымае ад папер азызлы твар, на якім паспела прабіцца шчаціння, машынальна трэ чырвоныя, бы ў труса, вочы. Ён таксама страшэнна стаміўся, мабыць, ужо каторую гадзіну запар працуючы на гэтым шалёным канвееры...

— Мінулы раз вы назвалі не ўсіх сваіх знаёмых,— манатонна пачынае следчы.— Успамінайце лепей...

І раптам, не даслухаўшы, рэзка:

— А пра сваякоў у Польшчы забыліся?!

Пытанні пачынаюць сыпацца гарохам:

— Хто ўцягнуў вас у контррэвалюцыйную арганізацыю?

— Дзе праходзілі вашыя зборышчы?

— Якую антысавецкую работу праводзілі асабіста вы?

Праз нейкі час, адкінуўшы усе цырымоніі, чалавечак з трусінымі вачыма крычыць ужо так, што напінаюцца сінія жылы на шыі:

— Ты ў мяне зараз загаворыш, шпіёнская морда!

* * *

Калі набягалі думкі пра Алену і Стаську, хацелася ўскочыць з нараў і што ёсць моцы біць, біць, біць у ненавісныя жалезныя дзверы камеры! Родны дом быў зусім побач, усяго за некалькі кварталаў ад гэтага страшнага будынка ў цэнтры Мінска, але адсюль дадому не вяртаўся ўжо амаль ніхто...

У Мінскай турме НКУС яго пратрымаюць амаль цэлы год — столькі працягнецца следства. Спатрэбіцца шмат часу, каб зламаць волю невінаватых людзей, катаваннямі і шантажом дамагчыся ад іх «прызнанняў» у фантастычных злачынствах. Матэрыялы крымінальнай справы, па якой будуць «праходзіць» яшчэ 12 чалавек — пераважна ягоных калег-літаратараў, ледзьве ўтоўпяцца

ў тры пульхныя тамы. Пад пяром следчага іх таварыская кампанія ператворыцца ў «ячэйку падпольнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі», сумесныя вечарынкі — у «контррэвалюцыйныя зборышчы», а канфіскаваныя падчас вобыскаў паэтычныя кніжкі — у «нацдэмаўскую літаратуру».

* * *

...Трусіныя вочы зноў утаропіліся на яго:

— Вы былі членам ЛКСМБ?

— Так, быў.

— Па якіх прычынах выбылі?

— Быў выключаны за абарону сына кулака Улашчыка — імя не памятаю — які працаваў тады сакратаром кніжнай палаты... Улашчык хацеў купляць кнігі для падшэфнай вёскі не толькі на рускай мове, але і на беларускай. І я ў гэтым яго падтрымаў.

— Вы сустракаліся потым з Улашчыкам?

— Летам 1936 года выпадкова сустрэўся з ім на вуліцы, у нас была кароткая гутарка...

— Так, зразумела...

Следчы старанна зарыпеў пяром. До-обрыя факты! Заступаўся за класавага ворага, патураў ягоным нацыяналістычным замашкам, вербаваў у якасці агента... Сёння — «ураджайны» дзень!

* * *

Пасля заканчэння папярэдняга следства, азнаёміўшыся з матэрыяламі, Шушкевіч адмовіцца ставіць свой подпіс. Але гэта нічога не зменіць. Ягоны лёс быў прадвырашаны яшчэ тады, як лейтэнант дзяржбяспекі дзюбнуў ручкай у чарніліцу, складаючы пастанову аб арышце.

* * *

З абвінаваўчага заключэння ад 15 верасня 1937 года:

«Абвінавачваемыя па гэтай справе з'яўляюцца ўдзельнікамі адной з ячэек падпольнай контррэвалюцыйнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі Беларусі, уваходзячай у склад аб'яднанага антысавецкага падполля. Нацыянал-фашысцкая арганізацыя ставіла перад сабой у якасці канчатковай задачы аддзяленне БССР ад Савецкага Саюза і ператварэнне Беларускай Рэспублікі ў буржуазную дзяржаву пад пратэктаратам Польшчы, праводзіла актыўную шпіёнскую і дыверсійна-тэрарыстычную работу... Удзельнікі нацыянал-фашысцкай арганізацыі... стварылі ў асяродку

контррэвалюцыйна настроеных пісьменнікаў, удзельнічаўшых раней у нацыянал-дэмакратычным руху, падпольную контррэвалюцыйную ячэйку... сістэматычна ладзілі контррэвалюцыйныя нарады на кватэрах... абмяркоўвалі пытанне аб арганізаванай барацьбе супраць кіраўнікоў КП(б)Б, Савецкага Урада метадам тэрору».

З прыгавора спецыяльнай судовай калегіі Вярхоўнага Суда БССР ад 4—5 кастрычніка 1937 года:

«...С. П. Шушкевіча — у якасці пакарання пазбавіць волі ў папраўча-працоўных лагерах тэрмінам на 8 гадоў, усіх асуджаных пазбавіць выбарчых правоў пасля адбыцця пакарання тэрмінам на 5 гадоў».

* * *

Трывожна дрэмле начны Мінск. Яна добра ведае — там, за прычыненымі аканіцамі дамоў, нават у сне людзей не адпускае ліпучы страх, і то адзін, то другі прахопліваецца ў халодным поце, пачуўшы любы гук на двары: няўжо ідуць па мяне?

Алена перахварэла ўжо гэтым страхам, выплакала, здаецца, усе слёзы ў скамечаную падушку. Дома спіць пад бабчыным наглядам Стаська, а яна з сяброўкай шыбуе ўздоўж трамвайных рэек на чыгуначны вакзал. Усе трамваі ўжо даўно прагрукалі коламі ў дэпо, шлях няблізкі, але ісці трэба. Яны цяпер — сяброўкі па няшчасцю: у абедзвюх мужы асуджаны, і ў любую з гэтых начэй вязняў могуць адправіць у Сібір. Хоць бы на хвілінку ўбачыць родны твар, прыціснуцца да грудзей!..

Сёння іх паход будзе дарэмным. І заўтра, і паслязаўтра... Так будзе доўжыцца два месяцы. Аднойчы сяброўка адмовіцца ісці: не стане моцы... А яна менавіта ў тую ноч убачыць ля арыштанцкага вагона свайго Стася і паспее перадаць яму клунак з цёплай вопраткай.

Праз шмат часу, атрымаўшы ліст з Сібіры, яна даведаецца, што муж сяброўкі замерз у тым сцюдзёным зімовым вагоне, а яго, Стася, уратавала менавіта тая цёплая вопратка.

Ён цудам ацалее і ў гулагаўскім пекле, вернецца на Беларусь у 1947 годзе. Ды ненадоўга. У жніўні 1949-га — паўторны арышт. Прысуд Асобай нарады пры МДБ БССР: ссылка. За «старыя грахі». І зноў — Сібір. Толькі пасля смерці Сталіна, у 1954-ым, прэзідыум Вярхоўнага Суда БССР канстатуе: «Як бачна з матэрыялаў справы, папярэдняе і судовае следства праведзены павярхоўна, неаб'ектыўна, без

праверкі. Прысуд вынесены пры адсутнасці дастатковых доказаў». І рэзюмуе: «Прысуд... адмяніць... за недаказанасцю складу злачынства». А канчаткова справядлівасць будзе адноўлена толькі ў 1975-ым, калі той самы Вярхоўны Суд прыйдзе да высновы аб поўнай адсутнасці ў ягоных дзеяннях складу злачынства. Але і потым, калі Станіслаў Пятровіч зноў стане друкаваць свае вершы, у біяграфічных даведках пра аўтара рэдактары доўга яшчэ будуць ужываць цынічны «эўфемізм»: «У 1937—1956 гг. працаваў у геалагічных экспедыцыях у Сібіры». Яны, рэдактары, патыліцай будуць адчуваць: жахлівая пачвара, што ператрушчыла столькі лёсаў, зусім не згінула, яна затоена дыхае недзе побач...

* * *

Стасік круціўся ля маці, торгаў за рукаў: яму хацелася пагуляць, падурэць і было дзіўна, што маці, якая звычайна ахвотна адгукалася, сядзіць цяпер нерухома і застылым позіркам глядзіць на газетны аркуш.

А ў яе бы ўсё скамянела ў душы. І сапраўды, бяда адна не ходзіць. Сённяшні брудны, поўны лаянкі фельетон пра яе, жонку «ворага народа»,— гэта таксама прысуд. На працы цяпер, вядома ж, не ўтрымацца. І добра, калі скончыцца толькі гэтым...

Так яно і сталася: неўзабаве звольнілі. Праўда, перад тым далі «шанц»: устань на сходзе і пры ўсіх закляймуй мужа-злачынцу — мо, неяк і абыдзецца.

Яна з гневам адмовілася... І потым, калі даводзілася запаўняць бясконцыя анкеты, не ўтойвала, а наадварот, з нейкім унутраным выклікам пазначала, што з'яўляецца жонкай асуджанага.

Неўзабаве — новы ўдар: выключылі з камсамола. А гэта яшчэ адна «пляма» ў анкеце, убачыўшы якую ніводзін начальнік не рызыкне браць на працу. Калі галасавалі за выключэнне, яна па вачах бачыла: хто-ніхто спачувае, але страшэнна баіцца мовіць хоць слоўца ў абарону. Затое аж заходзіўся ад выкрывальніцкага пафасу адзін малады, аднак ужо заўважаны «наверсе» за сваю адданасць паэт. Відаць, ён добра ведаў, дзеля чаго так шчыруе,— у хуткім часе ягоныя вершы, зусім не адметныя літаратурным бляскам, але «ідэйна вытрыманыя» з'явяцца нават у школьных хрэстаматыях. Дарэчы, і той гнюсны фельетон напісаў таксама калега-пісьменнік, які некалі па-дружбацку паляпваў яе мужа па плячы...

Што ж, яны свайго дамагліся — паказалі жонцы «ворага народа» дзе ракі зімуюць. Цяпер у хаце ні капейчыны, акрамя ж яе — трое галодных ратоў, малы ды старыя бацькі. (Людвік Антонавіч, бацька, цяжка захварэўшы, неўзабаве памрэ...)

Накінула хустку, рушыла да дзвярэй.

— Куды, дачушка?

— У дзяржбяспеку.

— Што ты, апамятайся!

Але яна зрабіла па-свойму. Чын з НКУС аж падняўся міжволі з крэсла, калі жанчына, што папрасілася на прыём, раптам выпаліла:

— Арыштуйце і мяне! Жыць няма за што, усе ад нас адвярнуліся... Бярыце, арыштоўвайце!

Вынік быў нечаканы. У хуткім часе ёй дазволілі выкладаць у школе.

Трэба было неяк жыць, гадаваць Стасіка. Пакрысе пачала вучыць з ім літары. Хлопчык, хоць і рос непаседам, адразу быў прыліп да буквара. І к чатыром гадам ужо чытаў па-сапраўднаму. У іх хаце заўжды размаўлялі па-беларуску, але з матчынай дапамогай Стасік неўзабаве пачаў як семкі лускаць і рускія і польскія тэксты. Поспехі ўнука ў польскай мове асабліва цешылі каталічку-бабулю, якая цішком пачала захвочваць яго да вывучэння малітваў. Справа ішла пры задаволенасці абодвух бакоў, бо за вывучаны «ўрок» выдавалася шчодрая ўзнагарода: пяць капеек, за якія па суседству, у заводскай сталоўцы, можна было пачаставацца шклянкай казачна смачнага кісялю, што з'яўлялася непараўнальнай асалодай для кожнага хлапчука з іх вуліцы.

А яшчэ — цяпер ён мог сам пісаць лісты бацьку ў Сібір. Шлях у іх быў, відаць, доўгі і цярністы, пільныя цэнзары прыдзірліва вывучалі, ці няма якой крамолы ў няроўных дзіцячых радках... У адным з адказаў бацька распавёў пра гэта вершамі:

> У таежную глуш ты прыслаў мне пісьмо,
> Яно доўга шукала мяне і блукала,
> На ім надпісаў шмат, і пячатак каймо,
> І канверцік чужая рука разарвала.

Кожны ліст ад таты адгукаўся ў сэрцы адначасова і радасцю, і болем.

Радасцю — ад таго, што ён жывы і спадзяецца рана ці позна вярнуцца дадому. Болем — ад таго, што невядома, колькі яшчэ давядзецца чакаць той хвіліны.



**Вось так выглядаў будучы Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі ў маі 1937 года**

*«Дарагі мой сын!*

*Моцна засумаваў я па табе, так як ніколі засумаваў. Днём і ноччу цяжкія думы прыходзяць у галаву. Вясна ідзе, усё ажывае, усё радуецца, а ў мяне на сэрцы восень. Да гэтага часу яшчэ не разгледжана мая заява і мая справа ў пракуратуры СССР... Заява на чарзе да перагляду. А калі перагледзяць, дык сам не ведаю. Апошняе пісьмо, якое ты датаваў 23 студзеня, атрымаў я ў лютым. За пісьмо моцна, моцна дзякую. Пару дзён таму атрымаў кнігі (2 бандэролі). За іх і слоў не знаходжу для падзякі. Моцна абрадаваўся і адразу, як толькі вярнуўся з работы, да позняй начы сядзеў над імі.*

*...У мяне дык зусім няма ніякіх навін. Кожны новы дзень нічым не розніцца ад папярэдняга. Толькі адно ў мяне і засталося — гэта ўспаміны пра цябе.*

*Дарагі мой сын, адно памятай, што калі не хопіць у мяне сіл перамагчы вялікую несправядлівасць, калі не прыйдзецца цябе ўбачыць, калі не хопіць сіл даказаць, што я не заслужыў гэтай кары, якая звалілася на мяне, дык памятай, што я быў і застаюся чэсным савецкім грамадзянінам...*

*Родны мой, харошы!*

*Цалую цябе тысячу разоў, моцна, моцна.*

Твой тата Стах.

28.III.1940 г.»

* * *

З заявы зняволенага Шушкевіча С. П. у прэзідыум Вярхоўнага Суда БССР ад 23 кастрычніка 1940 года:

«...Я не вінаваты. Паклёп стаў падставай для суровага, несправядлівага прысуду... Былі парушаны нават самыя элементарныя законы аб судовым ладзе. Частка абвінавачванняў была пабудавана на маіх вымушаных паказаннях. Прашу перагледзець маю справу, я не вінаваты».

З заключэння старшыні Вярхоўнага Суда БССР ад 2 чэрвеня 1941 года:

«...скаргі зняволеных пакінуць без наступстваў».

* * *

Аднойчы ў нядзелю бабуля ўрачыста абвясціла: ідзём у парк Горкага!

Стасік быў на сёмым небе. І раптам...

— Вайна!

Дарослыя, скамянеўшы, слухалі металічны голас з талеркі рэпрадуктара.

* * *

Усё наўкол гарэла. У небе над Мінскам вылі самалёты з крыжамі на крылах. Па вуліцы з клункамі цягнуліся жанчыны, дзеці, старыя. Трэба было неяк ратавацца і ім. Хуценька кінулі тое-сёе ў торбы. Алена трывожна азірнулася: а куды ж падзелася маці?

Але старая Францішка ўжо з'явілася на парозе, дзелавіта далажыла:

— Дзверы ў хляве адчыніла. Калі загарыцца, то хай хоць парсюк уратуецца.

— Ой, ды хіба тут да парсюка?! Спяшацца трэба. Людзі кажуць, лепей за ўсё кіравацца на Барысаў...

Стась між тым моўчкі адобрыў бабулін учынак: жвавы, хітраваты парсюк з'яўляўся агульным любімцам, і ягоная пагібель у лютым полымі сапраўды была б зусім недарэчы.

Ідучы па вуліцы, маці з бабуляй раз-пораз прыспешвалі Стася і малодшую Ірынку. Малым жа было чамусьці зусім не страшна, а нават цікава назіраць за ўсім тым вэрхалам, што рабіўся наўкол...

Прайшлі на ўсход кіламетраў, мо, трыццаць. І раптам па ланцужку бежанцаў пранеслася:

— Дэсант! Немцы выкінулі наперадзе дэсант і перарэзалі шлях. Трэба вяртацца!

Як ні дзіўна, але сярод папялішчаў яны ўбачылі на сваёй роднай Сляпянскай зусім ацалелыя дом і хлеў. Побач у зарасніку чулася лянівае рохканне. Бабуля пашыбавала туды і пераможна выцягнула за вушы абсалютна жывога і здаровага парсюка.

Стась жа, без дазволу збегаўшы ў разведку, далажыў маці: ніякіх немцаў пакуль што не бачна, толькі нейкія людзі цягнуць, што трапіла пад руку, з разбітых складаў.

— Можа, і я злётаю чаго прынясу?

Маці не вытрымала:

— Я табе зараз злётаю!..

Стась, аднак, трохі счакаўшы, усё адно выслізнуў цішком з дому, але неўзабаве вярнуўся расчараваны. У разбітых складах ужо толькі гуляў горкі ад дыму вецер...

* * *

Страх прыйшоў пазней.

Будынак у канцы іх вуліцы, дзе раней быў радыёзавод, занялі немцы. Паставілі ахову, кулямёты. Злосна брахалі аўчаркі. Пайшла чутка, што там размясцілі нейкую сакрэтную эсэсаўскую часць з лабараторыяй. Па ўсім відаць, пачуваліся новыя гаспадары будынка не зусім спакойна. Асабліва калі на горад пачалі налятаць савецкія самалёты. Тады кулямётчыкі шалёна лупілі ў белы свет як у капейку. Аднойчы падчас налёту Стась неўпрыкмет ад дарослых выпаўз з выкапанай у садзе ямы, дзе яны хаваліся ад бомбаў, і выглянуў на вуліцу. Яе перабягала нейкая раскудлачаная, відаць, страціўшая ад страху розум жанчына. І раптам ударыў кулямёт з таго канца вуліцы... Жанчына снопам павалілася ў пыл.

То было ўпершыню, калі на ягоных вачах забілі чалавека. І кашуля імгненна прыліпла да спіны: гэтаксама ж могуць і маці, і Ірынку, і мяне...

А падчас чарговага налёту бомба разарвалася літаральна ў двух-трох дзесятках крокаў ад іх ямы. Яшчэ б трохі, і... Ад вялізнай варонкі агідна патыхала пахам смерці.

На зіму Стася выправілі ў вёску да дзеда — там спакайней ды і кубелец паўнейшы, а тут, у згалелым горадзе, хоць бы меншую, Ірынку, неяк пракарміць... Сустрэча са сваякамі была, праўду кажучы, трохі азмрочана — Стась нечакана знараваўся, калі баба Верка плесканула ў ночвы вады з чыгунка, наважыўшыся трохі апаласнуць хлопца з дарогі. Ці то вада падалася занадта гарачай, ці яшчэ які чорт падаткнуў, але закапрызіў так, што аж даў лататы ў лес. У выніку ж ганебна загруз па грудзі ў вялізнай гурбе, дзе і быў неўзабаве злоўлены. Дзед з бабай, як ні дзіўна, не сталі сварыцца, і таму было яшчэ больш сорамна. Ён усяляк стараўся загладзіць віну, і недарэчны інцыдэнт хутка забыўся. А баба Верка — другая дзедава жонка (першая, Ружана, памёрла зусім маладой) — аказалася пры бліжэйшым знаёмстве на дзіва добрай, клапатлівай жанчынай. І хутка ўжо не заўважалася, як страшэнна знявечаны нямецкім асколкам яе твар,— бачыліся толькі заўжды цёплыя, спагадлівыя вочы. Асабліва ж хораша было сядзець вечарамі ля гарачай печы і слухаць, як дзед Пятро з натхненнем, лепей, чым некалі артысты па радыё, дэкламуе, амаль не зазіраючы ў пажоўклы дарэвалюцыйны каляндар, Коласаву «Новую зямлю». Стась ужо ведаў, што пасля слоў «Мой родны кут, як ты мне мілы!..» дзед, хутчэй за ўсё, глыбока ўздыхне і на хвіліну змоўкне — мусіць, зноў згадае пра сваіх

сыноў, Стасевых дзядзькаў, якіх ваенная віхура вырвала з роднага гнязда, кінула ў прамерзлыя акопы, пад чужынскія кулі... Доўга будзе чакаць дзед Пятро звестак з фронта, ды толькі стануцца яны страшнымі, чорнымі. І да скону жыцця не адступяць пакутлівыя думкі пра тое, што, можа, нават непрыбраныя, на пацеху груганам, ляжаць недзе костачкі ягоных дарагіх хлопчыкаў... Паміраючы ў 1954-ым, ён цвёрда загадае, каб адшукалі святара і пахаванне зрабілі па поўным праваслаўным абрадзе — мо, тады хоць на тым свеце знойдзе спакой ягоная збалелая душа...

А пакуль што дзед Пятро старанна дэкламуе Стасю Коласавы вершы, і абодвум ім добра, утульна.

Вясной, калі надыдзе час вяртацца ў Мінск, развітвацца з дзедам будзе вельмі шкада.

* * *

Вароты адчыніліся, і з-за калючага дроту на вуліцу пачаў выпаўзаць натоўп вязняў, абапал якога крочылі ахоўнікі з бліскучымі кароткімі «шмайсерамі».

Стась заўважыў у натоўпе матчыну постаць, вужом праслізнуў між ахоўнікаў і хуценька перадаў у яе рукі гарачы яшчэ чыгунок з дранікамі.

Сюды, у лагер на вуліцы Шырокай, маці трапіла, нават не ведаючы як след за што — па нейкім выпадковым, недарэчным падазрэнні...

Штодня бабка смажыла з апошніх прыпасаў дранікі, складала ў гліняны чыгунок і, перахрысціўшы Стася, выпраўляла яго на Шырокую. Заставалася толькі цікаваць момант, калі вязняў павядуць на працу ці з працы...

Звычайна авантура ўдавалася. Толькі аднойчы ахоўнік схапіў яго за каўнер ды даў такога кухталя, што чыгунок ляснуўся вобзем і дранікі засталіся ў вулічным пыле...

А месяцы праз два здарыўся цуд: маці вызвалілі. Расказвала, што выпадкова натрапіла на таго немца, які яе арыштоўваў.

— Паночак, даражэнькі, адпусціце да дзетак, я ж зусім невінаватая!

Прасіла, бадай, без усялякай надзеі, але ў таго, відаць, нешта варухнулася ў душы. Можа, успомніў, якімі вачыма глядзелі Стась і Ірынка, як забіраюць матулю?..

То быў найшчаслівейшы дзень, калі яна вярнулася. Але нацярпецца і нагледзецца ім давядзецца яшчэ ўсялякага...

Недалёка ад іх хаты, побач з Камароўкай, гітлераўцы ўсталявалі шыбеніцы. Там каралі смерцю партызан і падпольшчыкаў, зганяючы на жахлівае відовішча жыхароў навакольных вуліц. Аднойчы на былым радыёзаводзе нешта вухнула. Гітлераўскія салдаты імгненна ачапілі ўсю Сляпянскую, пачалася аблава на дыверсантаў. І гора было любому падазронаму, што трапіцца на вочы...

Гэткім жа неадступным, пакутлівым, як і страх, быў тады для многіх голад. Іх сям'ю яшчэ ратавала гаспадарка: садок, градкі, парсючок, а галоўнае — каза. Бабуля на яе малілася ў самым літаральным сэнсе. Пасвіць жа рагатую карміцельку найчасцей даводзілася Стасю. Абавязак гэты далёка не заўсёды выклікаў захапленне, асабліва калі хлопцы клікалі пагуляць. Аднойчы так пасварыўся з сястрой — каму весці казу на пашу,— што са злосці шпурнуў у малую каменем. Дзякуй Богу, не трапіў... Але сумленне ўсё адно грызла, і вечарам Стась сам раскаяўся перад маці. Бо ўвогуле з сястрычкай ён шчыра сябраваў і часта браў з сабой на гульні, хоць малая няўклюда іншым разам была толькі замінішчам у хлапечых забавах.

Гулялі ж, як і ў ранейшыя часы, у даганялкі, жмуркі, «пікара». Мабыць, падчас такіх дзіцячых зборышчаў і сталі яны добрымі таварышамі з чорнавалосым Гарыкам Шыфрыным. У гэтага хлопчыка, нават калі ён смяяўся, не згасаў у вачах нейкі дарослы сум. Шмат хто з ягоных сваякоў загінуў у Мінскім гета. А іх сям'ю выратавала тое, што маці была армянкай і некалі запісала малых у свой пашпарт. Але суседзі ўсё адно стараліся трымацца ад іх далей, бо добра ведалі: калі акупацыйная ўлада разнюхае што да чаго, то за дружбу з сям'ёй яўрэя, які да таго ж ваюе ў Чырвонай Арміі, па галоўцы не пагладзяць...

У Стасеву хату Гарык заходзіў першы раз баязліва сцяўшыся: а раптам дарослыя закрычаць, прагоняць? Але цётка Алена наліла і Стасю, і яму па кубку казінага малака, дала па лусце хлеба. Асмеліўшыся, хлапчук стаў аглядаць хату. Больш за ўсё яго ўразіў велізарны стары раяль. Так і не дапяўшы, як яго маглі зацягнуць праз такія маленькія дзверы, Гарык зрабіў адзіна верагодную выснову: напачатку, мусіць, паставілі раяль, а потым ужо вакол яго зрабілі сцены і столь.

А яшчэ Стась паказаў яму свае кнігі. Гэта былі толькі рэшткі бацькавай бібліятэкі — тое, што не забралі

і не спалілі тыя людзі, што прыходзілі арыштоўваць яго ў 1936-ым. Але і ацалелыя кнігі падаваліся сапраўдным багаццем. Асабліва ганарыўся Стась дзесяццю тамамі «Малой Советской Энциклопедии». Мог гадзінамі чытаць усё запар, пачынаючы наўгад з любой старонкі, і часам нават маці ставіў у тупік экзатычнымі малавядомымі тэрмінамі. Праўда, Чэхаў і Талстой пакуль што выглядалі нецікавымі, сумнаватымі — да іх чарга дойдзе пазней.

З тае пары Гарык ужо без боязі завітваў да сябра. Цікава было гартаць са Стасем кніжкі, седзячы на цёплай, утульнай печы. А вяршыняй шчасця было, калі на развітанне цётка Алена давала скварчыну. (Гарыкава маці толькі зрэдку магла купіць на Камароўцы шматок сала і заўсёды рэзала на драбнюткія кавалачкі — глытнеш і не заўважыш.) Хлопец бег з пачастункам дахаты, у пакойчык, дзе на дзевяці квадратных метрах туліліся яшчэ маці, брат і сястра, і тады ў іх сям'і было сапраўднае свята.

А потым надышоў дзень, які святкавала ўся вуліца.

Немцы беглі з горада. Яшчэ біў іхні кулямёт са старога касцёла, што стаяў непадалёк, ля каталіцкіх могілак, але ўжо было зразумела: ідзе вызваленне!

І сапраўды: у хуткім часе па суседняй Савецкай вуліцы прагрымеў гусеніцамі першы танк з зоркаю на вежы.

Хлапчукі адразу ж сталі шастаць па пакінутых немцамі будынках. Стась, вядома ж, не адставаў ад іншых. Асабліва цікава было, калі ў адным месцы згледзелі партрэт Гітлера, вывалаклі на двор і сталі спаборнічаць: хто трапіць фюрэру ў вока? Білі, між іншым, не толькі з рагатак: найбольш увішныя паспелі разжыцца сур'ёзнымі трафеямі — накшталт ракетніцы ці нават пісталета. Зрашаціўшы партрэт, сталі лупіць па знойдзеных тут жа гляках са спіртам. Апошняя акалічнасць, праўда, прыйшлася недаспадобы савецкім салдатам, што з'явіліся неўзабаве... Урэшце, жыхары Сляпянскай, відаць, знайшлі чым пачаставаць вызваліцеляў і вечарам на вуліцы было весела: смех, звон чарак, пераборы гармоніка... Пад кашлатым клёнам насупраць Стасевага дома стаяў танк: яго схавалі пад шаты для маскіроўкі на выпадак налёту. І не дарэмна: крыху ачомаўшыся, фашысты пачалі раз'юшана бамбіць страчаны горад, ператварыўшы яго на некалькі дзён у суцэльнае пекла. Тысячы мінчан, здолеўшых перажыць тры гады акупацыі, загінулі

менавіта ў тыя дні. Армады бамбавозаў найчасцей налятаі пад покрывам цемры, таму Стась разам са сваімі хадзіў начаваць за горад. І проста не верылася вачам, калі штораніцы сярод бясконцых дымных руін і папялішчаў (здавалася, у Мінску не засталося ўжо каменя на камені) яны зноў знаходзілі свой зусім цалюткі дамок! Бабуля чарговы раз горача дзякавала Богу, які пасля стольхіх выпрабаванняў вырашыў, мусіць, нарэшце злітавацца над іх сям'ёй. Фронт каціўся ўсё далей на захад, і неўзабаве бамбёжкі сціхлі. Мінск стаў пакрысе вяртацца да паўзабытага ўжо мірнага жыцця.

І трэба было збірацца ў школу.

# ШКОЛА

— Хлопцы, давайце ў футбол! Дзе вароты будуць?

У якасці варотаў аднадушна выбралі пралёт нечага паркана.

Да першага ўрока яшчэ пяць хвілін — процьма часу! — і як тут не скарыстаць магчымасць, каб атрымаць невялічкі зарад бадзёрасці перад доўгім сядзеннем ў цесным класе! Тым больш што пад ногі трапіла выдатная бляшанка з-пад тушонкі.

Стась кінуў у траву проціваганую сумку з падручнікамі (сапраўдны, куплёны партфель меў у іх класе, здаецца, толькі адзін хлопец — сын дацэнта) і з задавальненнем далучыўся да гракоў.

— Го-о-ол!

Бляшанка гучна бразнулася аб штыкетнік, на двары заліўся брэхам сабака, а яны, падхапіўшы сумкі, стрымгалоў панесліся ў школу.

Засопшыся, уляцелі ў клас разам са званком. Стась з пачуццём перавагі паглядзеў на купку хлопцаў, што ліхаманкава спісвалі з нечага сшытка хатняе заданне. У яго такіх праблем няма, таму і можна бесклапотна паганяць лішнюю хвіліну тую бляшанку. «Энцыклапедычныя веды!» — як сказаў напаўжартам хтосьці з настаўнікаў. А калі сур'ёзна, то прачытаныя падчас вайны амаль ад вокладкі да вокладкі дзесяць тамоў «Малой Советской Энциклопедии» ды іншыя кнігі сапраўды далі адчувальную фору. Рабіць тыя хатнія заданні, над якімі іншыя б'юцца як галавой аб сцяну, для яго — бы семкі лускаць. Ды і вершы напамяць, здаецца, самі сабой завучваюцца — дастаткова раз-другі прабегчы вачыма па радках...

Праўда, як высветлілася, любы медаль мае і адваротны бок. Стась засвоіў гэтую класічную ісціну, атрымаўшы неяк пасля заняткаў пару добрых кухталёў. Тое, што ён бездакорна («з інтанацыяй», як любяць казаць настаўнікі) прадэкламаваў напамяць велізарны

лермантаўскі верш «Смерць паэта», які больш ніхто з класа так і не адолеў,— гэта зайздроснікі, можа, яшчэ і даравалі б, але тая акалічнасць, што ён з пераможным выглядам працытаваў яшчэ і мудрагелісты эпіграф, ужо ніяк не магла сысці з рук.

Увогуле рэй у класе вялі даволі крутыя хлопцы. (Дарэчы, тады савецкая педагогіка спавядала прынцып асобнага навучання хлапчукоў і дзяўчынак — іх 13-ая школа была выключна «мужчынскай».) Стась, які дзякуючы хатняй падрыхтоўцы амаль адразу быў залічаны аж у чацвёрты клас, аказаўся там самым малодшым. Многія ж з-за вайны мусілі сесці за парты з вялікім спазненнем. Хто-ніхто паспеў ужо зведаць і партызанскае жыццё, раней за вучнёўскую ручку патрымаць у руках вінтоўку. Воўка Рубежын, напрыклад, выводзіў у лес яўрэйскія сем'і з гета... Засмаліўшы дзе-небудзь у патаемным месцы самакруткі, старэйшыя хлопцы любілі важна распавесці пра свае гераічныя партызанскія будні. І, безумоўна, звысоку пазіралі на такую «малечу», як Стасік. Але і ён закусіў губу: хай пабачаць, што «малеча» таксама нечага вартая! Неўзабаве прыйшлі салодкія хвіліны рэваншу, калі тыя бамбізы, многім з якіх навука давалася туга, усё часцей пачалі прасіць, каб ён даў спісаць задачку ці практыкаванне...

Так, лідэрства ў вучобе ўдалося заваяваць даволі хутка і лёгка. Але тая лёгкасць утойвала і небяспеку... Школа праз нейкі час здалася занадта сумнай установай, бо настаўнікі часцяком распавядалі на ўроках пра тое, што ён і так ужо добра ведаў, пра што даўно прачытаў сам.

— Хопіць, у наступны клас не пайду — буду на друкара вучыцца! — агарошыў ён неяк маці.

Чакаў абурэння, падрыхтаваў ужо аргументы (вялікі ж хлопец, адзіны мужчына ў сям'і, а ўсё матчын хлеб есць), але тая, як ні дзіўна, толькі пацiснула плячыма:

— Добра, заўтра пойдзем уладкоўвацца...

У друкарскай вучэльні іх уважліва выслухалі, а потым сівы дзядзька, відаць, старэйшы, разгладзіўшы вусы, разважна сказаў:

— Ведаеш, хлопец, мы цябе за мілую душу возьмем. Але ўмова такая: напачатку сем класаў скончы. Малапісьменных друкароў нам не трэба. Так што чакаем з атэстатам. Вучыся, хлопец!

Толькі праз шмат гадоў Стась даведаецца: напярэдадні маці збегала ў вучэльню: дапамажыце ўкласці сыну розум — няўжо ж ні на што іншае, як у друкарні



1949 год

свінцом дыхаць, ён не варты? Здольны ж хлопец, толькі вось ад рук адбіўся...

Сівы дзядзька, праз чые рукі прайшоў, відаць, не адзін дзесятак падшыванцаў, не пакрыўдзіўся за шчырасць. Згодна кіўнуў галавой:

— Усё, кабета, уладкуем як мае быць...

* * *

У пранізліва-блакітнай марской прасторы плывуць вялікія белыя параходы. Залатым вадаспадам льюцца промні шчодрага паўднёвага сонца. І бронзавая ад загару дзятва з радаснымі клічамі бяжыць насустрач ласкавым хвалям...

Стасю здалося, быццам ён ужо бачыць усё гэта на ўласныя вочы. Але тут цётка-рэдактарка раптам перапыніла паэтычны расказ пра чарнаморскае ўзбярэжжа і строга бліснула акулярамі:

— Дарэчы, ледзь не забылася спытацца: а як у цябе зараз з вучобай? Спадзяюся, усё добра, як і раней?

Сэрца ёкнула. Сказаць шчыра? Тады — бывайце, блакітныя хвалі і белыя параходы!

Ён апусціў вочы і выціснуў:

— Ага... Як і раней...

— Ну, тады добра. Ідзі, хай маці збірае валізку.

Усю дарогу ад Дома друку дахаты яго грызла сумленне. Згадваліся тыя шматлікія ўчынкі апошняга часу, якія зусім не гарманіравалі з правіламі паводзін савецкага школьніка і тым больш не пасавалі юнаму карэспандэнту рэспубліканскай піянерскай газеты.

Складаць заметкі ў газету яму сапраўды падабалася (разгортваеш нумар, а там буйнымі літарамі — «Стасік ШУШКЕВИЧ, деткор»). А вось з вучобай, шчыра кажучы, справы пайшлі зусім наперакасяк. Першапачатковы імпэт неўпрыкмет згас (бадай, якраз таму, што многае давалася занадта лёгка) — і раптам аказалася, што ў жыцці ёсць шмат цікавейшых для хлапчука заняткаў. Напрыклад, калі добра дапячы настаўніцу, яна загадае выйсці з класа, і ты разам з такімі ж свавольнікамі будзеш зухавата ганяць дзе-небудзь у зацішным месцейку ў футбол на зайздрасць тым, хто застаўся карпець над нуднай дыктоўкай.

Апошнім жа разам іх кампанія сцягнула вогнетушыцель і, вырашыўшы пагуляць у «партызанскую засаду», стала падпільноўваць, стаіўшыся на даху двухпавярховай будынiны, якога-небудзь выпадковага прахожага. Добра, што неўзабаве так ніхто і не з'явіўся,

таму чырвоны балон, які карцела хутчэй пусціць у справу, скарысталі для «святочнага салюту».

Без сумнення — каб у рэдакцыі піянерскай газеты ведалі б хоць пра дзесятую частку ягоных «подзвігаў», не бачыць яму ганаровай пуцёўкі ў «Артэк» як уласных вушэй.

Стась яшчэ раз згадаў ганебную хвіліну, калі салгаў цётцы-рэдактарцы, і даў сабе страшную клятву — стаць узорным савецкім піянерам.

* * *

А потым былі два месяцы казкі. Першы раз ехаў па сапраўднай чыгунцы. Першы раз убачыў Маскву — Красную плошчу, метро... І нарэшце упершыню — мора!

Акрамя паўднёвай экзотыкі, там чакаў яшчэ адзін цуд.

То быў хлеб. Горы, горы хлеба! Духмяныя лусты ляжалі ў хлебніцах на кожным стале: бяры — не хачу. Дома маці заўжды танютка наразала атрыманы па картцы бохан і выдавала па лустачцы, кожная з якіх, здавалася, прасвечвалася наскрозь. Хлебныя карткі адменяць толькі праз год...

Згадаўшы пра дом, пра маці, ён зноў адчуў сорам: колькі нерваў каштавалі ёй апошнім часам сынавы свавольствы, дрэнныя адзнакі! І вось цяпер ён тут есць ад пуза, а яны там кожную скібку лічаць...

Два месяцы ў «Артэку» прымусілі шмат пра што перадумаць. Вярнуўшыся дадому, Стась сур'ёзна, па-даросламу заявіў:

— Ведаеш, мама, я вырашыў стаць іншым чалавекам.

Вядома,ператварыцца ў стопрацэнтна ўзорнага савецкага піянера яму, як і любому нармальнаму хлапчуку, было не пад сілу — такія існавалі толькі на плакатах. Але з вучобай, ва ўсякім разе, праблем з тае пары практычна не ўзнікала.

* * *

**Распавядае Станіслава Міхайлаўна ПЕТРУШКЕВІЧ, былая настаўніца 13-ай мінскай школы:**

— Быў Стась дзіцем няпростым. У якім сэнсе? Вельмі шмат энергіі, якой пастаянна патрэбна было нейкае выйсце. Іншым разам яна скіроўвалася і не туды, куды трэба. Памятаю, у шостым класе з-за нечага з Абрамам Затурэнскім моцна пабіўся, аж да крыві... Потым, аднак, яны сталі сябрамі, вельмі блізкімі. І дагэтуль сябруюць.

Стась прагна цікавіўся ўсім — шмат чытаў звыш школьнай праграмы, музыкай захапіўся... Наколькі

памятаю, вельмі падабалася яму старажытная гісторыя, міфалогія. Часта браў таксама ў школьнай бібліятэцы прыгодніцкую літаратуру (асабліва Джэка Лондана любіў), свабодна чытаў кнігі на польскай мове. Выдатна пісаў сачыненні — настаўнікі заўжды іх ставілі ў прыклад. Але, безумоўна, найбольшыя здольнасці — асабліва гэта стала бачна ў старэйшых класах — выявіліся ў яго да фізікі і матэматыкі.

З цягам часу я заўважыла, што ў ягоным характары адбываюцца рэзкія змены,— стаў больш стрыманым, сур'ёзным, адказным за свае ўчынкі. Працаваць з ім у старэйшых класах для настаўнікаў было адно задавальненне. Стаў сярод аднакласнікаў сапраўдным лідэрам, ягонае слова заўжды гучала аўтарытэтна, з яго стараліся браць прыклад.

У нашай школе вучыліся толькі хлопцы, таму на вечарыны запрашалі дзяўчат з суседніх школ. Стась танцаваў то з адной, то з другой, але, здаецца, нікога не вылучаў. Думаю, сардэчныя справы яго тады не надта цікавілі. Нават з выпускнога балю, адкуль усе разыходзіліся парамі, ён пайшоў адзін...

Калі стаў студэнтам, школу не забываў. Мы, шчыра кажучы, часта яго эксплуатавалі — прасілі то разеткі адрамантаваць, то факультатыўныя заняткі правесці.

Даведаўшыся, што наш Стась выбраны Старшынёй Вярхоўнага Савета, я і парадавалася, і ўздыхнула... Вельмі ужо няўдзячную ношу ўзяў ён на сябе. Што ні кажыце, а палітыка большай часткай робіцца బруднымі рукамі. А ён — іншы. Цяжка яму там...

* * *

— Ну, давай, кавалер, прымервай!

Стась накінуў паліто, старанна зашпіліў на ўсе гузікі. Маці, прыдзірліва агледзеўшы яго, засталася задаволеная сваёй работай. Можа, трохі і свабаднавата пашыта, але ж яно і лепей — навырост. Хто ведае, калі ўдасца справіць наступную абнову... Ды і гэты твор яе кравецкага майстэрства абновай можна было лічыць даволі ўмоўна: зыходным матэрыялам паслужыў прыдбаны на таўкучцы шынель (да таго ж — жаночы). Урэшце гэтая акалічнасць сына, здаецца, не бянтэжыла. Зірнуўшы ў люстэрка, Стась пераканаўся, што дзякуючы тытанічным матчыным намаганням пра паходжанне паліто наўрад ці хто здагадаецца і ўвогуле ён будзе выглядаць цяпер сярод сяброў-шасцікласнікаў сапраўдным зухам. Пра абновы з крамы амаль ніхто з іх тады і не марыў. Насілі найчасцей тое, што даставалася

ад старэйшых,— перашытыя гімнасцёркі, замытыя да няпэўнага колеру світкі, лапленыя-пералапленыя штаны. У непагадзь шыкавалі звычайна ў бурках з нацягнутымі на іх чунямі — так называлі самаробныя галёшы, змайстраваныя са старых аўтамабільных камер.

І калі малодшая, Ірынка, магла яшчэ іншым разам закапрызіць, каб ёй нешта купілі, то Стасю ўжо не трэба было тлумачыць, якой цаной даецца маці кожная капейчына. Яна разрывалася адразу на трох працах. Гэта — не лічачы хатняй гаспадаркі. Ды яшчэ з яе здароўем, што стала зусім нікуды не вартае пасля жахлівага запалення лёгкіх... Урэшце, і здаровай, моцнай кабеце не ўсякая праца па плячы — патрэбна цвёрдая і спрактыкаваная мужчынская рука.

Неўпрыкмет Стась вучыўся ад дзядзькоў-суседзяў як след увіхацца з сякерай, малатком ды іншым хатнім інструментам.

Аднойчы давялося натачыць сякеру на самотную працу — аслабаняць садок ад знішчаных лютым марозам яблынь. Хоць дрэвы былі ўжо мёртвыя, усё адно здавалася, бы замахваешся на жывую істоту.

Калі ж з нагоды святочнага дня хатняя рада выносіла прысуд якой-небудзь курыцы — рука і ўвогуле не падымалася. Саромеючыся, што палічаць «слабаком», мусіў, аднак, бегчы па дапамогу да суседа. Затое прыемна было браць рэванш у іншых мужчынскіх справах. Калі ў кагосьці, напрыклад, узнікалі праблемы з электрычнасцю, то звычайна беглі ўжо да Стася: ягонае захапленне электратэхнікай (днямі мог карпець з настаўнікам у школьнай фізічнай лабараторыі) зрабіла хлопца першым аўтарытэтам у гэтай справе на ўсёй вуліцы. У вачах жа сястрычкі ягоны аўтарытэт уздымецца аж да казачных вышыняў, калі на навагодняй елцы заззяе ўласнаручна зробленая Стасем электрагірлянда.

* * *

**Распавядае сястра — Ірына Мікалаеўна ПУПЛІКАВА:**

— Жылі мы тады, вядома, сціпла, па сённяшніх мерках — проста бедна, але ж не галадалі. І па каўбасу ў краму не хадзілі — свая гаспадарка выручала. Стась быў у сям'і за мужчыну, на ім усё трымалася. Маці, бывала, захварэе — перажываем, але за адно я спакойная: усё ў доме і на двары будзе дагледжана, як звычайна. Акрамя іншага, Стась налаўчыўся проста дзівосна квасіць капусту, гуркі саліць. Дарэчы, і праз

шмат гадоў, ужо прафесарам, ён гэтым сваім майстэрствам будзе ўсіх гасцей у захапленне прыводзіць. А пабачылі б, як ён звычайны селядзец разрабляе,— проста віртуозна, я так ніколі не здолею!

Калі муж ці сын у кватэры паліцу да сцяны прыладкуе,— міжволі касавуруся, ці не зваліцца часам на галаву, калі ж гэта Стасева работа,— упэўнена: зроблена навечна. Ён ва ўсіх справах такі — надзейны.

Памятаю, аднойчы маме зрабілася надта дрэнна. Лякарства мы мелі напагатове, трэба было тэрмінова ўкол зрабіць. Я не змагла — рукі калаціліся. А Стась — змог, хоць сам трымаў той шпрыц, мусіць, упершыню ў жыцці. Маці ў апошнія свае гады цяжка хварэла. Ён, калі спатрэбілася, кожны вечар прыязджаў (жыў тады ўжо асобна), даглядаў як мог. І бабулю ў свой час — таксама. Абедзьве яны на Стасевых руках і памерлі...

Хапіла на ягоную долю ўсяго — і працы да сёмага поту, і ліха ўсякага. Таму і заходзіцца ў мяне зараз ад крыўды сэрца, калі чую, як у Вярхоўным Савеце сёй-той з дэпутатаў «ад сахі» абразліва кідае ў ягоны бок: маўляў, адкуль табе сапраўднае жыццё ведаць — прафесар, «белая костка», з маленства толькі па гладкім асфальце ходзіш!

* * *

На вялікім перапынку для дзятвы настаў момант узнагароды за доўгае карпенне над падручнікамі і сшыткамі. Настаўніца Станіслава Міхайлаўна прыносіла ў клас бясплатны казённы сняданак — лустачкі хлеба і цукеркі-«падушачкі». Згаладалыя шкаляры дружна накідваліся на пачастунак. Здавалася праз хвіліну не застанецца ні крошкі... З іх апетытам, вядома, струшчыць усё дашчэнту і сапраўды б нічога не каштавала. Каб не тая строгая дамоўленасць, парушальнік якой меў усе шанцы атрымаць пасля ўрокаў па шыі...

— Станіслава Міхайлаўна, мы ўжо наеліся. А тут вось трохі яшчэ засталося...

Яны ўсе як адзін па-дзіцячаму любілі гэту зграбную маладую жанчыну з доўгай касой, заўжды ласкавую, добразычлівую і вясёлую — праўда, ва ўсмешцы яе не-не ды і заўважаўся нейкі прытоены сум. Ведалі: адна гадуе дваіх дзяцей. Для іх і прызначалася тая рэшта «падушачак», таму і вялася штодзённа няхітрая гульня пад назвай «мы ўжо наеліся».

Ніхто не ведаў, дзе яе муж. У тыя гады пра такія

рэчы лічылі за лепшае не распытваць. Ужо хто-хто, а Стась разумеў гэта выдатна...

Пасля кожнай школьнай вечарыны хлопцы гуртам падыходзілі да яе:

— Мы вас правядзём, Станіслава Міхайлаўна, а то цёмна ўжо...

Аднойчы завіталі да яе дадому, каб павіншаваць з 8 Сакавіка. Падарунак прынеслі. Стась першы заўважыў у канцы двара гару сукаватых калодак.

— Станіслава Міхайлаўна, дзе тут у вас піла ды сякера?

Праз нейкую гадзіну пад павеццю ляжаў акуратны штабель пасечаных дроў.

Іх дружба захаваецца на доўгія гады. Стась стане завадатарам штогадовых сустрэч былых аднакласнікаў, на якіх нязменнай ганаровай госцяй будзе любімая настаўніца. І з цягам часу ўсё выразней стане адчувацца, як зрадніла іх тая ўжо далёкая пара, калі так многа значыла падзяліцца акрайчыкам хлеба.

* * *

Але памыляецца той, хто думае, што запомніліся ім тыя гады толькі жахамі вайны ды рэпрэсій, галёшамі-чунямі ды марай пра лішні акраец.

Былі ж і святы! І адзначалі іх тады, здаецца, нават цікавей, весялей, чым зараз, калі многія проста набіраюцца гарэлкі як свіння гразі. Відаць, тады была іншая, падсвядомая прага — перш за ўсё адысці душой, спаўна адчуць асалоду кожнага светлага моманту, каб потым успамін пра яго саграваў падчас новай доўгай паласы цяжкіх, багатых на нягоды будняў.

Стасю і Ірынцы асабліва падабаліся тыя святы, якія даводзілася адзначаць цішком, «канспіратыўна», бо савецкай уладай яны, мякка кажучы, не заахвочваліся — «рэлігійныя перажыткі»! Ражство, напрыклад, ці Вялікдзень. Пад Вялікдзень жанчыны з асаблівым імпэтам скрэблі падлогу, ганак, чысцютка вымяталі двор. Стась тым часам бяліў яблыні. Пераапрануўшыся ва ўсё святочнае, маці з бабуляй на вачах маладзелі, святлелі тварам. А фантастычны водар спечаных імі булак прымушаў штохвілінна глытаць слінкі ў чаканні таго запаветнага імгнення, калі бы між іншым прагучыць:

— Ну, што, дзеці, бадай, час ужо і за стол...

На Ражство бабка любіла наладжваць урачыстыя рэлігійныя спевы. Стась акампаніраваў ёй на акардэоне. Іншым разам трохі свавольнічаў: падпяваючы,

неўпрыкмет змяніць мелодыю на якую-небудзь іншую, мажорную, і бабуля міжволі таксама пачынае падладжвацца пад яе, пакуль не спахопіцца:

— Ах, ты, недавярак!..

Усё гэта рабілася, безумоўна, жартам. А ўвогуле Стась бездакорна схопліваў на слых любы матыў. Здольнасці перадаліся, відаць, ад маці, якая у маладосці добра іграла на раялі, часта і з ахвотай спявала. Потым, праўда, такія хвіліны здараліся ўсё радзей і радзей... Напачатку Стась асвоіў акардэон самавукам: час ад часу яму дазваляў пакарыстацца запаветным інструментам сябар — Ігар Грышын. (Цікава пераплятаюцца людскія лёсы: праз шмат гадоў Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Шушкевіч уручыць прафесару Грышыну Дзяржаўную прэмію рэспублікі.) Потым стаў займацца ў музычным гуртку Палаца піянераў. Між іншым, навучыўся зусім няблага іграць і на домры, балалайцы, гітары, мандаліне... Ну, а калі дзякуючы маці займеў уласны новенькі акардэон, то стаў надзвычай папулярнай асобай на суседскіх вечарынках і вяселлях. Ды і ў школьнай самадзейнасці таксама. Акрамя таго, праз нейкі час упадабаў там і ролю канферансье. Хіба ж не прыемна пад агульны рогат адкалоць са сцэны дасціпны жарт, за які з урока адразу б вытурылі ў тры шыі?..

Праўду кажучы, залішне востры язык падводзіў іншым часам і на занятках. Але такі ўжо характар — не мог утрымацца, асабліва калі ў класе, здавалася, аж мухі ад суму дохлі ці пачынаў лютаваць хтосьці з нелюбімых настаўнікаў. А такія, што і казаць, былі. Узяць тую ж хімічку. Хоць і ганарылася яна сваім ордэнам, атрыманым «за заслугі ў камуністычным выхаванні падрастаючага пакалення», але выкладала надзвычай нудна, нецікава ды і ўвогуле была крыклівай, як гандляркі на суседняй Камароўцы.

—...Запомніце, дзеці: бяспечную руднічную лямпу вынайшаў англійскі навуковец Гэмфры Дэві...

Стась узнімае руку:

— Прабачце, Ганна Натанаўна, а я нядаўна ў газеце прачытаў, што гэтую лямпу вынайшаў наш суайчыннік Іван Падкавыркін...

Нямая сцэна. У хімічкі бялее твар. І паспрабуй не спалохайся, калі апошнім часам пад кіраўніцтвам Іосіфа Вісарыёнавіча разгарнулася, як вядома, бязлітасная барацьба супраць «бязродных касмапалітаў» і «нізкапаклонства перад Захадам» — цяпер у аналах айчыннай гісторыі старанна адшукваюцца забытыя імёны тых, хто,

як высвятляецца, раней за славутых іншаземцаў выказаў тую ці іншую геніяльную навукова-тэхнічную ідэю... Можа, і прыярытэт Дэві ўжо абвержаны, а яна яшчэ не ведае? Які жах!

— Добра, Стась, дзякую, не выключана, што ты маеш рацыю. Я зазірну ў найноўшыя даведнікі. А пакуль што, дзеці, давайце называць гэтую рэч не «лямпа Дэві», а проста — «руднічная».

Потым, праз шмат гадоў, стане трохі сорамна ад успаміну пра той жарт. Бо крыклівая хімічка, якой баяліся многія вучні, сама, калі ўдумацца, была прыціснута штодзённым страхам: сказаўшы на ўроку нешта «не тое», «ідэалагічна шкоднае», яна, нягледзячы на свой ордэн, магла як двойчы два трапіць туды, адкуль мала хто вяртаўся...

* * *

Ягоны бацька вярнуўся.

Калі яго арыштавалі, Стасю не было яшчэ і трох гадоў, і, вядома ж, дзіцячая памяць практычна нічога з тае пары не захавала. Ён уяўляў бацьку, бадай, толькі па фотакартцы, што неяк ацалела падчас вобыскаў у 1936-ым. Са здымка глядзеў прыгожы малады мужчына: адкрыты твар, ніводнай зморшчынкі. І цяпер, падчас сустрэчы праз дзесяць гадоў, углядаючыся ў бацькава аблічча, лёгка было зразумець, колькі ліха паспеў сербануць гэты чалавек...

Дзесяць гадоў — вялікі, вельмі вялікі тэрмін. Тым больш — у сібірскай няволі, калі не ведаеш, ці наканавана вярнуцца ў свой край, ці пашанцуе ўвогуле ўбачыць заўтрашні світанак. А жыццё ёсць жыццё, і пакуль дыхаеш, хочацца цяпла і спагады...

— Ты ўжо вялікі, Стах. Ты павінен усё зразумець як след...

З Сібіры бацька вярнуўся з другой жонкай — Кацярынай, якая ўжо чакала дзіця. Аселі яны пад Мінскам, у Данілавічах. Бацька стаў настаўнічаць у вясковай школе. Але праз пару гадоў людзі з той самай установы, адна назва якой наводзіла жах, знойдуць яго і там. Відаць, настане ўжо дэфіцыт на новых «ворагаў» — пойдуць «па другім крузе». І хоць Асобая нарада пры МДБ БССР не зможа інкрымінаваць былому вязню нічога, акрамя тых «злачынстваў», за якія ён ужо адседзеў, яго зноў сашлюць у Сібір — «згодна з дырэктывай № 66241СС». Стась зноў будзе перапісвацца, слаць бандэролі з кнігамі ды газетамі. А ад бацькі, акрамя лістоў, будуць прыходзіць час ад часу

нават грашовыя пераводы — і як толькі выкройваў тыя рублі?

Іх сяброўства працягнецца да канца бацькавых дзён. Лёс увогуле зблізіць гэтыя дзве сям'і. Стась добра пазнаёміцца з Кацярынай Аляксееўнай, яе дзецьмі, дапаможа у свой час аднаму з іх, Лёньку, які ні на адной працы не мог доўга ўтрымацца, знайсці нарэшце справу па душы, стаць паважаным чалавекам...

І потым, калі Станіслава Пятровіча не стане, яны будуць працягваць штогод збірацца ўсе разам 19 лютага — у дзень ягонага нараджэння. Будуць згадваць лагодна-сумную ўсмешку і словы, што ён не раз паўтараў:

— Ну што ж ты зробіш, калі жыццё ў нас так склалася...

* * *

— Вось, мама, збылася твая мара, любуйся!

Стась расчыніў маленькі футлярчык, і яна асцярожна ўзяла ў рукі сярэбраны дыск медаля... Сапраўды, гэта была перш за ўсё яе, матчына, мара. «Старайся, сынок,— не аднойчы даводзіла яна,— бо без медаля наўрад ці куды паступіш. На экзаменах усё зробяць, каб «зрэзаць». Ты ж ведаеш, якая на нас пячатка...»

Медаль адкрываў дарогу у інстытут ці універсітэт без экзаменаў.

Яны яшчэ не ведалі, што радавацца рана...

## ВЫБАР ПУЦЯВІНЫ

«Куды пайсці вучыцца».

Летам 1951-га Стась стаў надзвычай старанным чытачом усіх аб'яў пад гэтай рубрыкай. Вось і цяпер спыніўся, пачаў вывучаць тэкст на шматку паперы, прымацаваным да дзвярэй гарадской тэлефоннай станцыі.

«Маскоўскі інстытут сувязі аб'яўляе прыём абітурыентаў для навучання па спецыяльнасцях...»

І тут з калонкі стандартнага казённага тэксту позірк выхапіў слова, ад якога аж закружылася галава.

«Тэлебачанне»!

Гэтае слова гучала як заклінанне, як пароль, што адчыняе браму ў таямнічы, фантастычны свет. Няўжо і сапраўды ёсць месца, дзе звычайнага смяротнага са школьным атэстатам могуць ператварыць ва ўсемагутнага мага блакітнага экрана?

Дадому шыбаваў амаль што подбегам.

— Мама, еду ў Маскву!

Маці, толькі зірнуўшы на яго — расчырванелы, узбуджаны твар, бліскучыя вочы,— адразу зразумела: пярэчыць — марна.

Сталіца сустрэла зусім па Ільфу і Пятрову — адразу ж згадаўся іранічны пасаж з «Дванаццаці крэслаў», што пачынаецца фразай «У Маскве любяць замыкаць дзверы»...

Парадны ўваход у будынак інстытута быў зачынены — мяркуючы па ўсім, «усур'ёз і надоўга». Каб адшукаць прыёмную камісію, давялося прабірацца праз брудны, засмечаны двор. Пасярод яго Стась спыніўся, абвёў позіркам аблупленыя, неахайныя сцены, перасмыкнуўся ад нейкіх падазроных водараў і... хуценька рушыў назад.

Намаляваная фантазіяй рамантычная казка была бязлітасна, ушчэнт разбурана. Не, сярод гэтага смецця і смуроду не могуць вучыць на чараўнікоў... Ды і ўвогуле, пасля гадзін блукання ў вар'яцкім тлуме

велізарнага горада родная мінская ўскраіна — утульны дамок, матчыны спагадлівыя вочы, нават надакучлівае казінае мэканне на двары — усё гэта здалося раптам запаветным кавалачкам так неразважліва пакінутага раю. Дадому, хутчэй дадому!

Пазней ён не аднойчы пасмяецца над той сваёй залішняй уражлівасцю юнага правінцыяла. Але тады выбар быў зроблены. І заставаўся варыянт, які ўжо даўно і грунтоўна абмяркоўвалі з маці і настаўнікамі: універсітэт, фізмат.

Настаўнікі, даючы такую параду, зыходзілі з элементарнай логікі: трэба выбіраць навукі, да якіх у цябе, мы ж бачым, найбольшыя здольнасці. Маці не аднойчы паўтарала тое самае, але, як высветлілася, мела яшчэ і іншае, патаемнае меркаванне. Аднойчы яна наважылася і выказала гэта ўслых: ты, маўляў, ужо дарослы, сын, і нам трэба пагаварыць адкрыта. Ведаеш жа, як скалечылі лёс твайму бацьку. І колькі такіх, каго сцёрлі ў лагерны пыл за вершы, за гістарычныя нарысы, за слова ў абарону роднай мовы! А дакладныя навукі ёсць дакладныя: строгая формула — зусім не тое, што вольная паэтычная метафара, да формулы так лёгка не прычэпішся, не прыпляцеш крамольны сэнс.

* * *

— Ну як вам яшчэ растлумачыць?..— Рэктар ужо стаміўся ад шматлікіх празрыстых намёкаў, што ніяк не даходзілі да хлопца, які, набычыўшыся, сядзеў у ягоным кабінеце.— Разумееце, справа не ў тым, які ў вас атэстат. Атэстат выдатны, ніхто не спрачаецца. Але ж...

Ён абарваў фразу, аднак Стась усё прачытаў у ягоных вачах. Кроў прыліла да твару...

* * *

«Сын за бацьку не адказвае».

Праз слёзы, што засцілалі вочы, ён горка ўсміхнуўся, згадаўшы гэты сталінскі выраз, які на кожным кроку цытаваўся партыйнымі прапагандыстамі: пабачце, маўляў, які ён чалавечны, гуманны, наш вялікі правадыр — нават патомкам ворагаў народа дае шанц стаць упоравень з іншымі, уліцца ў шэрагі свядомых будаўнікоў новага грамадства!

Сёння ён на сабе адчуў, чаго варта гэтая фраза. Яму адкрыта далі зразумець: ты — з кляймом, а таму ведай сваё месца, не сунься куды не належыць...

І як сказаць пра гэта маці — яна была такая шчаслівая, калі ён атрымаў сярэбраны медаль, што



Станіслаў Шушкевіч —
студэнт II курса БДУ. 1952 год

абяцаў «зялёнае святло» на шляху ў студэнцтва! Хіба мала выпала ўжо на яе долю бязлітасных, здзеклівых удараў?

Стась спыніўся, трохі пастаяў, нешта ўзважваючы ў думках, і закусіўшы губу, пашыбаваў назад, да ўвахода ва універсітэцкі корпус.

Рэктар ад нечаканасці аж перасмыкнуўся. Здаецца ж, усё сказана, кропкі над «і» расстаўлены. Але гэты ўпарты вялікалобы хлопец зноў, набычыўшыся, стаіць на парозе:

— Вы не можаце мяне не залічыць, чуеце?!

І тут... Можа, варухнулася нарэшце спагада ў душы сівога універсітэцкага начальніка, а можа, проста не захацеў гучнага скандалу. Гэты ўпарціна, здаецца, на ўсё гатовы, а ў яго, рэктара, і сапраўды няма ніякіх фармальных падстаў, каб адмаўляць у залічэнні, ёсць толькі ліпучы страх: а раптам у адзін цудоўны дзень выклічуць туды і ўкрадлівым голасам спытаюць — ці не прытупілася ў вас, шаноўны, класавая пільнасць?..

Як там ні было б, але першага верасня 1951 года Стась бы на крылах ляцеў на першую лекцыю ва універсітэт. У кішэні старога паліто (таго самага, перашытага з шыняля) ляжаў запаветны студэнцкі білет.

* * *

**Распавядае былы аднакурснік Станіслава Шушкевіча — Андрэй Маркавіч ГАНЧАРЭНКА:**

— Паступіўшы ва універсітэт пасля вясковай школы, я напачатку трохі, як цяпер модна казаць, «камплексаваў» у кампаніі студэнтаў-гараджан: можа, пасмейваюцца паціху за спінай з «цельпукаватага селяніна»? Дружба са Стасем Шушкевічам дапамагла адчуць сябе больш свабодна, упэўнена. Я ўбачыў, што жыве ён у звычайнай драўлянай хаце — мо, нават горшай, чым у майго бацькі. Але, безумоўна, не гэта было галоўнае. Стась адразу падкупляў сваёй шчырасцю, адкрытасцю.

Пра тое, што ягоны бацька быў рэпрэсіраваны, я даведаўся шмат пазней. Толькі тады зразумеў, як, мабыць, цяжка было часам у сябра на сэрцы, колькі незаслужаных крыўдаў даводзілася яму трываць... Але ён ніколі не скардзіўся, не замыкаўся ў сабе, наадварот, нярэдка падтрымліваў іншых сваёй добразычлівасцю і аптымізмам.

За што я паважаю яго з тае пары і дагэтуль? Перш за ўсё — за надзейнасць. Ніколі не падвядзе, не «прадасць». Калі ўжо ёсць нейкая дамова, калі даверыш

нейкі сакрэт — можаш спадзявацца як на самога сябе. Не памятаю выпадку, каб ён не стрымаў слова.

Іншая справа, што ён, бывала, занадта паддаваўся эмоцыям. Гэта і зараз здараецца. Слухаю ягоныя цяперашнія выступленні — і іншым разам думаю: вось тут варта было б стрымацца, выказацца больш дыпламатычна, хітрэй, калі хочаце, каб лішні раз не даць падставу для атакі апанентам... Але ён заўсёды шчыры і імкнецца казаць што думае.

Ведаю выпадкі, калі хто-кольвечы са старых знаёмых звяртаўся да яго з нейкай асабістай просьбай, калі Шушкевіч стаў ужо Старшынёю Вярхоўнага Савета. Здавалася б, толькі накруці «вяртушку» — хто ж адмовіць вышэйшай дзяржаўнай асобе? Але, калі ён, Шушкевіч, адчувае, што пры гэтым хоць на кроплю перавысіць свае паўнамоцтвы, пераступіць нейкія этычныя нормы,— адразу ж адказвае: прабач, дружа, я гэтага зрабіць не змагу, я не цар і не Бог... За шмат гадоў я цвёрда ўпэўніўся: гэта гранічна сумленны чалавек. Таму і «нязручны» ён для многіх наменклатурных дзеячаў, што прызвычаіліся спрытна ўладкоўваць у сваім коле асабістыя справы.

* * *

«Далоў казу!»

Стась яшчэ раз прыдзірліва агледзеў старанна намаляваны ім плакат — здаецца, атрымалася няблага! — і прымацаваў свой твор на бачным месцы, каб бунтарскі лозунг адразу кідаўся ў вочы.

Аднакурснікі былі частымі гасцямі ў ягонай хаце, і Стась іншым разам трохі саромеўся, калі падчас чарговага іх візіту (асабліва калі завітвалі і дзяўчаты) пад вокнамі пачыналася гучнае мэканне неразумнай жывёліны. Цяпер, калі што, можна аджартавацца... Ну, а жарты ягоныя сябры разумеюць.

Курс увогуле быў невялікі — крыху болей за сорак чалавек. Кожны навідавоку, і хутка высветлілася, хто ёсць хто, з кім варта і з кім не варта мець справу.

Былі і такія, што, акрамя падручнікаў ды канспектаў, нічога вакол сябе, здавалася, не бачылі. Звычайна яны заставаліся ў аўдыторыі нават тады, калі грамада вырашала дружна збегчы ў кіно перад чарговай сумнай лекцыяй нелюбімага выкладчыка. Як ні дзіўна, але час пакажа, што амаль ніхто з тых узорных студэнтаў не здолее зрабіць сабе імя ў навуцы — калі праз шмат гадоў курс будзе збірацца на традыцыйныя сустрэчы, то высветліцца, што найбольшых поспехаў дасягнулі

якраз тыя, для каго выдатная адзнака ў залікоўцы не была самамэтай, хто жыў тады натуральным, паўнакроўным маладым жыццём — з вечарынкамі, свавольствамі, пацалункамі ў начным скверы...

* * *

Так, усё гэта было і тады, хоць моладзь 1990-ых, начытаўшыся сучаснай гістарычнай публіцыстыкі, можа зрабіць выснову, што ўвесь народ у гады сталінскага кіравання толькі і рабіў што стагнаў дзень ды ноч пад ярмом таталітарызму. Дарэчы, і крыўдзяцца на сучасную публіцыстыку чытачы сталага ўзросту найчасцей не таму, што шануюць сталіншчыну,— яны шануюць успаміны пра сваю маладосць, калі, насуперак бесчалавечным законам Сістэмы, людзі ўмудраліся заставацца людзьмі, і бескарысліва сябравалі, і ад душы пелі добрыя прыгожыя песні, і па-сапраўднаму кахалі... Так, былі шматлікія сходы і мітынгі, дзе ўсе мусілі завучана паўтараць партыйныя лозунгі дня,— але і пад каўпаком Сістэмы бруілася непадуладнае ёй, натуральнае чалавечае жыццё.

* * *

А потым быў дзень, калі вялікі партрэт вусатага чалавека, што тры дзесяцігоддзі непадзельна ўладарыў агромністай краінай, з'явіўся ва ўсіх газетах у тлустай чорнай рамцы. Іх, студэнтаў, гуртам павялі на мінскую плошчу, дзе ўзвышаўся цыклапічных памераў помнік,— аддаць жалобную даніну адышоўшаму ў нябыт правадыру. «Ну, цяпер чакай новай вайны...»,— шапталіся ў натоўпе цёткі, выціраючы хусцінкамі пачырванелыя вочы. Хто-ніхто плакаў зусім натуральна — урэшце, бадай, не столькі ад тугі па Сталіну, колькі ад трывогі і страху: што ж цяпер будзе?.. Папярэднія дзесяцігоддзі міжволі выпрацавалі перакананне: што ні адбываецца ў гэтай краіне — усё да горшага.

Ніхто яшчэ не ведае, што будзе XX з'езд КПСС, дзе адзін з былых паплечнікаў Сталіна — Мікіта Хрушчоў — адважыцца сказаць хоць долю страшнай праўды пра чорныя справы «крамлёўскага горца», труну з целам якога аднойчы пад покрывам ночы цішком вынесуць з маўзалея і, апусціўшы ў магільную яму, наглуха зальюць бетонам... І трохі вальней стане дыхаць, і пакрысе, са скрыгатам, асцярожна пачнуць адпускацца асобныя гайкі адмыслова, з д'ябальскай вытанчанасцю і каласальным запасам трываласці, сканструяванай правадыром Сістэмы.

У 1954-ым Стась у складзе дэлегацыі пабывае ў Кіеве на грандыёзных урачыстасцях, прысвечаных 300-годдзю ўз'яднання Украіны з Расіяй. Двума ж гадамі раней яго лічылі занадта «нядобранадзейным» для такіх важных афіцыйных мерапрыемстваў. Тады Шушкевіча, аднаго з лепшых мотаспартсменаў універсітэта, адхілілі ад удзелу ў вялікім, гучна разрэкламаваным мотапрабегу Кіеў—Масква, зноў, як і падчас паступлення ва універсітэт, даўшы зразумець: ты — з кляймом, ведай сваё месца!

Пакрысе загойваліся душэўныя раны ад ранейшых крыўдаў. Прыемна кружыў галаву хмель студэнцкага жыцця — вясёлага, шумнага, свавольнага. Стась часцяком зазіраў на «агеньчык» да сяброў у старую інтэрнацкую будыніну, а яны, у сваю чаргу, хутка сталі сваімі людзьмі ў доміку на Сляпянскай. А калі ён прыдбаў фотаапарат, домікператварыўся ў сапраўдны філіял фотаатэлье: які студэнт не скарыстае магчымасць бясплатна «шчоўкнуцца» на памяць.

* * *

Грошы на фотакамеру Стась зарабіў падчас сваіх першых студэнцкіх канікулаў. Сорамна было б днямі грэць жывот на пляжы, а потым прасіць у маці капейчыну на свае патрэбы. Хлопец наняўся працаваць у Батанічны сад: вазіў туды ў бочцы ваду і паліваў расліны, за што плацілі дваццаць рублёў у месяц. Потым прымножыў свой капітал, уладкаваўшыся акардэаністам у піянерскі лагер.

З цягам часу ён прызвычаіўся спалучаць з працай і вучобу. Пасля лекцый спяшаўся ў сваю былую школу, дзе стаў кіраваць аркестрам народных інструментаў. Потым атрымаў прапанову весці заняткі па электратэхніцы ў суседняй 12-ай школе. У той час, дарэчы, хлопцы ўжо зноў сталі вучыцца ў школах разам з дзяўчатамі. Першы раз завітаўшы ў адзін са старэйшых класаў, Стась адчуў сябе трохі ніякавата: за партамі, цікаўна страляючы вачыма, сядзелі практычна ягоныя равеснікі — плячыстыя дзецюкі ды квітнеючыя прыгажуні. Школьнае кіраўніцтва таксама напачатку крыху хвалявалася: ці не сядуць тыя пераросткі на шыю юнаму выкладчыку? Але трывога сталася дарэмнай: Стась здолеў усталяваць такі стыль узаемаадносін, калі іх прастата, таварыскасць не пераходзіць у панібрацтва. Галоўнае ж — нават сухую тэорыю ён выкладаў проста, даходліва, міжволі захопліваючы ўвагу нават адпетых класных гультаёў. І адразу ж дэманстраваў сувязь

тэорыі з практыкай: глядзіце, як рамантуецца сапсаваная разетка, як можна сваімі рукамі змайстраваць лепшую, чым куплёная, электрагірлянду для навагодняй елкі...

* * *

Восенню 1952-га Стасю давялося асабліва пашчыраваць: узяўся абсталяваць ва універсітэце радыёвузел. З гэтай нагоды яго аслабанілі ад паездкі на «бульбу», аддалі ў поўнае распараджэнне пакойчык у будынку хімічнага факультэта. Сядзеў там днямі і начамі ў клубах дыму ад паяльніка... Не справішся ў тэрмін — тады ж ад сораму хоць скрозь зямлю праваліся!

У прызначаны час радыёвузел падаў голас, які гучным рэхам разнёсся па калідорах універсітэцкіх карпусоў і інтэрнатаў. Праўда, «сур'ёзнае» радыёвяшчанне, аб якім марылі ў парткаме і камітэце камсамола, наладзіць тады так і не ўдалося, але затое музыку круцілі на ўсю моц, што, дарэчы, зусім задавальняла большасць студэнтаў... Ну, а Стась стаў у альма-матэр яшчэ больш вядомай фігурай.

Вельмі дарэчы сталася і музычная вывучка. Што за вечарынка без Стася Шушкевіча, які гэтак «урэзаць» можа на акардэоне, што ногі самі ў скокі просяцца! Ну, а калі раскажа — прычым з абсалютна каменным выразам твару — анекдот ці выдасць экспромтам эпіграму на кагосьці з кампаніі, то мінімум пяць хвілін усе навокал ад смеху аж поўзаць будуць. Хіба што акрамя самога «героя» эпіграмы — той, бывала, і надзімаўся, бо жарты ў Стася часцяком атрымліваліся такія, пра якія кажуць: не ў брыво, а ў вока. Як там ні было б, але адно са з'едлівых рыфмаваных двухрадкоўеў прынесла, як паказаў час, канкрэтную выхаваўчую карысць: самалюбства сакурсніка, які залішне любіў зазіраць у пляшку, было так закранута, што ён «на злосць ўсім» узяў ды і «завязаў» з сумніцельным захапленнем.

А ўвогуле пілі няшмат. Весялосці, імпэту хапала і без штучнага «падагрэву». Пасля вечарынкі часцяком выходзілі прагуляцца па праспекце. Стась і тут не мог стрымацца, каб не паджартаваць з якога-небудзь занадта сур'ёзнага прахожага, хоць заўсёды добра адчуваў тую мяжу, за якой пачынаецца ўжо звычайнае хамства...

З надыходам жа чарговай сесіі станавілася не да жартачкаў. Стась быў далёкі ад кагорты «зубрылаў», што не прапускалі ніводнай лекцыі і старанна вялі

канспекты па ўсіх дысцыплінах. Шмат што даводзілася навёрстваць перад самымі ўжо экзаменамі. Тады крукам сядзеў над кнігамі ў «Ленінцы», аж пакуль не выганяла з чытальнай залы паўсонная бібліятэкарка. Дзякуй Богу, выручала, як і ў школе, учэпістая памяць. Таму хоць у круглых выдатніках і не хадзіў, але меў у выкладчыкаў сталую рэпутацыю моцнага студэнта.

* * *

Шчыра кажучы, далёка не ўсе выкладчыкі самі маглі пахваліцца рэпутацыяй моцных. Універсітэцкая эліта была ледзь ці не дашчэнту выбіта рэпрэсіямі ды вайной, таму месца за кафедрай нярэдка займалі пасрэдныя, шэрыя, нашпігаваныя прымітыўнымі догмамі людзі. Стаўленне да іх лекцый было, зразумела, адпаведнае.

Але іх курсу пашанцавала. У сярэдзіне 1950-ых на дапамогу беларускай навуцы Масква накіравала групу тытулаваных, масцітых фізікаў і матэматыкаў: акадэмікаў Сеўчанку, Сцяпанава, Ельяшэвіча... Акрамя ўсяго іншага, яны сталі чытаць лекцыі ў Беларускім універсітэце. Прыкмячалі найбольш здольных студэнтаў, працавалі з імі асабліва «шчыльна» — рыхтавалі сваю будучую змену. Сярод тых, каго адразу заўважылі, быў і Станіслаў Шушкевіч. Яму прапанавалі пайсці ў аспірантуру. Доўга не думаючы, згадзіўся. На той час ён сур'ёзна захапіўся новай, для большасці экзатычнай тады галіною фізікі — радыёспектраскапіяй. Шэфства над аспірантам Шушкевічам узяў адзін з самых знакамітых «варагаў» — акадэмік Ельяшэвіч. Стажыроўка ж праходзіла ў Фізічным інстытуце Акадэміі навук СССР, у «вотчыне» славутага Прохарава — таго самага, што стане потым Нобелеўскім лаўрэатам.

Карацей кажучы, на настаўнікаў грэх было скардзіцца. Цяжкасці ўзнікалі іншыя. Чыноўнікі ад навукі, у чыіх руках былі ўсе сродкі і рэсурсы, не выяўлялі, мякка кажучы, асаблівай шчодрасці ў адносінах да новай галіны фізікі: чорт яго ведае, ці атрымаецца яшчэ тут нешта людскае, а справаздачу ж за кожны рубель трымаць давядзецца...

У пакоі, дзе Шушкевіч працаваў звычайна разам са сваім калегам Патаповічам, практычна ўся «матэрыяльна-тэхнічная база» складалася са сціплага століка ды пары хісткіх зэдлікаў. З нічога, можна сказаць, з паветра здолелі сканструяваць адносна прыстойны радыёспектрометр, які дазволіў ужо весці сякія-такія даследаванні, хоць, безумоўна, па мерках тагачаснай



С. С. Шушкевіч — выпускнік БДУ. 1956 год

заходняй навукі гэта было чысцейшай вады саматужніцтва...

Можна было, вядома, і на той саматужнай «базе» скляпаць сяк-так навукападобную дысертацыю (хтоніхто з калегаў, дарэчы, без асаблівых згрызот сумлення менавіта так і рабіў), але да прафанацыі душа не ляжала.

І ўсё ж гады аспірантуры не прайшлі марна: назапашаны тут навуковы капітал добра спрацуе праз колькі часу, калі з'явіцца магчымасць весці справу ў саліднай, прыстойна абсталяванай лабараторыі,— з маланкавай хуткасцю будуць напісаны і кандыдацкая, і доктарская дысертацыі.

* * *

Ну, а тады, у 1959-ым, калі паўстала пытанне, як быць далей, у ролі змея-спакушальніка выступіў адзін знаёмы, што кіраваў лабараторыяй ў спецыяльным канструктарскім бюро прыладабудавання на Мінскім радыёзаводзе (тым самым, з якога вырасла сучаснае аб'яднанне «Гарызонт»):

— Ну, што, не надакучыла яшчэ там усялякай схаластыкай займацца? Гайда да нас — тут жа, зірні, канкрэтная, жывая справа!

Наконт схаластыкі прагучала, вядома, напаўжартам: тэарэтычная падрыхтоўка Шушкевіча была якраз вельмі патрэбна лабараторыі, дзе працавалі добрыя, вопытныя практыкі, якім, аднак, бракавала фундаментальных навуковых ведаў. Новы супрацоўнік удала дапоўніў гэту «каманду». Калі трэба, і сам браў у рукі паяльнік, але найбольш дапамагалі ягоныя ідэі, тлумачэнні, калі чарговая распрацоўка заводзіла ў «цёмны лес» складаных паняццяў сучаснай фізікі. Быў выпадак: адзін з калегаў чыста эмпірычным шляхам зрабіў надзіва добрую вымяральную сістэму. Праўда, растлумачыць як след прынцып яе дзеяння так і не мог. Шушкевіч расклаў яму па палічках тэарэтычны бок справы, той хутка схапіў сутнасць — і ў выніку сумеснымі намаганнямі здолелі зрабіць сістэму яшчэ больш эфектыўнай, дасканалай. Самым жа, бадай, удалым дзецішчам лабараторыі стаў у тыя гады селектыўны ўзмацняльнік ТОР «А» — прыбор з характарыстыкамі на ўзроўні тагачасных сусветных стандартаў. Ён пратрымаўся ў серыйнай вытворчасці больш за два дзесяцігоддзі і быў жаданым набыткам для любой фізічнай лабараторыі — і ў Саюзе, і ў іншых краінах СЭУ.

* * *

Маладога супрацоўніка хвалілі, прадказвалі яму на радыёзаводзе выдатную кар'еру. Здавалася б, і сапраўды ад дабра дабра не шукаюць.

Але... Адна размова зрабіла пераварот у жыццёвых планах. Гэта была гутарка з загадчыкам кафедры ядзернай фізікі Беларускага універсітэта Аляксандрам Пісарэўскім, бліскуча адукаваным чалавекам, які незадоўга да таго разам з трыма калегамі прыехаў у Мінск з Ленінграда і адразу ж узняў работу кафедры на якасна новы ўзровень. Ён лёгка жангліраваў у гутарцы такімі тэрмінамі, як «шматканальны аналіз», «дыскрымінатар», «амплітудная селекцыя», што гучалі для Станіслава загадкава, экзатычна. А ён жа з маладой самаўпэўненасцю лічыў, што ўжо сабаку з'еў у электроніцы! Закранутае самалюбства адыграла, бадай, не апошнюю ролю — Шушкевіч згадзіўся на прапанову Пісарэўскага пайсці на кафедру ядзернай фізікі.

На гэтай кафедры пройдуць амаль што тры дзесяцігоддзі ягонага далейшага жыцця. Так, не толькі навуковай дзейнасці, але і проста жыцця, бо кафедра стане нечым значна большым, чым звычайнае месца працы. Тут ён набудзе выдатных новых сяброў і нажыве заўзятых нядобразычліўцаў, тут пакутліва пераасэнсуе шмат якія са сваіх поглядаў і напаткае сапраўднае каханне... Адсюль, крута змяніўшы на шостым дзесятку гадоў свой жыццёвы курс, ён рызыкне зрабіць крок у вір вялікай палітыкі.

## КАФЕДРА

На парозе кабінета з'явіўся мажны мужчына са скураным партфелем.

Шушкевіч узняў галаву ад папер: цікава, якія ж уражанні ў шаноўнага правяральшчыка з райкама партыі пасля экскурсіі па кафедры?

— Што ж, Станіслаў Станіслававіч, лабараторыя ў вас выдатная, кадры, адчуваецца, кампетэнтныя. Але... Вы бачылі насценгазету на калідоры?

Шушкевіч паціснуў плячыма:

— Бачыў, ну і што?

— Ну, як вам сказаць... Там жа зусім не адлюстроўваецца сучасны палітычны момант. І вас, прабачце, у карыкатурным выглядзе намалявалі...

Шушкевіч заўсміхаўся:

— Вы ў нас чалавек новы... Разумееце, тут, на кафедры, завядзёнка такая — у жартоўным стылі газету рабіць. Мінулы раз нават рэктара падобным чынам намалявалі, і ён зусім не пакрыўдзіўся. А чаму я павінен?

Мужчына з партфелем хвіліну нешта напружана асэнсоўваў.

— Ну, ведаеце, насценны друк — гэта ўсё ж важны ідэалагічны сродак, а ў вас — суцэльнае «ха-ха». Хіба ж пашкодзіў бы перадавы артыкул пра рашэнні апошняга пленума ЦК?

— Добра, пастараемся ўлічыць вашыя заўвагі,— кіўнуў Шушкевіч, каб хутчэй закончыць размову, працяг якой уяўляўся малапрадукцыйным...

* * *

«Развёў там, бач, дэмакратыю!»

Гэтая неадабральная рэпліка чулася неаднойчы, калі з той ці іншай нагоды асобу загадчыка універсітэцкай кафедры ядзернай фізікі завочна абмяркоўвалі ў апаратных колах. Зашпіленых на ўсе гузікі, закамплекса-

ваных чыноўнікаў з партыйнай іерархіі проста шакіравалі тыя вольныя парадкі, што бывалі «ў Шушкевіча». Хіба ж можна, каб любы зялёны навічок, учарашні аспірант, паводзіў сябе з начальствам як роўня? Ёсць таксама звесткі, што супрацоўнікі па парадзе загадчыка нейкага Карнегі чытаюць... Ды яшчэ, кажуць, ён, Шушкевіч, з падначаленымі за горад на пікнікі ездзіць, тосты ўздымае, футбольны мяч на паляне ганяе ў адных, прабачце, трусах... А ўсе гэтыя карыкатуры, жартачкі падазроныя! Што і казаць: запушчана кафедра ў ідэалагічным плане, ой як запушчана...

І ўсё ж партыйныя функцыянеры мусілі глядзець скрозь пальцы на ўсе гэтыя ліберальныя штукарствы, зважаючы на бліскучую рэпутацыю Шушкевіча як навукоўца і выкладчыка.

Прыйшоўшы ў 1961-ым на пасаду старшага інжынера ў лабараторыю пры кафедры («з месячным выпрабавальным тэрмінам» — зазначалася ў загадзе рэктара), ён упэўнена браў прыступку за прыступкай. Хутка абараніў кандыдацкую дысертацыю, праз некалькі гадоў — доктарскую. У працоўнай кніжцы адзін за адным з'яўляліся запісы аб службовых павышэннях: галоўны інжынер, загадчык сектара лабараторыі, дацэнт, прафесар і нарэшце — загадчык кафедры. З году ў год доўжыўся спіс ягоных навуковых прац, вынаходніцтваў.

Лабараторыя стала для Шушкевіча ўлюбёным дзецішчам. Добра памятаў свой ранейшы аспіранцкі пакойчык з адным сталом ды парай зэдлікаў: падступацца з такім «узбраеннем» да складаных праблем сучаснай фізікі — тое самае, што з шабляй кідацца на танк. Тут, ва універсітэце, была ўжо значна больш грунтоўная база, але ён імкнуўся скарыстаць любую магчымасць, каб аснасціць лабараторыю яшчэ больш сучасным начыннем. Вядома, заходні ўзровень заставаўся недасягальным, аднак тым не менш... Яшчэ тады, калі айчынны друк мусіў расшыфроўваць для простых смяротных сэнс таямнічай абрэвіятуры «ЭВМ», тут, на кафедры, студэнты былі ўжо «на ты» з гэтай тэхнікай (вядома ж, вельмі груваскай і недасканалай па сённяшніх мерках).

Кладучы руку на сэрца, варта зазначыць, што станаўленню кафедры прыкметна спрыялі шматлікія заказы, звязаныя з ваеннымі патрэбамі. Ужо на што на што, а на гэтую справу савецкая дзяржава грошай не шкадавала. Ліха ж без дабра, як кажуць, не бывае. Тыя заказы дапамаглі не толькі абзавесціся прыстойным

абсталяваннем і мець нядрэнны дадатковы заробак, але і рабіць значныя навукова-даследчыя прарывы, якія прыносілі карысць не аднаму ваенна-прамысловаму комплексу. Па сутнасці, ішло стварэнне цэлага новага класа радыёспектраскапічнай апаратуры.

Кандыдацкая дысертацыя Шушкевіча таксама была «закрытай», скіраванай на абаронныя мэты. Задача — калі тлумачыць вельмі спрошчана — выглядала так: трэба неяк навучыцца выяўляць, ці ёсць на ўзбраенні гіпатэтычнага праціўніка пэўныя тэхнічныя «штучкі», якія нічога не выпраменьваюць, і таму іх не засячэш традыцыйнымі сродкамі... Праз колькі гадоў Шушкевіч выпадкова даведаецца: аналагічную задачу паставілі тады паралельна і перад групай навукоўцаў з аднаго харкаўскага інстытута. Харкаўчане ў выніку здаліся: немагчыма, невыканальна!

Ён гэту задачу вырашыў.

Доктарская дысертацыя, па сутнасці, стала працягам, развіццём кандыдацкай. Натуральна, таксама лічылася сакрэтнай. Потым Сымон Саламонавіч Герштэйн — добра вядомы ў фізічных колах, сапраўды сусветнага ўзроўню навуковец, якому падчас абароны гэтай дысертацыі была даручана роля апанента Шушкевіча,— паўжартам-паўсур'ёзна бурчэў:

— Ну вось, цяпер з-за цябе мяне за мяжу не выпускаюць...

Шушкевічу даводзілася парыраваць у той самай танальнасці:

— Прабачце, але гэта, бадай, не з-за мяне, а з-за вашага паходжання.

(Калега, яўрэй па нацыянальнасці, не крыўдзіўся — ён разумеў гумар. Хоць гэта быў гумар, да якога ў тыя часы надзвычай дапасоўвалася перафразаваная вастрасловамі прыказка: «У кожным жарце ёсць доля жарту».)

Дарэчы, доктарскую Шушкевіч вырашыў абараняць у Маскве. Бо ў родных пенатах, хутчэй за ўсё, давялося б зноў схліснуцца з тымі людзьмі, з якімі ён не надта ладзіў.

Пасрэднасць заўсёды агрэсіўная. У тыя ж гады сама Сістэма стварала на ўсіх узроўнях і ва ўсіх сферах, не выключаючы навуковай, надзвычай спажыўную глебу для разрастання шэрасці, умацоўвала дух стагнацыі. Утвараліся цэлыя навуковыя кланы з тых, для каго галоўным было камфортна спачываць на лаўрах, стрыгчы купоны з заслуг заўчарашняга дня. Таго ж, хто адважваўся ісці не ў нагу, браўся церабіць у той

ці іншай навуковай галіне новы, адметны шлях, пачыналі дзяўбсці дружна і бязлітасна: выскачкі нам не патрэбны!

Меўся цэлы арсенал выпрабаваных прыёмаў супраць «надта ўвішных». Напрыклад, на пасяджэнні экспертнай камісіі забараніць публікацыю той ці іншай работы, аб'явіўшы яе сакрэтнай. Там, маўляў, ёсць звесткі, раскрыццё якіх нанясе шкоду інтарэсам дзяржавы. Так што лепш пакладзём ваш шэдэўр у надзейны сейф і зачынім на ключ — далей ад варожага вока...

Такім чынам неаднойчы рабілі падножку і супрацоўнікам кафедры ядзернай фізікі. Кожны раз гэта балюча закранала і самалюбства Шушкевіча. Прыгожы выраз пра тое, што за чужыя працы ён перажываў як за свае, тут не зусім дарэчы, бо жорсткага падзелу на «тваё» і «маё» на кафедры проста не існавала. Праца сучаснага навукоўца-фізіка ўвогуле мала нагадвае легенду пра Ньютанаў яблык. Перш за ўсё гэта, мовячы па-спартыўнаму, камандная гульня, гэта сумесныя мазгавыя атакі, гэта гіганцкія аб'ёмы калектыўных даследаванняў, калі канчатковы вынік непрыкметна выкрышталізоўваецца падчас шматдзённых руцінных намаганняў. Большасць сваіх прац Шушкевіч зрабіў у сааўтарстве з калегамі. Дзесяткі маладых навукоўцаў пад яго кіраўніцтвам падрыхтавалі і абаранілі дысертацыі. Таму няцяжка было зразумець эмоцыі загадчыка кафедры, калі супраць кагосьці з яго супрацоўнікаў зноў выкарыстоўвалі недазволены прыём...

Аднойчы цярпенне лопнула. Але ён не стаў учыняць скандал, вырашыў правучыць нядобразычліўцаў інакш: узяў ды і падсунуў экспертнай камісіі аўтарскую заяўку, якой да таго часу ўжо далі «зялёнае святло» ў Маскве. Гэта была праца зусім іншых людзей, але ён выдаў яе за плён намаганняў сваіх супрацоўнікаў, назваўшы да таго ж менавіта тыя прозвішчы, што выклікалі сапраўдную алергію ў аднаго з самых актыўных дзеячаў экспертнай камісіі.

Той імгненна клюнуў на прынаду і, узяўшы слова, доўга і імпэтна даказваў, што даваць гэтай працы ход — недапушчальна.

Шушкевіч цярпліва выслухаў і... выклаў на стол станоўчае заключэнне Дзяржкамвынаходніцтва. У палымянага выступоўца імгненна адвісла сківіца...

Праўда, неўзабаве ён ачомаўся і ў парткам універсітэта пайшла гнеўная папера: маўляў, прафесар Шушкевіч распе已разаўся да такой ступені, што спрабаваў дэстабілізаваць работу экспертнай камісіі шляхам гнюс-

най правакацыі... Шуму было шмат, але ў рэктараце палічылі за лепшае замяць скандал: занадта ўжо анекдатычным выглядала становішча, у якое трапілі шаноўныя эксперты.

* * *

Ну, а ў 1970-ым, абараняючы доктарскую ў адным з прэстыжных маскоўскіх інстытутаў, ён, на сваё шчасце, меў справу з людзьмі зусім іншага складу і маштабу. Гэта было, без перавелічэння, цэлае сузор'е навуковых знакамітасцяў сусветнага рангу, у тым ліку і два Нобелеўскія лаўрэаты. Адзін з членаў савета задаў на пасяджэнні аж дваццаць шэсць пытанняў! Карацей, патураць мінскаму калегу тут ніхто не збіраўся — «дапытвалі» бязлітасна. Але ў выніку мусілі пераканацца: перад імі — цвёрды арэшак.

Ужо выходзячы з залы, дзе праходзіла пасяджэнне савета, ён пачуў краем вуха нечую сцішаную рэпліку:

— Але ж спакой у гэтага маладога чалавека проста алімпійскі...

Адкуль было ведаць сівым акадэмікам, што, хвалюючыся перад сустрэчай з імі, як хлапчук, ён упершыню ў жыцці глынуў паўтаблеткі супакойваючага сродку — мепрабамату. Падзейнічала шалёна! Свядомасць працавала дакладна, пытанні схопліваліся імгненна, адказы гучалі ўпэўнена і энергічна — але ўражанне было такое, што усё гэта робіць нехта другі, да каго табе няма асаблівай справы...

* * *

Між іншым, доктарская дысертацыя была напісана ў неверагодна кароткі тэрмін — за чатыры з паловай месяцы. Ну, «напісана» — гэта, можа, і залішне гучнае слова. Скажам больш сціпла — «аформлена», бо асноўныя напрацоўкі ўжо меліся. І усё адно — праца была проста катаржная. Здаецца, яшчэ ніколі ў жыцці не даводзілася заганяць сябе ў такія суровыя рамкі. Ён наўмысна ўскладніў задачу, бо ўвогуле меў у распараджэнні паўгода. Але першапачаткова разлічаную норму — дзесяць старонак тэксту штодзённа — вырашыў зрабіць яшчэ больш жорсткай. Няма чаго лынды біць, даражэнькі,— сказаў сам сабе,— пятнаццаць старонак штодня, і не менш!

Такой прадукцыйнасцю рэдкі пісьменнік пахваліцца. Гэта ж быў не белетрыстычны, а складаны навуковы тэкст, нашпігаваны безліччу формул і мудрагелістых вузкаспецыяльных тэрмінаў. Але, хоць іншым разам

пад вечар пачыналі ўжо плысці кругі перад вачыма, запланаваны тэмп вытрымліваўся амаль што бездакорна.

Паставіўшы апошнюю кропку, падышоў да акна і, здаецца, упершыню заўважыў, што на дварэ ўжо май, ззяе сонца і зелянеюць дрэвы. І ўвогуле — жыццё цудоўнае і дзівоснае!

Ён сабраў руказак і махнуў з сябрам (добра, калі ёсць сябар з аўтамабілем!) у фантастычна бестурботнае і хвацкае падарожжа: акуратныя, зялёныя прыбалтыйскія гарадкі з вастрыямі касцельных вежаў, мілым акцэнтам ветлівых людзей і духмянай кавай ва ўтульных падвальчыках-кавярнях; Калінінград, дзе так і не сцерліся рысы ранейшага Кёнігсберга; залатыя цыбуліны-купалы пскоўскіх і наўгародскіх храмаў...

І ўжо нейкім неверагодным сном здаваліся месяцы знясільваючай працы, тэмп якой быў прадыктаваны не самымі ўдалымі жыццёвымі абставінамі. А пачалося з таго, што двума гадамі раней Шушкевіч атрымаў прэстыжную прапанову — стаць прарэктарам па навукова-даследчай рабоце ў Мінскім радыётэхнічным інстытуце. Не вельмі хацелася развітвацца з універсітэтам, з кафедрай, дзе ён працаваў тады загадчыкам сектара лабараторыі, але новая перспектыва выглядала вельмі заманлівай — па-першае, сур'ёзнае павышэнне, па-другое, абяцаюць самыя спрыяльныя ўмовы для асабістай навуковай працы, кватэру... Узважыў — і згадзіўся. Напачатку ўсё на новым месцы ішло як мае быць. Але чым далей, тым усё больш напружанымі станавіліся адносіны з рэктарам «радыётэха». Гэты ўладны, наравісты чалавек не цярпеў пярэчанняў, імкнуўся жорстка дыктаваць сваю волю. У выпадку з Шушкевічам каса наскочыла на камень. Пасля шэрагу сур'ёзных сутычак, пагаварыўшы па-мужчынску з вока на вока, прыйшлі да высновы, што паразумецца наўрад ці змогуць, суіснаваць жа пад адным інстытуцкім дахам як той кот з сабакам — толькі абодвум на шкоду. Дамовіліся разысціся мірна: Шушкевіч звальняецца, але перад тым атрымлівае паўгадавы творчы водпуск, каб напісаць нарэшце шматпакутную дысертацыю, да якой (між іншым, і з-за ўсёй гэтай калатні таксама) рукі так і не даходзілі...

Абодва сваё слова стрымалі.

Шушкевіч, датэрмінова скончыўшы дысертацыю, паспеў яшчэ трохі і адпачыць.

У верасні 1969-га ён вярнуўся ў альма-матэр, на родную кафедру ядзернай фізікі. Праз нейкі час яго выберуць загадчыкам.

* * *

Будзе, праўда, яшчэ адзін крытычны момант, калі Шушкевіч ледзь не надумае пакінуць не толькі кафедру, але і Мінск.

Прымчацца ганцы аж са Львова, прапануюць высокую пасаду ў навукова-даследчым інстытуце, паабяцаюць шыкоўную кватэру ў цэнтры горада, каля Замкавай гары...

Іх візіт быў невыпадковы. Львавяне прачулі, што вядомы мінскі навуковец (яны даўно марылі пра такога спецыяліста!) застаўся фактычна без даху над галавой, пакінуўшы трохпакаёвую кватэру пасля разводу былой жонцы...

З Алай, хімікам па адукацыі, ён пазнаёміўся ў свой час таксама на кафедры. У 1963-ім пажаніліся, у 1964-ым нарадзілася дачка, якую ў гонар ягонай маці назвалі Алёнкай. Але сумеснае жыццё, на жаль, не склалася. І вось у 1972-ім афармілі развод. Ён не перашкодзіць, аднак, захаваць прыстойныя, добразычлівыя стасункі.

Дачка ж увогуле застанецца ягоным блізкім, верным сябрам.

Алена скончыць музычнае вучылішча, кансерваторыю, аспірантуру, пачне выкладаць у Мінскім інстытуце культуры... Яна заўжды будзе адчуваць шчырую бацькаву ўвагу і падтрымку — і адказваць яму гэткай жа шчырай любоўю і разуменнем.

А тады ён усё ж адмовіўся ад спакушальнай прапановы львавян. Перайшоў жыць ва універсітэцкі інтэрнат. Жартаваў: «Я, мусіць, адзіны ў свеце прафесар, што жыве ў інтэрнаце». Праз год атрымаў двухпакаёўку ў доме па вуліцы Адоеўскага. Тут давядзецца пражыць амаль два дзесяцігоддзі, у тым ліку два гады — ужо працуючы Старшынёй Вярхоўнага Савета. Заняўшы гэтую пасаду, Шушкевіч катэгарычна адмовіцца ад прапанаванай яму раскошнай загараднай рэзідэнцыі. Хоць да таго часу ў кватэрцы на Адоеўскага стане даволі цесна: ён будзе жыць тут з другой жонкай і сынам.

Знаёмства з Ірынай Сіманенка, дачкой вайскоўца, таксама адбудзецца ва універсітэцкіх сценах. У 1976-ым, скончыўшы вучобу і атрымаўшы дыплом фізіка, яна стане Ірынай Шушкевіч. У 1984-ым народзіцца Стасік... І толькі праз дзесяць гадоў, калі падыдзе чарга, сям'я перабярэцца ў чатырохпакаёўку. Знойдуцца, дарэчы, дэпутаты, якія папракнуць Шушкевіча нават гэтым. Ён



З дачкой Аленай. 1971 год

не стрымаецца, адкажа аднаму саноўнаму парламентарыю: «Прабачце, але такую кватэру, як у мяне зараз, вы мелі ўжо шмат-шмат гадоў таму...» Тады ж нехта з нядобразычліўцаў пусціць плётку, быцца Старшыня Вярхоўнага Савета патаемна будуе сабе шыкоўны палац у Польшчы. Давядзецца зазначыць у адным з тэлеінтэрв'ю: «Нідзе я нічога не будую, а ў накірунку да Польшчы, каля Негарэлага, у мяне на універсітэцкай пляцоўцы ёсць чатыры з паловай соткі зямлі. І ўжо калі нехта хоча праверыць, што не пяць — дык, калі ласка, я запрашаю. І там у мяне ёсць дамок, у якім я вельмі добра сябе адчуваю і які збудаваў пераважна сваімі рукамі, з дапамогай сяброў».

Сапраўды, атрымаўшы ў 1986 годзе лапік зямлі ў садова-агародніцкім таварыстве, ён вырашыў абысціся без паслуг шабашнікаў. Сам прыдумаў праект дачнага дамка, сам і стаў яго ажыццяўляць. Як толькі выпадала вольная часіна, клаў у багажнік сваіх «Жыгулёў», купленых двума гадамі раней, усе неабходныя цяслярскія прычындалы і кіраваў у бок Негарэлага. Набыты калісьці спрыт у абыходжанні з інструментам стаўся тут вельмі дарэчы. Працаваў з сапраўднай асалодай, адпачываючы душою ад усіх гарадскіх клопатаў.

Пазней, калі стане ўжо Старшынёй Вярхоўнага Савета, «дачную» тэму дашчэнту зашмальцуюць журналісты. З публікацыі ў публікацыю будуць качаваць замілаваныя вохі ды ахі: уяўляеце, кіраўнік дзяржавы сам габлюе дошкі!

А ён пры кожнай магчымасці будзе з яшчэ большым задавальненнем з'язджаць сюды, у прыгожы ціхі куток, дзе можна хоць ненадоўга спачыць ад бясконцых палітычных боек, падчас якіх хто-ніхто з апанентаў не грэбуе самымі непрыгожымі сродкамі. І прыдумаюць жа — «палац у Польшчы»!

* * *

У яго заўжды было шмат сяброў, але хапала і непрыяцеляў.

**Распавядае загадчыца лабараторыі Інстытута ядзерных праблем пры Белдзяржуніверсітэце Ірына Якаўлеўна ДУБОЎСКАЯ:**

— Я ў свой час трапіла на кафедру ядзернай фізікі менавіта дзякуючы Шушкевічу: жанчыну не вельмі хацелі браць, але ён дамогся...

І адразу ж заўважыла ў адносінах да яго выразную палярызацыю. Адны — шчыра паважалі, захапляліся ім, іншыя ж не ўтойвалі сваіх антыпатый. На самой



Дзень заключэння шлюбу. Справа — жонка Ірына. 1976 год

кафедры большасць складалі, безумоўна, ягоныя прыхільнікі, калектыў у нас быў увогуле дружны, згуртаваны. А вось на факультэцкім, універсітэцкім узроўнях хапала тых, хто глядзеў на Шушкевіча скасавурана...

Ён не мог цярпець пустой балбатні, дылетанцтва. Вышэй за ўсё ставіў прафесіяналізм. Сам працаваў вельмі шмат і таго ж патрабаваў ад іншых. Так, ён практыкаваў дэмакратычны, разняволены стыль узаемаадносін. Але часам мог і ўзарвацца, нагаварыць рэзкасцяў... Ягоная катэгарычнасць не ўсім была па нутру. Хто-ніхто надоўга затойваў крыўду, а то і дробна помсціў пры зручнай нагодзе...

І яшчэ. Шушкевіч страшэнна ненавідзеў усялякія хітрыкі, махінацыі. Калі даведваўся, напрыклад, што хтосьці паквапіўся на казённае дабро,— гэта прыводзіла яго ў сапраўдную лютасць. Сам ён у гэтых адносінах выглядаў сапраўды крыштальна — не пабаюся такога гучнага слова. Хоць іншы на ягоным месцы, каб



З сынам Стасікам. 1989 год

захацеў, мог бы добра пагрэць рукі. Кафедра ж была багатай: дарагое абсталяванне, тэлевізары, халадзільнікі — усё што хочаш. Заказы буйныя, мільёны рублёў штогод праз кафедру пракручваліся... Я ўпэўнена — да ягоных рук ніводная казённая капейка не прыліпла. Мы, напэўна, здзівіліся б, даведаўшыся, што Шушкевіч знёс дадому з кафедры хаця б нейкі часопіс...

* * *

Урэшце, аднаму спецыфічнаму віду дробнага зладзейства на кафедры ніяк не маглі даць рады. Раз за разам таямніча знікалі экземпляры падручніка «Асновы радыёэлектронікі», напісанага Шушкевічам сумесна з М. Яфімчыкам. Кніга, дзе таямніцы складанай навукі былі выкладзены фенаменальна проста, лапідарна і паслядоўна, лічылася сярод студэнтаў фізфака бестселерам № 1. Нават адпеты прагульшчык, адолеўшы гэты на дзіва кампактны падручнік (пад адной вокладкай, на 16 друкаваных аркушах,— праграма чатырох семестраў!), мог потым адказваць на экзамене бы рэпу секчы. У бібліятэцы ж на ўсіх экземпляраў не хапала...

У 1986 годзе «Асновы радыёэлектронікі» выйшлі другім, перапрацаваным і дапоўненым выданнем. Аўтары атрымалі Дзяржаўную прэмію Беларусі. Сам жа падручнік быў добра вядомы і за межамі рэспублікі. Масква афіцыйна рэкамендавала яго для навучання ўсіх будучых фізікаў на тэрыторыі Савецкага Саюза.

Дарэчы, удасканаліць падручнік дапамаглі і самі студэнты. Умовы былі ўзаемавыгадныя: за кожную недакладнасць, друкарскую памылку, знойдзеную ў першым выданні, адзнака на экзамене павышалася на бал. Эфект атрымаўся цудоўны... Але ж, вядома, галоўную працу выканалі самі аўтары. У выніку, захаваўшы ранейшы аб'ём, падручнік увабраў у сябе шмат дадатковага матэрыялу, стаў яшчэ больш лаканічным і зразумелым.

* * *

— Я ніколі не патрабую, каб студэнты акуратна наведвалі мае лекцыі. Хто зможа адолець курс самастойна — калі ласка. Так што хочаце — хадзіце, хочаце — не. Мяне цікавіць толькі канчатковы вынік — якія веды прадэманструеце на экзамене.

Прыкладна так пачынаў Шушкевіч першую лекцыю напачатку чарговага навучальнага года.

Кожны, хто быў студэнтам, ведае: ёсць выкладчыкі, якія пільна сочаць, хто як ходзіць на іх лекцыі, і

потым, на экзамене, даюць добрага пытлю тым, чые фізіяноміі на працягу семестра мільгалі ў аўдыторыі не надта часта. Іншым разам толькі гэтая акалічнасць ды яшчэ страх перад дэканацкай праверкай, пасля якой можна як двойчы два застацца без стыпендыі, дапамагаюць стварыць кволы «кворум» на лекцыях нелюбімага, сумнага прафесара.

У Шушкевіча ніколі не было патрэбы змагацца за ўвагу да сябе такімі вось рэпрэсіўнымі сродкамі. Калі шчыра, то, даючы «індульгенцыю» прагульшчыкам, ён добра ведаў, што ёю мала хто пакарыстаецца.

На лекцыях Шушкевіча сухая матэрыя пачынала пульсаваць, пераліваца шматколернасцю жывых фарбаў. Пра складаныя рэчы ён гаварыў не толькі проста, але і сапраўды артыстычна. Студэнты хадзілі «на Шушкевіча», як эстэты ходзяць у тэатр на любімага акцёра.

Ва універсітэце не памятаюць выпадку, каб хтосьці са студэнтаў быў выключаны па ягонай ініцыятыве за непаспяховасць. Ён неаднойчы казаў іншым выкладчыкам: «Калі вы выганяеце студэнта,— значыць, дрэнна вучылі».

* * *

**Распавядае дацэнт кафедры ядзернай фізікі БДУ Ганна Максімаўна ЗАЙЦАВА:**

— Ён стварыў такую кафедру, што потым спатрэбілася вельмі шмат часу, каб яе разваліць. Выдатны арганізатар. Прыклаў каласальныя высілкі, каб мы мелі самае сучаснае лабараторнае абсталяванне. Увесь час падштурхоўваў нас, не даваў спыняцца. Цяпер бачым: як толькі у 1986-ым Шушкевіч перайшоў на пасаду прарэктара універсітэта,— пачалася дэградацыя кафедры. Ён па-ранейшаму лічыўся загадчыкам, працягваў чытаць лекцыі, але столькі часу, як раней, удзяляць кафедры ўжо не мог. Шкада, што не паклапаціўся як след пра добрую замену...

Так, іншым разам яго падводзіла залішняя імпульсіўнасць. Бывалі выпадкі нейкай бравады: вы кажаце так, а я вазьму ды і зраблю наадварот. Потым сам прызнаваўся: гэтае рашэнне было памылкай... Мы з ім часта спрачаліся. Упарты, але злосці ні на кога доўга не трымае.

А ўвогуле я яго даўно ведаю. Некалі вучыліся разам ва універсітэце, толькі на розных курсах. Ён вылучаўся, у першую чаргу, сваім уменнем дасціпна жартаваць, быць душой кампаніі. І на кафедры такім самым заставаўся. Калі адпачываем — усе рабочыя праблемы ўбок. Часта ўсёй грамадой за горад ездзілі. Калі Шушкевіч

шашлыкі падсмажыць — пальчыкі абліжаш. А ў сябе дома заўжды частаваў капустай, гуркамі ўласнага прыгатавання — таксама ўсе елі так, што аж за вушамі трашчала. Анекдоты расказвае проста артыстычна. Прычым кожны раз новыя, «барадатых» ад яго ніколі не чулі. І гумарыстычную насценгазету «Антысмехатрон» на кафедры проста прымушаў нас рэгулярна выпускаць, кажучы напаўжартам: «Інакш — звольню!». Хтосьці з універсітэцкага начальства нават зазначыў аднойчы з іроніяй: «Асноўны від дзейнасці кафедры ядзернай фізікі — гэта насценны друк». На розыгрышы Шушкевіч ніколі не крыўдзіўся, гэта ў нас традыцыя была.

Дзякуй Богу, гумар дапамагаў нам трымацца ўбаку ад таго маразму, што захліствай краіну. Патрабавалася, напрыклад, каб мы рэгулярна вывучалі працы класікаў марксізму-ленінізму. Ну што — збяромся, чаю разам пап'ём, складзём патрэбную справаздачу «наверх»... І калі гарбачоўская антыалкагольная кампанія пачалася і ў некаторых арганізацыях начальства прымушала ледзь ці не ўсіх пагалоўна ў таварыства цвярозасці запісвацца, на кафедры толькі пажартавалі з гэтай нагоды.

Мы не з'яўляліся нейкімі дысідэнтамі, проста было здаровае непрыняцце абсурду, маразму.

* * *

Калі казаць шчыра, то ён стараўся ўвогуле як мага меней думаць пра палітыку, пра Сістэму. Ёсць мора працы, якая табе падабаецца, ёсць процьма сяброў, з якімі можна весела адпачываць,— што яшчэ трэба?

І потым, хіба не прыгожа, не высакародна выглядае сама Ідэя — каб ніхто не быў прыніжаным, прыгнечаным, выкінутым на ўзбочыну? Мажа, краіне, дзе задумалі гэтую ідэю рэалізаваць, проста не шанцуе на правадыроў?

Так, дарэчы, меркаваў і ягоны бацька. Чалавек, што два дзесяцігоддзі прабыў у сібірскай няволі, тым не менш працягваў лічыць, што сталінізм — гэта толькі выродлівы выкідыш той Ідэі, якая сама па сабе здольная нарадзіць сапраўды светлую будучыню. Менавіта па перакананнях, а не дзеля кар'еры — якая магла быць у той час кар'ера ў чалавека з такой анкетай? — Станіслаў Пятровіч ужо ў сталым узросце, у 1965 годзе, уступіў у камуністычную партыю.

Станіслаў неаднойчы бываў ў ягонай кватэрцы па Горным завулку, якую бацька атрымаў ад Саюза пісьменнікаў пасля вяртання з Сібіры, калі стаў працаваць

у газеце «Літаратура і мастацтва». Шушкевіч-старэйшы распавядаў пра тое, што давялося пеpажыць: як па чацвёра-пяцёра сутак блукаў па дрымучай тайзе, начаваў пад заснежанымі піхтамі, правальваўся ў сцюдзёную ваду, пад першы енісейскі лёд... Але бацька быў упэўнены, што ва ўсіх ягоных пакутах вінаватыя толькі тыя асобна ўзятыя нягоднікі, што сказілі Ідэю дзеля сваіх карыслівых, драпежных мэтаў.

З гэткім жа перакананнем памерла і Станіслававa маці. І ён таксама доўгі час успрымаў маразм Сістэмы толькі як маразм яе кіраўнікоў.

* * *

Між тым заставацца зусім убаку ад так званага «грамадска-палітычнага жыцця» не мог тады ніхто. Ужо нават каб цябе зацвердзілі дацэнтам кафедры, трэба было атрымаць станоўчыя рэзалюцыі на адпаведных паперах ад раённага партыйнага начальства. Калі зацвярджалі загадчыкам кафедры, прарэктарам, ранг «дазваляльнікаў» быў яшчэ вышэйшы. І ўвогуле, прарэктару тады па ўсіх канонах ніяк не выпадала заставацца па-за шэрагамі КПСС.

У 1967 годзе Шушкевіч напісаў заяву аб уступленні ў камуністычную партыю. Ён не рваўся туды,— многія аднагодкі, каб забяспечыць кар’еру, зрабілі гэта куды раней,— але і не адмаўляўся. Вырашыў для сябе: што б там, у вышэйшых сферах, ні рабілася, а я буду сумленным камуністам.

Ён выйдзе з партыі ў чэрвені 1990-га,— пераканаўшыся, што ўсе ілюзіі рухнулі. Зробіць гэта, у адрозненне ад многіх іншых, без усялякіх «шумавых эфектаў». Проста занясе заяву ў партком і пойдзе ў чарговы адпачынак.

* * *

Адзін з балючых udараў па ягонай наіўнай веры ў Ідэю быў атрыманы яшчэ ў тыя часы, якія потым назавуць застойнымі.

Як вядома, навукоўцаў прымалі тады ў КПСС строга па «ліміту» — каб у партыі захоўвалася патрэбная прапорцыя паміж прадстаўнікамі рабочага класу, якія не вельмі туды імкнуліся, але, па тэорыі, з’яўляліся партыйным ядром, і інтэлігенцыяй, прадстаўнікам якой без партбілета нечага было і марыць пра павышэнне па службе, але якую, згодна з той жа тэорыяй, лічылі не надта надзейнай грамадскай праслойкай.

Прыняць у партыю па атрыманаму нарэшце

доўгачаканаму «ліміту» вырашылі маладога, перспектыўнага дацэнта Яноўскага. Усе належныя паперы пайшлі на зацвярджэнне ў райкам. І раптам адтуль ледзяным тонам паведамляюць: кандыдатура недастойная! Як высветлілася, райкам атрымаў з «органаў» інфармацыю, што некалі, яшчэ ў 1932 годзе, бацька Яноўскага адмаўляўся ўступіць у калгас. Уступіў, але не адразу. Праявіў, карацей кажучы, несвядомасць...

Усе спробы пераканаць партыйных чыноўнікаў сталіся дарэмнымі. Урэшце, хто-ніхто з іх нават спачуваў напаўголаса: верым, маўляў, што чалавек сумленны, але ж ... з такімі плямамі ў біяграфіі прымаць катэгарычна забаронена. Пасля безвыніковых размоў у кабінетах з партрэтамі Ільіча Шушкевіч адчуў пякучы сорам і расчараванне...

Праз нейкі час на той самай падставе хацелі забараніць паездку Яноўскага на Кубу. Тут ужо Шушкевіч не стрымаў абурэння, пайшоў напралом.

Паездку дазволілі. Але гэта было не надта вялікім суцяшэннем.

* * *

А потым прагрымеў чарнобыльскі выбух.

Шушкевіча як спецыяліста ў галіне ядзернай фізікі ўключылі ў склад створанай у рэспубліцы камісіі, што даследавала наступствы катастрофы.

Наступствы былі страшныя. Патрабаваліся тэрміновыя і маштабныя захады, каб ратаваць мільёны людзей ад смертаносных нуклідаў, што нябачным ліўнем абрынуліся на беларускую зямлю. А дзеля гэтага патрабавалася перш за ўсё ўголас сказаць поўную праўду аб небяспецы.

Але якраз гэтага не хацела рабіць ні маскоўскае, ні мінскае вышэйшае кіраўніцтва. Сістэма, пабудаваная на хлусні, і на гэты раз засталася вернай сабе. «Нічога страшнага!» — такі быў лейтматыў афіцыйных паведамленняў у сродках масавай інфармацыі. Даныя аб маштабах трагедыі часткова ўтойваліся, часткова фальсіфікаваліся. Пільныя цэнзары строга сачылі, каб у друк не трапіла нічога «лішняга». Тым жа, хто, разумеючы ступень бяды, спрабаваў біць у званы, бесцырымонна затыкалі рот, выкручвалі рукі. Шушкевіча, які настойліва дамагаўся, каб былі абнародаваны сапраўдныя даныя аб выніках катастрофы, проста выкраслілі са спісу членаў камісіі...

Што маглі, рабілі на кафедры. Тады, летам 1986-га, ніводзін супрацоўнік не пайшоў у адпачынак. Ар-

ганізавалі праверку прадуктаў на радыеактыўнае забруджванне. Сюды з сумкамі і авоськамі прыходзілі людзі з усяго Мінска. Яшчэ раней, у першыя дні мая, па загаду Шушкевіча на кафедры быў створаны пункт, дзе кожны жадаючы мог праверыць, ці не «наглытаўся» ён радыеактыўнага ёду.

Прачуўшы пра гэта, яго выклікалі ў гаркам партыі.

— Што за самадзейнасць вы там развялі?! Неадкладна спыніце!

Ён не падпарадкаваўся. Сказаў першаму сакратару гаркама Уладзіміру Галко: можа, у палітычных праблемах вы і вялікі знаўца, што ж да радыелагічных — дазвольце ўжо мне вас адукаваць... Насуперак усяму Шушкевіч арганізаваў на кафедры навучанне спецыялістаў метадам прафілактыкі радыеактыўнай небяспекі. У цэлым шэрагу арганізацый і ўстаноў дзякуючы супрацоўнікам кафедры ядзернай фізікі запрацавала дарагая апаратура, прызначаная для гэтых мэтаў і паспеўшая ўжо зарасці пылам... Не шкадавалі, аддавалі ў карыстанне і адпаведныя прыборы з кафедры. Шушкевіч рабіў усё што мог. Але што значылі ягоныя высілкі ў маштабах рэспублікі! Мільёны беларусаў, ні аб чым не падазраючы, працягвалі падстаўляць сябе пад бязлітасны абстрэл радыяцыі. Праз год–другі гэта агукнецца нябачаным раней успляскам хвароб.

Сістэма ўчыніла яшчэ адно жахлівае, цынічнае злачынства.

Цяпер ён выразна разумеў: справа — не ў кіраўніках, справа — менавіта ў Сістэме.

Гэта быў час пакутлівага пераасэнсавання ранейшых поглядаў, час развітання з ілюзіямі.

Між тым абвешчаная Гарбачовым палітыка перабудовы, нягледзячы на сваю палавіністасць, непаслядоўнасць, пакрысе ўсё ж стварала глебу для першых кволых парасткаў дэмакратыі. На мітынгах, у газетных артыкулах публічна загучалі думкі, якія год–два назад можна было выказаць хіба што напаўголаса на кухні, ды і то толькі надзейнаму сябру. Нешматлікі, але дзёрзкі атрад тых, хто загарэўся ідэямі рэфарматарства, распачаў цяжкі бой з магутным войскам кансерватыўнай наменклатуры. Кожны дадатковы «штык» быў для рэфарматараў на вагу золата. Заставацца простым назіральнікам не выпадала...

І калі калегі прапанавалі Шушкевічу стаць кандыдатам у народныя дэпутаты СССР — ён згадзіўся.

З гэтай хвіліны пачнецца ягоны палітычны лёс.

## ГАРАЧЫ КРАСАВІК

— А што, Станіслаў, калі вылучым кандыдатам цябе? Напачатку ён падумаў, што калегі жартуюць. Але тыя сталі даводзіць на поўным сур'ёзе: няўжо, маўляў, так і будзем варон лічыць, між тым як апаратчыкі мандат за мандатам да сваіх рук прыбіраюць? Трэба ж супраціўляцца, ствараць альтэрнатыву! Няхай у дэпутаты праб'ецца хоць невялікая група людзей, не звязаных наменклатурнай кругавой парукай, і то кансерватарам цяжэй будзе правіць на з'ездзе ў Маскве свой баль...

— Карацей, ты толькі не адмаўляйся, калі мы на сходзе тваё прозвішча назавём, і усё будзе выдатна. Ва універсітэце цябе ведаюць і падтрымаюць. Ты здольны перамагчы!

* * *

Тады, вясною 1989-га, выбары ў вышэйшы орган дзяржаўнай улады СССР упершыню праводзіліся па новаму, «перабудовачнаму» закону. Дэклараваўшы палітыку дэмакратызацыі, Гарбачоў не мог ужо трымацца за ўсталяваную Сталіным адыёзную выбарчую сістэму, якая толькі груба імітавала народнае волевыяўленне: безальтэрнатыўныя кандыдаты, папярэдне вызначаныя партыйнымі камітэтамі, аўтаматычна станавіліся «народнымі выбраннікамі» і гэтаксама аўтаматычна галасавалі за ўсе патрэбныя кіруючай эліце рашэнні...

Новы закон упершыню ў савецкай гісторыі зрабіў передвыбарную барацьбу рэальнасцю. Разам з тым, як і ўся палітыка Гарбачова, ён выглядаў непаслядоўна, палавіністa. Партыі надта ж не хацелася выпускаць лейцы са сваіх рук. Трэцяя частка дэпутацкіх мандатаў была адразу зарэзервавана за прадстаўнікамі КПСС, камсамола і іншых паслухмяных «кіруючай і накіроўваючай» грамадскіх арганізацый. Выбары дэпу-



З Васілём Быкавым на кафедры ядзернай фізікі БДУ

татаў у гэтых арганізацыях ператварыліся ў большасці выпадкаў у знаёмы да болю фарс: за каго загадана, за тых і галасуем... Дзеля справядлівасці трэба зазначыць, што для адводу вачэй выбралі і каго-кольвечы з людзей, далёкіх ад наменклатурнага істэблішменту (такім чынам, напрыклад, сталі народнымі дэпутатамі краіны зорка беларускай літаратуры Васіль Быкаў, нашыя вядомыя мастакі Уладзімір Стальмашонак і Міхась Савіцкі, з якімі Шушкевіч потым будзе актыўна кантактаваць падчас дэпутацкай работы). І ўсё ж за кошт выбараў ад грамадскіх арганізацый перш за ўсё забяспечыла сабе бестурботнае атрыманне мандатаў ладная кагорта апаратных бонзаў.

Але і гэтага здавалася замала. Заставаліся ж яшчэ і выбары па тэрытарыяльных акругах. Практычна ў кожнай з іх, імкнучыся і тут працягнуць як мага болей «сваіх», партыйныя камітэты сталі нахабна, безапеля-

цыйна дыктаваць уласную волю. Самыя беспардонныя метады пайшлі ў ход, каб «заваліць» няўгодных кандыдатаў. Іх шантажавалі, бамбілі ў паслухмяным партыі друку і ўжо зусім бессаромна палівалі брудам у ананімных улётках. А калі і гэта не дапамагала — наладжвалі натуральнае цкаванне на так званых акруговых перадвыбарных сходах. Гэты хітры інстытут быў дальнабачна прадугледжаны наменклатурнымі стратэгамі ў тым самым законе. Канчатковы вердыкт — хто з кандыдатаў дастойны рэгістрацыі, а хто не — выносіўся менавіта на такіх сходах, дзе часцяком вяло рэй магутнае апаратнае лобі, запраграмаванае на бязлітасную расправу з «выскачкамі»-дэмакратамі.

Гэтую брудную методыку добра спазнаў на сабе і Шушкевіч. Ён рызыкне выпрабаваць свой шанц пасля таго, як на першым этапе выбараў у ягонай акрузе з трэскам праваліцца навязаная «зверху» кандыдатура першага сакратара гаркама партыі Уладзіміра Галко. Выбаршчыкі выразна дадуць зразумець, што не жадаюць заставацца пакорлівымі авечкамі...

Такім чынам, выбары належала ладзіць занава. Вось тады калегі і наважыліся прапанаваць кандыдатуру Шушкевіча. Прапанова прагучала на універсітэцкім сходзе 7 красавіка. Былі названы і іншыя імёны, але ў выніку тайнага галасавання Шушкевіч прыкметна апярэдзіў астатніх прэтэндэнтаў, у тым ліку лідэра Беларускага народнага фронту Зянона Пазьняка.

Да гэтага Шушкевіч мала ведаў пра Народны фронт, а на пытанне аб стаўленні да ягонай праграмы і ўвогуле мусіў толькі развесці рукамі, шчыра прызнаўшыся:

— А я з ёй проста незнаёмы...

Гэта было, па-першае, вынікам той магутнай інфармацыйнай блакады, якую наладзілі вакол толькі што створанага нацыянальна-дэмакратычнага руху тагачасныя партыйныя босы Беларусі, па-другое ж, праца на кафедры «з'ядала» практычна ўвесь час...

Разам з тым сход паказаў: ва універсітэце ў Пазьняка ўжо даволі шмат прыхільнікаў, знаёмых з ідэямі руху па мітынгах і саматужных пракламацыях.

Назаўтра раніцай Шушкевіч знойдзе на сваім рабочым стале ксеракопію праграмы БНФ. І прыйдзе да высновы, што працэнтаў на дзевяноста пяць падзяляе яе палажэнні. Пераход да цывілізаванай рынчнай эканомікі, дэмакратычнага дзяржаўнага ладу, адраджэнне нацыянальнага духу, гістарычнай спадчыны беларусаў — усе гэтыя мэты былі сугучныя ягоным уласным поглядам. Праўда, пэўныя тэзісы здаліся занадта



На мітынгу БНФ, прысвечаным Чарнобыльскім праблемам

спрошчанымі і катэгарычнымі, адчуваўся дылетантызм складальнікаў праграмы ў шэрагу пытанняў — напрыклад, тых, што тычыліся рэфармавання вышэйшай школы (ужо пра што пра што, а пра гэтую сферу прафесар Шушкевіч мог меркаваць кампетэнтна).

І усё ж галоўным ідэям БНФ ён шчыра аддаў тады свае сімпатыі, пра што неаднойчы казаў падчас наступных публічных выступленняў. Гэта дало яму перадвыбарную падтрымку з боку сяброў Народнага фронту.

Пазней стасункі з БНФ стануць больш складанымі. У адных выпадках проста разыдуцца асобныя погляды, найчасцей жа сама кіруючая пасада ў беларускім парламенце пачне прымушаць Шушкевіча да манеўравання дзеля кампрамісу ва ўпартым, пагражаючым канчатковым расколам процістаянні палярных дэпутацкіх груповак. Гэта дасць апазіцыі падставы для шматлікіх крыўдаў, абвінавачванняў у «здрадзе ідэалам»...

Але пакуль што Шушкевіч пра гэтыя будучыя цяжкасці нават не падазрае. Пакуль што ідзе барацьба за мандат народнага дэпутата СССР.

* * *

На акруговым перадвыбарным сходзе акрамя ягонай разглядалі яшчэ шаснаццаць кандыдатур. Пакінулі ў

спісе для рэгістрацыі толькі шэсць. Выразна адчувалася, што сход імкнуцца весці па добра адрэпеціраванаму сцэнарыю. І ўсё ж Шушкевіч здолеў прарвацца ў лік тых шасцярых.

Каму-кольвечы гэта вельмі не спадабаецца. Праз нейкі час жыхары акругі пачнуць знаходзіць у сваіх паштовых скрынях улёткі, дзе прафесар Шушкевіч будзе абвінавачвацца ледзь ці не ва ўсіх смяротных грахах. Самая бязглуздая сітуацыя — калі замест таго, каб выкладаць перад выбаршчыкамі свае праграмныя ідэі, ты мусіш даводзіць, што не з'яўляешся зладзюгам з вялікай дарогі...

Падчас адной з такіх сустрэч, калі на Шушкевіча агрэсіўна насела купка крыклівых «выкрывальнікаў», раптам падала голас жанчына — як высветлілася, простая працаўніца друкарні:

— Ды каго вы слухаеце, людзі, яны ж самі прымушалі мяне вось гэтымі рукамі тую хлусню друкаваць!

«Выкрывальнікі» неяк адразу панурылі галовы, прыкусілі языкі.

А ўвогуле ўсе гэтыя недазволеныя прыёмы выклікалі ў яго нешта накшталт здаровай спартыўнай злосці: не, браткі, не на таго натрапілі!..

Шушкевіч удала набіраў ачкі падчас стыхійных, спантанных сустрэч, якіх было ў тыя дні багата. Хутка знайсці кантакт з суразмоўцамі, закрануць нерв іх інтарэсаў — гэтае ўменне далі яму гады працы ў студэнцкай аўдыторыі. Пазбягаў доўгіх нудных маналогаў, імкнуўся вылучыць галоўнае ў канкрэтным выпадку пытанне і энергічна, доказна выкласці свае погляды на гэты конт, скарыстаўшы не больш за дзесяць—пятнаццаць хвілін. Потым абавязкова пераводзіў сустрэчу ў рэжым дыялогу, лаканічна, упэўнена адказваючы на пытанні. І такім чынам выгадна вылучаўся на фоне тых кандыдатаў, што ператваралі свае сустрэчы ў сумныя акадэмічныя лекцыі.

Яму не давялося адмыслова шукаць давераных асоб — людзі, знаёмыя і незнаёмыя, самі пачалі прапаноўваць свае паслугі.

Удалося раз-другі прарвацца з тэзісамі перадвыбарнай праграмы ў друк, аднойчы — нават на тэлебачанне. Журналісты, што спрыялі гэтаму, даволі сур'ёзна рызыкавалі: кампартыя яшчэ надзейна трымала прэсу пад жалезнай пятой. Пераказваючы адзін з тэзісаў Шушкевіча у газетным артыкуле, ягоны аўтар палічыць за лепшае прышпіліць для страхоўкі няшчырую рэпліку:

«Ці не занадта радыкальна, ці не перагіб?». Гаворка ж ішла ўсяго толькі аб прапанове Шушкевіча даць грамадзянам СССР права свабодна выязджаць за мяжу... Тады і такой «крамольнай» думцы цяжка было прабіцца праз цэнзарскія фільтры.

Вельмі дапамаглі ў тыя дні калегі — іншым разам хадзілі агітаваць за Шушкевіча ледзь ці не ўсёй кафедрай. Іх таксама захапіў азарт гэтай напружанай, драматычнай барацьбы.

Пасля двух тураў галасавання прарэктар Белдзяржуніверсітэта Станіслаў Шушкевіч стаў народным дэпутатам краіны.

* * *

Ён быў абраны ад Беларусі, бадай, адным з апошніх. У большасці акруг барацьба закончылася раней, і ў Мінску паспелі ўжо нават правесці дэпутацкую нараду, якая ператварылася ў непрыхаваны партыйны інструктаж — як сябе паводзіць і за што галасаваць беларускім выбраннікам у Маскве на з'ездзе. Рэй вялі вядомыя выхаванцы КПБ — Анатоль Малафееў, Мікалай Дземянцей... Яны лічылі сваю ролю «камісараў» самой па сабе зразумелай, не падлягаючай ніякаму сумненню. Шушкевіча паспрабавалі далучыць да такіх рэгулярных інструктажоў ужо ў Маскве. Ён адрэагаваў наўмысна рэзка — каб адразу адчапіліся:

— Ведаеце, я ў гэтых вашых харавых спевах удзельнічаць не збіраюся.

З дзесятак ці трохі болей прадстаўнікоў беларускай дэпутацыі (а налічвалася ў ёй 96 чалавек) занялі гэткую ж пазіцыю. Сярод іх — малады мінчанін, будучы лідэр Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі Аляксандр Дабравольскі, гомельскі рабочы Віктар Карніенка, доктарка з Магілёўшчыны Зоя Ткачова, знакаміты беларускі навуковец Аляксандр Сцепаненка... Там, у Маскве, Шушкевіч добра пазнаёміцца і з дэпутатам Мікалаем Ігнатовічам, у якім убачыць прынцыповага чалавека, выдатнага прафесіянала следчай справы і якога потым прапануе на пасаду Генеральнага пракурора Беларусі. На жаль, лёс адвядзе Ігнатовічу кароткі век...

Гэтая невялічкая група стане рэзка кантраставаць з паслухмяна-кансерватыўнай большасцю дэпутатаў ад Беларусі, якія будуць дысцыплінавана галасаваць згодна з чарговай устаноўкай «камісараў».

Сюжэт выбараў на ўсім абсягу Саюза развіваўся падобна, таму і ў складзе іншых дэпутацый дэмакраты

апынуліся ў прыкметнай меншасці. Каб сабраць сілы ў кулак, яны аб'ядналіся ў Міжрэгіянальную групу. Увайшоў у яе і Станіслаў Шушкевіч.

«Міжрэгіяналы» распачалі надзвычай няроўны бой. Але яны адразу ж заваявалі сімпатыі мільёнаў і мільёнаў людзей, што неадрыўна сачылі за першымі з'ездаўскімі дэбатамі па тэлебачанні. Думку грамадскасці тады ўжо цяжка было ігнараваць. Кансерватары пачнуць здаваць асобныя пазіцыі, ахвяраваць найбольш адыёзнымі догмамі.

І хоць прынятая ў чэрвені 1989 года выніковая пастанова Першага з'езда народных дэпутатаў СССР была яшчэ шчодра нашпігавана замшэлымі тэзісамі, дэмакратам, тым не менш, удалося ўкленіць туды шэраг ідэй, за якія яшчэ зусім незадоўга да таго дысідэнтаў саджалі ў лагеры і ізалявалі ў «псіхушках»,— аб неабходнасці радыкальнай эканамічнай рэформы, прыняцця новай Канстытуцыі, дакладнага размежавання функцый паміж КПСС і дзяржаўнымі органамі, ліквідацыі незаконных прывілей кіруючай эліты. Цяпер у гэтых ідэях не бачна нічога рэвалюцыйнага, а КПСС і ўвогуле сышла ў нябыт, але тады...

На наступных з'ездах паўстала пытанне аб пераглядзе сумна вядомага 6-га артыкула Канстытуцыі, гвалтоўна замацаваўшага ў свой час кіруючую ролю КПСС; упершыню прагучала праўда пра злачынную змову Сталіна і Гітлера, у выніку якой савецкія войскі акупіравалі Балтыю; былі афіцыйна асуджаны афганская авантура, крывавая расправа савецкіх дэсантнікаў над мірнымі жыхарамі Тбілісі...

На той час толькі сказаць пра гэта на ўсю краіну значыла вельмі многа. Але хмель галоснасці пачне пакрысе выветрывацца. Усё выразней будзе бачна, што з'езд народных дэпутатаў — груваcткая, няўклюдная, інертная структура, створаная Гарбачовым найперш для імітацыі, а не для ажыццяўлення дэмакратычных перамен,— проста не ў стане на справе вывесці велізарную краіну з гістарычнага тупіка. У рэспубліках пачнуць усё больш сур'ёзна задумвацца аб пошуках уласнага, самастойнага выйсця. Стануць імкліва набіраць моц нацыянальна арыентаваныя палітычныя плыні. Гарбачоў не здолее знайсці з імі кампраміс, і гэта паскорыць фінал ягонай палітычнай кар'еры.

Шушкевіч жа, упэўніўшыся ў неэфектыўнасці дэпутацкіх намаганняў на саюзным узроўні, разам з тым адчуе, можа, у нейкай ступені і падсвядома: у бліжэйшы

час найбольш важныя для беларусаў праблемы будуць вырашацца менавіта ў самой рэспубліцы.

Яшчэ дзейнічаў стары, абраны па вядомаму фарсаваму сцэнарыю склад Вярхоўнага Савета Беларусі. Шушкевіч, карыстаючыся правам саюзнага дэпутата, пачаў наведваць пасяджэнні сесій, падключыўся да дэбатаў, што тычыліся, у прыватнасці, закона аб мовах, шляхоў вырашэння чарнобыльскай праблемы. Якраз па гэтых пытаннях, да гонару таго Вярхоўнага Савета, былі ў выніку прыняты даволі прагрэсіўныя рашэнні.

Але стала відавочна, што на тым рэсурс старога дэпутацкага корпуса вычарпаны. Урэшце, сыходзіў і тэрмін ягоных паўнамоцтваў.

Надзеі ўскладалі на новы парламент. Час пакажа, аднак, што і туды праб'ецца магутная кагорта «старой гвардыі». І Шушкевіч яшчэ хлебане з гэтым парламентам ліха.

Але тады быў час надзей. Шушкевіч, які паспытаў ужо смак вялікай палітыкі, цвёрда наважыўся змагацца за мандат народнага дэпутата Беларусі.

* * *

Вясной 1990-га выбары на Беларусі таксама праводзіліся па новаму закону. Урэшце, ён мала чым адрозніваўся па духу ад адпаведнага саюзнага. Нягледзячы на намаганні Шушкевіча і ягоных аднадумцаў, якія, скарыстоўваючы статус народнага дэпутата СССР, актыўна змагаліся на пасяджэннях беларускага парламента і ў друку за прагрэсіўны варыянт рэспубліканскага закону, наменклатура і тут здолела пакінуць для сябе хітрыя пралазы (у прыватнасці, велізарную квоту для дэпутатаў ад кампартыі і лаяльных да яе грамадскіх арганізацый, тыя ж акруговыя сходы). Перыпетыі передвыбарнай барацьбы таксама вельмі нагадвалі мінулагоднія: ва ўсіх акругах партапарат імкнуўся любым чынам праштурхнуць «сваіх» і адсеяць «нязручных» кандыдатаў.

Натуральна, што намер Шушкевіча паспаборнічаць за месца ў беларускім парламенце не выклікаў у апаратных колах вялікага энтузіязму. Хто-кольвечы, інтымна ўзяўшы яго ў калідоры пад ручку, спрабаваў напачатку ушчуваць мякка, «па-сяброўску»: ну нашто вам, шаноўны Станіслаў Станіслававіч, яшчэ адзін мандат — хіба мала прасторы для дзейнасці на саюзным узроўні?

Але спружына падзей ужо раскручвалася. Да Шушкевіча звярнуліся прадстаўнікі мінскага завода «Дар-

маш»: мы вас добра ведаем, падтрымліваем вашую палітычную пазіцыю, гатовы вылучыць у кандыдаты ад імя свайго калектыву. Ён згадзіўся.

На гэты раз акруга была значна меншая, чым годам раней: ужо не дзвесце, а толькі каля трыццаці тысяч выбаршчыкаў. Фактычна яна акаляла дом, у якім жыў Шушкевіч. Яго тут ведалі амаль усе (асабліва пасля тэлетрансляцый са з'езда народных дэпутатаў СССР), ды і ён паспеў пазнаёміцца са многімі, сустракаючыся па дарозе ва універсітэт, стоячы ў агульнай чарзе ў прадуктовай краме.

І цяпер, падчас новай выбарчай кампаніі, выступаючы то ў клубе, то ў «чырвоным кутку» домакіраўніцтва, то ў рабочым інтэрнаце, Шушкевіч кожны раз бачыў шмат знаёмых твараў, адчуваў, што для большасці аўдыторыі ён ужо «наш чалавек». Не было патрэбы ў доўгіх прэамбулах, сустрэчы хутка пераходзілі ў рэчышча ажыўленага, вольнага ад усялякіх «пратакольных» фармальнасцяў дыялогу.

Шмат гаварылі пра Чарнобыль. З праблемы да таго часу ўжо ўдалося амаль што цалкам сарваць камуфляж сакрэтнасці. Ва ўсёй жахлівасці адкрыліся і маштабы трагедыі, і маштабы цынічнай ілжы «правадыроў». Але Сістэма працягвала злачынна марудзіць. У бюракратычным балоце адзін за адным патаналі праекты барацьбы з радыяцыйнай навалай, між тым як рахунак яе ахвяр множыўся з кожным днём.

Калі казаць шчыра, то гэтую балючую тэму актыўна эксплуатавалі тады многія кандыдаты ў дэпутаты. Але хто-кольвечы ствараў сабе імідж толькі на красамоўных філіпіках па адрасу высокіх уладаў ды на легкадумных папулісцкіх абяцанках (якія гэтак жа лёгка забудуцца пасля атрымання запаветнага мандата).

Кожнае ж слова Шушкевіча было сто разоў узважана, грунтоўна падмацавана глыбокім, да драбніц, веданнем самой праблемы і звязаных з ёй закулісных гульняў у высокіх сферах. У яго быў ужо вопыт змагання супраць высмактанай з пальца ва ўгоду кіруючай вярхушцы канцэпцыі маскоўскага акадэміка Ільіна, згодна з якой умераныя «порцыі» нуклідаў выглядалі ледзь ці не дабратворнымі для здароўя... Шмат часу і нерваў было патрачана таксама на пасяджэннях «чарнобыльскай» камісіі саюзнага з'езда народных дэпутатаў, аднак надзеі на тое, што Масква прыме эфектыўную праграму барацьбы з наступствамі катастрофы, сталіся марнымі — у адказ найчасцей гучала цынічнае: «Няма грошай!». Заставалася спадзявацца толькі на ўласныя сілы, на

дзейсныя захады новага беларускага парламента. Увайшоўшы ў ягоны склад, Шушкевіч не забудзецца на дадзеныя выбаршчыкам абяцанні, хоць праз некалькі гадоў, калі рэспубліку ахопіць жорсткі энергетычны крызіс, Старшыні Вярхоўнага Савета давядзецца загаварыць на надзвычай няўдзячную ва ўмовах чарнобыльскага сіндрому тэму — пра магчымае будаўніцтва на Беларусі атамнай станцыі (вядома ж, з непараўнальна больш надзейнымі, чым у Чарнобылі, рэактарамі новага пакалення). І зноў у ягоны бок паляцяць камяні абвінавачванняў у «здрадзе», у тым, што ён, маўляў, у свой час толькі нажываў на чарнобыльскай праблеме перадвыбарны капітал. І зноў давядзецца адчуць, наколькі цяжэй быць кіраўніком, чым знаходзіцца ў апазіцыі...

Тады, у 1990-ым, яму, напрыклад, здавалася, што можна адным махам скасаваць шматлікія прывілеі кіруючай эліты. Натуральна, што падчас перадвыбарных сустрэч гэтую пазіцыю кандыдата горача падтрымлівала тая абсалютная большасць аудыторыі, якая ніколі ў жыцці не каштавала далікатэсаў з апаратных спецразмеркавальнікаў. Праз пару гадоў Шушкевіч пераканаецца, што быў тады ў пэўным сэнсе ідэалістам, мяркуючы, што з заганнай, амаральнай з'явай удалося б справіцца нейкім адным суровым дэкрэтам... Сістэма прывілей паўстане ў выглядзе міфічнай гідры, у якой замест кожнай адсечанай галавы вырастаюць дзве. Уладу маючыя прадэманструюць фантастычны спрыт у церабленні новых і новых хітрых шляхоў да смачнейшага кавалка грамадскага пірага. І, што самае прыкрае, хто-ніхто з колішніх палымяных крытыкаў прывілей, атрымаўшы дзяржаўнае крэсла, імгненна адкіне ранейшы выкрывальніцкі пафас і з вялікім задавальненнем прыладкуецца ля той самай кармушкі.

Увогуле ж для наступу на старыя парадкі знойдзецца не надта шмат сілаў. «Дзякуючы» вытанчанай сістэме адсеву ў беларускі парламент трапіць толькі невялікая група дэмакратаў. Іх ідэі, прапановы сутыкнуцца з зацятым супраціўленнем той большасці, якая не пажадае ніякіх карэнных пераменаў,— бо гэтым людзям зусім нядрэнна жылося і ў ранейшыя часы. Разам з тым у дэмакратычнай апазіцыі будуць здаваць нервы, яна пачне раз-пораз збівацца на залішнія эмоцыі, пракламаваць занадта жорсткія, катэгарычныя лозунгі. Шушкевіч, заняўшы ў парламенце кіруючую пасаду, апынецца ў надзвычай няўдзячнай сітуацыі...

Але вясною 1990-га, ён па ўласнай волі выбіраў

далейшы лёс. Зноў жа асабіва ўдала складваліся стыхійныя, імправізаваныя сустрэчы з выбаршчыкамі, што адбываліся ў тыя дні ледзь ці не на кожным кроку. Калі ты стаіш не на трыбуне, а проста на тратуары, калі кожны суразмоўца бачыць выраз тваіх вачэй,— фальш у іх прачытаюць імгненна. Але і шчырасць — таксама.

Людзі паверацць Шушкевічу. Яны прагаласуюць за яго. На жаль, не ўсе ідэі ягонай кандыдацкай праграмы пачнуць увасабляцца ў жыццё так хутка, як уяўлялася. І не таму, што ён да іх ахаладзее... Неаднойчы згадаецца добра знаёмы тэхнічны тэрмін — «супраціўленне матэрыялаў». Матэрыялы, закладзеныя ў канструкцыю Сістэмы, акажуцца невераго дна ўстойлівымі. А ісці на таран — не заўжды найлепшае выйсце з сітуацыі.

* * *

Пачатак першай сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі новага склікання быў запланаваны на май 1990-га. Вынікі выбараў паказалі: дэмакратаў у ягоным складзе нягуста. Гэтыя людзі адразу адчулі: ім трэба як мага шчыльней групавацца. Усё сведчыла пра тое, што партакратыя наважылася з першых хвілін весці рэй па добра адпрацаванаму за дзесяцігоддзі сцэнарыю: апарат рыхтуе патрэбныя рашэнні, а галасаванне — ужо справа тэхнікі. Праўда, партыя не магла ўжо так бесцырымонна, непрыхавана, як раней, дыктаваць сваю волю ў вырашэнні дзяржаўных спраў. Таму Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Мікалай Дземянцей — былы сакратар камуністычнай партыі рэспублікі, якога цэнтральны яе камітэт незадоўга перад тым «кінуў на новы адказны ўчастак»,— пачаў напярэдадні першай сесіі цішком перапампоўваць у свой апарат выпрабаваныя кадры з ліку партыйных чыноўнікаў. На свет Божы выцягнулі прапахлыя нафталінам «ідэі» з куфэрка дзядулі Сталіна. Пайшла, напрыклад, гаворка пра «савет старэйшын», які, маўляў, будзе мудра расстаўляць усе кропкі над «і», калі дэпутаты пра нешта занадта заспрачаюцца.

Шушкевіч з'едліва пракаменціраваў у інтэрв'ю газеце «Знамя юности»:

— Ну што гэта за старэйшыны такія — сівыя дзяды з барадамі?

А яшчэ сказаў адкрытым тэкстам:

— Уладу фактычна атрымлівае апарат, а не выбраныя дэпутаты... У нас утварылася цэлая плеяда кіраўнікоў,

чый галоўны прынцып кіраўніцтва — гэта абсалютная падначаленасць зверху данізу. Улічваючы, што партыйныя, дзяржаўныя і гаспадарчыя кіраўнікі складаюць большасць у цяперашнім Вярхоўным Савеце Беларусі, ёсць верагоднасць, што гэтыя метады кіраўніцтва могуць узяць верх...

Ён усё ж змякчыў выказванне гэтым асцярожным «ёсць верагоднасць». Пазней і ўвогуле не аднойчы давядзецца падшукваць у адносінах да дэпутацкай большасці гранічна дыпламатычныя фармулёўкі. Стаўшы Старшынёй, ён будзе старацца зрабіць максімум магчымага, маючы справу з тым парламентам, які ёсць.

Тут трэба ўлічыць яшчэ і спецыфіку ягонага амплуа: не даючы вышэйшай службовай асобе дзяржавы вялікіх уладных паўнамоцтваў, закон адначасова адвёў ёй няўдзячную ролю спікера...

На жаль, спадзяванні на тое, што ўдасца перайначыць мысленне людзей, звыклых кіраваць старымі метадамі, акажуцца перабольшанымі. Шушкевіч ускладніць стасункі з апазіцыяй і ў той самы час не стане «сваім» для парламенцкай большасці. Настойліва заклікаючы падчас жорсткіх палітычных баталій да згоды, ён раз-пораз будзе апынацца між двух жоранаў.

* * *

Напярэдадні ж першай сесіі дэмакратычна настроеныя дэпутаты абвясцілі сябе ініцыятыўнай групай і «выбілі» для сваіх пасяджэнняў пакой у будынку Вярхоўнага Савета. Назва групы, у якую увайшоў і Шушкевіч, гучала дастаткова абстрактна, але ўсім было зразумела: гэта менавіта тая купка «бунтаўнікоў», што кідае выклік сцэнарыю партакратаў. Яна пачала распрацоўваць сваю тактыку дзеянняў на сесіі.

* * *

І, трэба сказаць, дэмакраты падрыхтаваліся даволі ўдала. Іх праціўнікі былі злёгку ашаломлены нечакана магутным наступам.

Не адчуваючы гарачых сімпатый да кіраўніка парламента Мікалая Дземянцея, апазіцыйная плынь дэпутатаў разумела, аднак, што «зваліць» яго пакуль ім не пад сілу. Таму скіравала намаганні на тое, каб прадстаўнік дэмакратычных поглядаў заняў крэсла першага намесніка Старшыні. Стаўка была зроблена на Шушкевіча.

Большасць, трохі ашалелая ад атрыманых удараў,

вырашыла пакуль не лезці на ражон і ахвяраваць гэтым крэслам. Тым больш што Шушкевіч на фоне самых імпэтных дэмакратаў выглядаў даволі памяркоўнай фігурай. І нават спрабаваў трохі супыніць тых, хто клеіў камуністам занадта ўжо бязлітасныя ярлыкі...

Для Шушкевіча ж стала поўнай нечаканасцю, што выбар у гэтай сітуацыі выпадзе менавіта на яго. Напачатку запратэставаў, маўляў, лічыць неэтычным згаджацца на ролю «правай рукі» чалавека, з якім даволі рэзка разыходзішся ў поглядах.

Яго пераканалі: так трэба, іншай кандыдатуры, якая б дапамагла бакам разысціся з мірам, не зацягваць пятлю канфрантацыі з першых жа дзён працы новага парламента, проста няма.

Шушкевіч, дарэчы, здолее пабудаваць свае адносіны з Дземянцеем так, што і значна пазней, калі першы стане Старшынёй Вярхоўнага Савета, а другі — радавым дэпутатам, яны пры сустрэчах не будуць адварочвацца адзін ад аднаго. Адкрыта выказваючы сваю нязгоду ў многіх сітуацыях, першы намеснік тым не менш ніколі не пойдзе на крокі, якія ў прастамоўі характарызуюцца выразам «падкласці свінню». Да таго ж, ён зробіць для сябе выснову, што Дземянцей — зусім не такая адыёзная, карыкатурная асоба, якой малявала яго апазіцыйная прэса, асабліва акцэнтуючы ўвагу на хібах у вымаўленні і граматыцы.

Шушкевіч не адчуе у ім той апантанасці, таго цынізму, з якімі змагаліся за свае «карытныя» інтарэсы іншыя прадстаўнікі партакратычнага клану. Мікалай Іванавіч, падобна, шчыра верыў, што засвоеныя ім з маленства лозунгі сапраўды скіраваны на карысць народа і што ён, Дземянцей, выконваючы волю партыі, служыць святой справе.

* * *

Ідэолагам Сістэмы ўдалося, дарэчы, упэўніць мноства простых працаўнікоў, што казарменны «рай», у якім яны існуюць,— найлепшы ў свеце варыянт пабудовы грамадства. Глядзіце: на «гнілым» Захадзе людзі пакутуюць ад беспрацоўя, ад росту цэнаў,— а ў нас жа гэтага няма. Ты заўжды можаш разлічваць на бляшанку таннай кількі і куфаль таннага піва...

Рэзкае пагаршэнне эканамічнага стану краіны прымусіла саюзны ўрад Паўлава з 1 красавіка 1991 года падняць большасць цэнаў адразу прыкладна ўдвая. Гэта выклікала ў тады яшчэ адзіным Саюзе сапраўдны сацыяльны выбух. І — што было вялікай нечаканасцю —

эпіцэнтр яго прыйшоўся менавіта на заўжды ціхую, пакорлівую Беларусь. Дзесяткі тысяч мінскіх пралетарыяў, кінуўшы працу, змрочнымі калонамі, у зашмальцаваных робах і пудовых чараўіках, рушылі, паралізаваўшы рух гарадскога транспарту, да будынка Вярхоўнага Савета. Чуліся абураныя галасы:

— Што ж гэта робіцца — учора абед у заводскай сталоўцы рубель каштаваў, а сёння і ў два не ўкладзешся!

Праз пару гадоў, калі за такі самы абед давядзецца плаціць тысячы, тыя цэны пададуцца проста легендарнымі. І людзі будуць даставаць з кішэняў пачкі купюр ужо без аніякіх эмоцый...

Але тады эмоцыі ў калонах нагадвалі зарад навальнічных хмараў.

Неяк так атрымалася, што на той момант Шушкевіч застаўся на «гаспадарцы» за старэйшага.

Да яго ўбег хтосьці з начальнікаў, адказных за грамадскі парадак:

— Што рабіць? Разганяць?

Натоўп за вокнамі гудзеў, як растрывожаны вулей. Гледзячы на яго, асаблівай утульнасці, мякка кажучы, зведваць не даводзілася...

Ён адарваў позірк ад акна і сказаў:

— Не. Разганяць не будзем. Я пайду туды.

Няма сэнсу пераказваць тыя спантанныя, імпульсіўныя дыялогі, што адбыліся тады на плошчы перад Домам урада. Вядома ж, сітуацыя была зусім адрозная ад той, калі па прадуманай схеме выкладаеш чарговую тэму перад студэнтамі, якія старанна канспектуюць твае думкі. Але, мабыць, галоўнае заключалася не столькі нават у канкрэтных словах, колькі ў самім учынку: дзяржаўны кіраўнік выйшаў насустрач разгневанаму натоўпу — выйшаў не ў ачапленні міліцыянтаў з дубінкамі, а проста так, на свой страх і рызыку... І ўдалося дасягнуць прынцыповай дамовы: кіраўніцтва рэспублікі пачне дыялог з лідэрамі бунтуючага люду — страйкавым камітэтам, а пакуль што трэба захоўваць спакой і не зрывацца на стыхійныя дзеянні.

Перамовы са страйкамам праходзілі цяжка, нервова.

Кіраўніцтва Беларусі аператыўна прыняло рашэнні, якія дазволілі трохі у межах сціплых магчымасцяў і без таго дзіравага бюджэту змякчыць цэнавы ўдар, падтрымаць людзей матэрыяльна.

Між тым прастоі на многіх прадпрыемствах нанеслі новыя разбуральныя ўдары па рэспубліканскай эканоміцы. Страты ад таго, што нейкі час быў практычна

паралізаваны шэраг індустрыяльных гігантаў — напрыклад Мінскі трактарны завод, выліліся ў мільёны і мільёны рублёў. Працяг страйкаў толькі тужэй зацягнуў бы пятлю крызіснай сітуацыі.

Але страйкамаўцы не аслаблялі свой прэсінг, пагражаючы зноў узняць народ на дыбы.

Шушкевіч зрабіў выснову, што сярод прадстаўнікоў таго боку ёсць людзі, для якіх важна перш за ўсё скарыстаць сітуацыю на карысць уласным палітычным амбіцыям. Яны не столькі імкнуцца да сапраўднага дыялогу, да разумнага кампрамісу, колькі спрабуюць душыць відавочна нерэальнымі, ультыматыўнымі патрабаваннямі, іграючы на эмоцыях узбуджанай масы, каб зарабіць арэол тераічных змагароў за яе інтарэсы. Гэтыя жарты з агнём маглі скончыцца сапраўднай трагедыяй.

І тады Шушкевіч фактычна ўзяў на сябе ролю маланкаадвода. У той час, калі іншыя кіраўнікі рэспублікі ў большасці сваёй лічылі за лепшае адседжвацца за тоўстымі сценамі адміністрацыйных будынкаў, за міліцэйскімі кардонамі, ён зноў і зноў ідзе да людзей, звяртаецца да іх разважнага сэнсу праз сродкі масавай інфармацыі, не пазбягаючы, калі трэба, і даволі жорсткіх, калючых фармулёвак. Разам з тым, імкнецца скарыстаць любы шанц для кампрамісу.

У адным з ягоных інтэрв'ю тых дзён прарвецца сапраўды спавядальная фраза:

— У мяне такое адчуванне цяпер, быццам я нясу цяжкі выбухованебяспечны груз па няроўнай дарозе. Мне нельга спатыкнуцца.

Далёка не ўсе яго тады зразумелі. У тыя дні Шушкевічу давялося пачуць з натоўпу і гнеўныя воклічы накшталт «перараджэнец!», «прадаўся апарату!». А аднойчы яго проста «падставілі», наўмысна скажона перадаўшы ўзбуджаным людзям на плошчы сэнс сказанага ім падчас чарговага дыялогу са страйкамаўцамі...

Але ён да канца выканаў добраахвотна ўзятую на сябе няўдзячную ролю. Вялікага паўторнага ўсплеску страйкаў удалося не дапусціць. Вядома, гэта была не выключна ягоная заслуга, і усё ж...

Тыя падзеі часова знізяць палітычны рэйтынг Шушкевіча. Але праз нейкі час шмат хто пераасэнсуе, пачне па-новаму ўспрымаць тыя аргументы, што настойліва паўтараў ён у красавіку—маі 1991-га. Многім стане зразумела, што вырашаць сацыяльныя, палітычныя праблемы барыкадным шляхам — сапраўды не лепшы

варыянт. Гэта паспрабавалі ўжо аднойчы зрабіць бальшавікі. Ды і ў нашыя дні барыкаднае мысленне спарадзіла крывавыя трагедыі не ў адной былой рэспубліцы СССР.

* * *

Утрымліваючы людзей ад стыхійнага бунту, ён разам з тым выразна разумеў справядлівасць іх патрабаванняў наконт неабходнасці радыкальных эканамічных і палітычных рэформаў. Народ, у прыватнасці, рашуча запатрабаваў ліквідацыі партыйных органаў на прадпрыемствах, у войску, міліцыі, КДБ. У Шушкевіча ў тыя месяцы хутка раставалі апошнія надзеі на тое, што кампартыя адчуе ўсё ж выклік часу, добраахвотна падзеліцца хоць часткай узурпаванай некалі ўлады. Прыкрасць і расчараванне прынёс удзел у рабоце XXXI з'езда КПБ у снежні 1990-га. Дэлегатам абралі Шушкевіча рабочыя — у піку парткамаўскім кандыдатам. Ён пайшоў на з'езд з наіўнай надзеяй дастукацца да свядомасці тых, хто мёртвай хваткай учапіўся за ржавыя, дыскрэдытаваныя догмы. Купку прагрэсіўна настроеных дэлегатаў там проста задзяўблі...

Згасалі і ілюзіі наконт таго, што можна неяк зварыць кашу з Цэнтрам, з Гарбачовым, які таксама ўпарта чапляўся за старое, не жадаючы пасля атрымання прэзідэнцкага крэсла пакінуць пасаду генеральнага сакратара ЦК КПСС, даць больш волі рэспублікам.

Сваёй упартасцю Сістэма сама капала сабе яму.

І усяго праз некалькі месяцаў на адной шостай частцы зямной сушы, якая амаль што сем дзесяцігоддзяў пазначалася на картах свету ружовай фарбай і размашыстай абрэвіятурай «СССР», адбудуцца такія падзеі, што ўразяць свет не менш, чым фантастычная перамога бальшавікоў у 1917-ым.

## БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА

...Хвіліна чакання — і вось на тым канцы тэлефоннага дроту, за тысячу кіламетраў ад Белавежы, слухаўку зняў Гарбачоў.

Калі вырашалі, хто з траіх патэлефануе ў Маскву, Ельцын і Краўчук ледзь ці не ў адзін голас сказалі яму, Шушкевічу: давай, маўляў, табе прасцей — ты ж заўсёды размаўляў з Гарбачовым так шчыра. Прагучала гэта нават з нейкімі жартаўлівымі ноткамі, бы гаворка ішла аб запрашэнні на сумеснае паляванне. Цікава, яны сапраўды адчуваюць сябе гэтак спакойна ці то зайздроснае ўменне валодаць сабою?

Урэшце, як ні дзіўна, сам ён зусім не хваляваўся. Роўным, будзённым тонам давёў Гарбачову сэнс сумеснага рашэння. На афіцыйнай мове толькі што падпісанага кіраўнікамі трох рэспублік «Пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў» гэта гучала так: «...канстатуем, што Саюз ССР як суб'ект міжнароднага права і геапалітычная рэальнасць спыняе сваё існаванне». І напрыканцы: «Аформлена ў горадзе Мінску 8 снежня 1991 года ў трох экземплярах кожны на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах, прычым тры тэксты маюць аднолькавую сілу».

Мінск згадалі ў тэксце ці то па інерцыі, ці то для большай важкасці — хто там надта ведае пра тыя Віскулі, беларускую ўрадавую рэзідэнцыю, схаваную ў нетрах Белавежы? Ды і ва ўсіх газетных публікацыях напярэдадні сустрэчы яна фігуравала менавіта як «мінская». Зрэшты, якраз жаданне вызваліцца з-пад жорсткага журналісцкага прэсінгу стала далёка не апошнім матывам, каб аблюбаваць гэты ўтульны двухпавярховы дамок сярод хвойнага гушчару за тры з гакам сотні кіламетраў ад беларускай сталіцы.

Праўда, Ельцын, прыляцеўшы ў Мінск раней за Краўчука, мусіў-такі правесці досыць часу перад мікрафонамі. Але ягоная публічная заява наконт таго,

што дні «трохбаковых кансультацый» могуць стаць гістарычнымі, наўрад ці выклікала фурор: больш дэвальвазанага эпітэта, чым «гістарычны», у лексіконе айчынных кіраўнікоў, бадай, і не знойдзеш... Ды і сам тэрмін «трохбаковыя кансультацыі» бы акрэсліваў нейкія нябачныя межы, далей якіх вынікі сустрэчы сягнуць не маглі. Беларуская «Народная газета» прагназавала іх так: «Сустрэча ў Мінску з'явіцца генеральнай рэпетыцыяй новай сустрэчы ў вярхах — 4 + 1, якая ўжо ў панядзелак адкрыецца ў Маскве. Тады да кіраўнікоў славянскіх дзяржаў далучацца прэзідэнт Казахстана Н.Назарбаеў і саюзны прэзідэнт М.Гарбачоў. Без папярэдняй сустрэчы і прапрацоўкі пазіцый у Мінску было б цяжка скласці прадуктыўны дыялог Украіны з Цэнтрам у Маскве».

Панядзелак — гэта заўтра, 9 снежня. Журналісты яшчэ не ведаюць, што ніякай сустрэчы «4 + 1» не будзе.

Усё вырашана, масты спалены. І ў гэтую хвіліну прэзідэнт Савецкага Саюза выслухоўвае па тэлефоне рэзюме «трохбаковых кансультацый»: «...Саюз ССР як суб'ект міжнароднага права і геапалітычная рэальнасць спыняе сваё існаванне... Афармлена ў горадзе Мінску... тры тэксты маюць аднолькавую сілу».

Маюць сілу? Няўжо і сапраўды вось гэтыя росчыркі пяра здольныя падвесці рысу пад амаль што сямідзесяцігадовай гісторыяй каласальнай звышдзяржавы, моц якой прымушала скаланацца ўвесь астатні свет?

* * *

## Адступленне. Аўтарскі «допыт» (люты 1993 года)

*— Ці было ў вас тады адчуванне, што Цэнтру кінуты надзвычай рызыкоўны выклік, наступствы якога могуць быць непрадказальнымі, можа, нават трагічнымі для Вашага лёсу? Усё ж Гарбачоў быў і Вярхоўным Галоўнакамандуючым, увогуле ўсе так званыя сілавыя структуры падпарадкоўваліся менавіта яму. Дастаткова было загадаць, і...*

— Ведаеце, калі шчыра, то я не лічыў Гарбачова настолькі моцнай — у сэнсе рашучасці — асобай, каб ён быў здольны на такія дзеянні, такія контркрокі. Яму заўсёды шанцавала, і даволі-такі лагоднымі захадамі ён шмат чаго дамагаўся. А тут трэба было праявіць сталінскі характар... Гэта не ў яго натуры, ён усё ж палітык іншага складу, і, нягледзячы ні на што, па-чалавечы я паважаю яго і сёння.

Мяркую, што намераў ужыць грубую сілу ў Гарбачова тады не было — ва ўсякім разе, падчас той тэлефоннай гаворкі я нават намёкаў такіх не адчуў. Хоць, скажу шчыра, пэўныя прэвентыўныя крокі там, у Белавежы, мы зрабілі.

Не, я маю на ўвазе не тую лухту, якую потым пачалі несці асобныя журналісты: быццам там, у пушчы, вакол рэзідэнцыі, ледзь ці не дывізія акапалася... Была звычайная ахова, як і належыць пры сустрэчах такога рангу.

Я ж хачу сказаць пра іншае. Пра інфармаванне сусветнай супольнасці аб нашых рашэннях. І перш за ўсё — званок Бушу. То была, скажу шчыра, ініцыятыва Ельцына. Сам я пра гэта, мусіць, і не падумаў бы... Толькі потым разважыў, што такі крок зусім не пашкодзіў — ці мала што... Тут трэба аддаць належнае палітычнаму вопыту Барыса Мікалаевіча. Хутчэй за ўсё, гэта была ягоная, як кажуць, хатняя загатоўка...

Карацей, мы дамовіліся: Ельцын тэлефануе Бушу, я — Гарбачову. Дарэчы, тэхнічнаму ўзбраенню расійскай дэлегацыі ў Віскулях можна было пазайздросціць. Мы, напрыклад, друкавалі тэксты дакументаў на звычайнай машынцы, а ў іх — суцэльная электроніка... І калі дайшла справа да тэлефонных перамоў, то Ельцына з Амерыкай звязалі імгненна. Я толькі яшчэ з думкамі збіраўся — як размову з Гарбачовым распачаць,— а ўжо чую: Барыс Мікалаевіч дыялог вядзе і Козыраў яму з англійскай перакладае. Прынамсі, гэта мне задачу аблегчыла. Калі Гарбачоў, выслухаўшы, запытаўся — дарэчы, то быў першы выпадак, калі ён звяртаўся да мяне па тэлефоне на «вы», раней увесь час гучала «ты» — дык вось, калі Гарбачоў запытаўся, а ці ўпэўнены мы, што замежжа нас зразумее,— я адказаў: так, з Бушам, напрыклад, перагутарылі ўжо... Міхаіл Сяргеевіч потым не раз публічна выказваў крыўду: маўляў, амерыканскаму прэзідэнту патэлефанавалі раней, чым мне. А тады... Тады я адчуў, што на тым канцы тэлефоннай лініі — нешта накшталт гогалеўскай нямой сцэны.

— *Хто-ніхто сцвярджае, што Гарбачоў выказаў тады жаданне неадкладна вылецець у Беларусь і сустрэцца з «белавежскай тройкай», каб неяк уладкаваць справу... З-за гэтага, маўляў, нават ад'езд Ельцына і Краўчука на пэўны час адклалі.*

— Не, гэтая версія недакладная. Гарбачова мы там не чакалі. Чакалі Назарбаева. Хацелі, каб пад белавежскім пагадненнем быў і ягоны подпіс. Як вы ведаеце, казахстанскі прэзідэнт якраз у той дзень вылецеў у

Маскву: назаўтра планавалася наша сумесная сустрэча з Гарбачовым. У нас была сувязь з самалётам Назарбаева. Сам я з ім перамовы не вёў, але ведаю, што той быў праінфармаваны аб белавежскай сустрэчы і абяцаў далучыцца да яе.

Нашы службы ўжо і паветраны калідор забяспечылі, каб ягоны лайнер мог беспарашкодна прызямліцца на адным з вайсковых аэрадромаў непадалёк ад Белавежы. Знайшлі казахстанскі сцяг, каб сустрэць па пратаколу. Тым часам паступалі новыя паведамленні: Назарбаеў прызямліўся ў Маскве... праз паўгадзіны вылятае... вылет трохі адсоўваецца, надта доўга запраўляюць самалёт... І нарэшце: не чакайце... Магу толькі версіі будаваць, чаму ён так і не наважыўся. Хутчэй за ўсё, адыграла сваю ролю заўсёдная, скажам так, асцярожнасць казахстанскага прэзідэнта, які лічыць за лепшае рабіць свой выбар тады, калі зыход той ці іншай палітычнай калізіі ўжо прадвызначаны...

Тое ж, што пагадненне падпісалі напачатку толькі Расія, Украіна і Беларусь, адразу дало журналістам падставу ахрысціць СНД «саюзам славянскіх дзяржаў». Вярнуўшыся ў Мінск, я на першай жа прэс-канферэнцыі рашуча запярэчыў супраць такога азначэння. Мы зусім не збіраліся проціпастаўляць сябе неславянскім рэспублікам былога Саюза. Дарэчы, пазней, у Алма-Аце, з боку іх лідэраў адчувалася напачатку пэўная крыўда і спатрэбіліся намаганні, каб яе пераадолець, перш чым пад пагадненнем з'явіліся новыя подпісы.

— *Давайце вернемся ў Віскулі. Белавежскія дакументы датаваны 8 снежня, але ж вы сабраліся там яшчэ вечарам 7-га. Вы адразу ж, без доўгіх ваганняў, дамовіліся «разваліць», як кажуць Вашыя палітычныя апаненты, Саюз?*

— Не! Мы адразу ж дамовіліся **стварыць новую Садружнасць**. І гэта катэгарычна важная розніца! Саюз ужо быў разбураны. Па сутнасці, ягоныя перспектывы перакрэслілі якраз тыя, хто ўпарта імкнуўся захаваць любой цаной моцную імперскую структуру.

* * *

Так, адразу ж пасля паражэння путчу ў жніўні 1991-га і наступнай забароны КПСС гіганцкая дзяржава, груба і адвольна скроеная ў свой час па лякалах бальшавіцкай «нацыянальнай палітыкі», пагрозліва затрашчала ледзь ці не па ўсіх сваіх швах, што раней былі жорстка змацаваны магутнасцю таталітарнай партыйна-дзяржаўнай улады Цэнтра.

«Працэс пайшоў».

Цяпер гэтае ўлюбёнае закліванне Гарбачова, якім ён доўга імкнуўся пераканаць усіх, што перабудова рухаецца акурат па ягонай задуме, у жаданым рэчышчы адзінага «сацыялістычнага выбару» ўсіх народаў СССР,— цяпер гэтае заклінанне цытавалі з непрыхаваным сарказмам. Газетныя каментатары іранічна канстатавалі: хутка, відаць, рэальныя ўладанні прэзідэнта краіны абмяжуюцца тэрыторыяй Крамля.

І сапраўды, лаяльных да Цэнтра «суб'ектаў федэрацыі» ўсё меншала і меншала...

Прыбалтыка яшчэ да путчу стала лічыцца адрэзанай лустай. На ўпартых літоўцаў, латышоў і эстонцаў, падобна было, махнулі ўжо рукой нават самыя зацятыя адэпты імперскай дактрыны. Студзеньская ж 1991 года спроба запалохаць Вільнюс танкамі і дэсантнікамі не прынесла Маскве нічога, акрамя ганьбы і сусветнага скандалу, а кроў невінаватых ахвяр толькі пашырыла адчужэнне і яшчэ адной плямай лягла на рэпутацыю Гарбачова.

Кроў мірных жыхароў, што сканалі пад ударамі сапёрных лапатак дэсантнікаў, добра запомнілі і ў Тбілісі... А па суседству кроў цякла ўжо рэкамі: армяне і азербайджанцы бязлітасна знішчалі адзін аднаго ў вайне за Нагорны Карабах, і абедзве былыя «рэспублікісястры» слалі чорныя праклёны бездапаможнаму, разгубленаму, не здолеўшаму папярэдзіць бойню Цэнтру.

Захвалявалася Малдова... Ну, а Украіна пасля жніўня 1991-га і зусім стала на дыбкі. Там аб'явілі рэферэндум аб незалежнасці і пра рашучы разрыў з Саюзам гаварылі ўжо адкрытым тэкстам.

Гарбачоў вярнуўся пасля фароскага зняволення ў сапраўды іншую краіну. Урэшце, у прэзідэнта СССР заставаліся надзейныя, на яго думку, плацдармы. Адным з іх уяўлялася Беларусь.

На фоне амаль што татальнага бунту «ўскраін» (ды ці толькі «ўскраін» — Расія, выбраўшы сваім прэзідэнтам Ельцына, таксама паказала нораў!) Беларусь здавалася асабліва рахманай. І дзівам тое зусім не выглядала. Рэспубліканскія начальнікі даўно ўжо заслужылі ў Крамлі рэпутацыю самых надзейных, адданых хлопцаў, якія ў блін разаб'юцца, але найузорнейшым чынам выканаюць любую дырэктыву «адтуль». Урэшце, лічыла Масква, і ўвесь народ там такі: хоць вяроўкі з яго ві — не пікне...

Вядома ж, хвалі жнівеньскіх падзей дакаціліся і да гэтай ціхай затокі. Шакіраваная правалам маскоўскага путчу, камуністычна-наменклатурная большасць

Вярхоўнага Савета Беларусі пад магутным націскам малалікай, але бліскуча скарыстаўшай момант апазіцыі мусіла, як у благім сне, міжволі падняць рукі, галасуючы за наданне Дэкларацыі аб суверэнітэце рэспублікі статуса канстытуцыйнага закона, а таксама за часовае прыпыненне дзейнасці КПБ—КПСС. Закіданы камянямі жорсткіх абвінавачванняў з боку той самай апазіцыі, капітуляваў парламенцкі спікер — былы сакратар ЦК кампартыі Мікалай Дземянцей.

У выніку нервовай, з мноствам закулісных перыпетый, барацьбы дэпутацкіх плыняў Вярхоўны Савет Беларусі ўзначаліў намеснік Старшыні — Станіслаў Шушкевіч.

Урэшце, гэта наўрад ці выклікала ў Крамлі асаблівую трывогу, хоць пазіцыя Шушкевіча на мінулых з'ездах народных дэпутатаў СССР давала ўсе падставы лічыць яго, карыстаючыся тэрміналогіяй Гарбачова, адным з «так званых дэмакратаў».

За «перабудовачныя» гады Цэнтр упэўніўся: жорны беларускай наменклатурнай улады па-ранейшаму спраўна трушчаць кволыя зярняткі дэмакратыі. І ўся гэтая «суверэнізацыя» Беларусі падавалася не болей чым бутафорыяй.

* * *

«Ён так нічога і не зразумеў!»

З кожным чарговым пасяджэннем Дзяржсавета ў Крамлі Шушкевіч усё ўмацоўваўся ў гэтай выснове: Гарбачоў сапраўды не ўсведамляе, што краіна пасля путчу стала зусім іншай. Кіраўнікоў рэспублік ён збіраў толькі для таго, каб чарговы раз навязаць сваю ідэю фікс: маўляў, мы, таварышы, павінны ўдыхнуць другое жыццё ў нова-агароўскі працэс, перапынены жнівеньскімі падзеямі, і дамагчыся заключэння новага Саюзнага дагавора. Усе ж пярэчанні наконт таго, што праект дагавора, нягледзячы на касметычныя карэктывы, па-ранейшаму захоўвае імперскую мадэль супердзяржавы, Гарбачоў адмятаў, што называецца, з парога.

Вяртаючыся ў Мінск, Шушкевіч мусіў раз за разам выносіць на суд беларускіх парламентарыяў прапанаваныя прэзідэнтам СССР варыянты фармулёвак Саюзнага дагавора, нязменна шытыя, аднак, аднымі і тымі ж белымі ніткамі. Безумоўна, апазіцыя адразу разбівала гэтыя фармулёўкі ў пух. Рыкашэтам трапляла і самому Шушкевічу. І паспрабуй тут дакажы, што напярэдадні ў Маскве ці Нова-Агарове даводзіў Гарбачову тое ж самае, ды толькі ўсё — як гарохам аб сценку! Урэшце,

нават незаслужаныя папрокі варта было стрываць, каб наступным разам сказаць на Дзяржсавеце: вось бачыце, Міхаіл Сяргеевіч, не толькі мне, а і шмат каму ў Вярхоўным Савеце Беларусі вашыя прапановы не надта даспадобы...

То былі вельмі нялёгкія дні. Апазіцыя беларускага парламента, апанаваная падазрэннямі, выступіла 23 лістапада з жорсткай заявай у друку: «Выклікае здзіўленне, што Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі сп. С. Шушкевіч... не маючы на тое адпаведных паўнамоцтваў ад парламента рэспублікі, спяшаецца абмяркоўваць і, напэўна, нават парафіраваць праект Саюзнага дагавора... Апазіцыя БНФ у Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь папярэджвае Старшыню Вярхоўнага Савета сп. Шушкевіча, што падпісанне любога дагавора, які ліквідуе ці абмяжуе поўны суверэнітэт рэспублікі... можа быць расцэнена выключна як антыканстытуцыйны акт і дзяржаўная здрада Рэспубліцы Беларусь з усімі адпаведнымі наступствамі».

Пра такія сітуацыі звычайна кажуць: між двух жоранаў. Бо Гарбачоў са свайго боку з упартасцю, вартай лепшага прымянення, дамагаўся, каб «працэс пайшоў» у патрэбным яму кірунку.

Але чым далей, тым выразней станавілася бачна, што ідзе гэты працэс хіба што ў поўны тупік. Прэзідэнт СССР быў здольныператасоўваць толькі адну і тую ж зашмальцаваную калоду сваіх старых ідэй.

Тым часам Шушкевіч пакрысе асвойваўся ў кампаніі кіраўнікоў рэспублік, да якой далучыўся пазней за астатніх. Усё часцей — асабліва калі збор быў не ў Крамлі, а ў Нова-Агарове, дзе абстаноўка выглядала больш нязмушанай — завязваліся размовы тэт-а-тэт. Адчуў, што гарбачоўская «непрабівальнасць» паступова ўзмацняе «крамолу», падштурхоўвае найбольш рашучых рэспубліканскіх лідэраў да пошукаў нейкага альтэрнатыўнага выйсця. У ягоныя рукі «выпадкова» трапіў цікавы дакумент: яшчэ ў лютым быў патаемна накіданы праект утварэння «канфедэрацыі чатырох» — Расіі, Украіны, Беларусі і Казахстана — з перспектывай далучэння іншых рэспублік «старога» Саюза. Аўтарства праекта, безумоўна, не афішавалася, ды і сам тэкст меў хаджэнне толькі ў надзейным вузкім коле. Што менавіта перашкодзіла рэалізаваць задуму тады, у лютым, ён, Шушкевіч, мог толькі здагадвацца...

А цяпер на двары стаяў лістапад, і падчас адной крамлёўскай размовы з Ельцыным ўзнікла думка: а што, калі неўзабаве ўзяць ды сустрэцца на Беларусі,

каб вальней ды грунтоўней абмеркаваць разам сітуацыю? Трохі пазней, у Нова-Агарове, дамовіліся ўжо больш канкрэтна.

Дарэчы, ўбачыць Ельцына ў Мінску хацела і кіраўніцтва беларускага ўрада. «Суверэнізацыя» дзвюх рэспублік пачала жахліва блытаць, а то і рваць ніці традыцыйных гаспадарчых узаемадачыненняў між Беларуссю і Расіяй. Выйсце бачылася, у прыватнасці, у заключэнні двухбаковага пагаднення аб прынцыпах гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Украінская ж тэма ў тыя дні не сыходзіла з першых старонак газет. Рэспубліка, што дагэтуль славілася кансерватыўным, замшэлым камуністычным кіраўніцтвам, раптоўна «пайшла ўразнос», ахопленая парывам да поўнай незалежнасці... Былы сакратар ЦК кампартыі Украіны Краўчук, цалкам аддаўшыся змаганню за пасаду прэзідэнта, проста ігнараваў усе гарбачоўскія захады ды і самі пасяджэнні Дзяржсавета. А грунтоўна пагутарыць з ім хацелася... Дык калі таму так не даспадобы Масква, можа, якраз і сустрэцца ўтрох у Мінску?

Згода была атрымана хутка. Пасля гэтага Шушкевіч, размаўляючы па тэлефоне з Ельцыным, паўжартам запытаўся: можа, тады і Міхаіла Сяргеевіча запрасіць на Беларусь, каб сапраўды «саміт» атрымаўся? «Ну, не, з ім я ўжо досыць нагутарыўся!» — пачулася ў адказ.

Пра тое, што ў Мінск прылятае і Краўчук, журналісты даведаліся літаральна за пару дзён да падзеі. Увогуле Шушкевіч стараўся як мага меней афішаваць падрыхтоўку да сустрэчы. Але апазіцыя ўсё адно ўсчала шум: ну, вось, «вялікія браты» злятаюцца на «міжсабойчык», а беларускі бок, ведама ж, будзе толькі зазіраць ім ў рот.

* * *

Ельцынскі Ту прызямліўся ў аэрапорце «Мінск-2» у 9 гадзін 25 хвілін 7 снежня. Хлеб-соль, іншыя пратакольныя атрыбуты — і вось картэж лімузінаў імчыць у горад.

Імчыць — гэта, дарэчы, не дзеля прыгожага слоўца сказана. Барыс Мікалаевіч бы ілюструе сваёй асобай крылатую гогалеўскую фразу — «и какой же русский не любит быстрой езды!» Што ж, калі госцю так падабаецца...

А ўвогуле Шушкевіч, аўтааматар са стажам, аддае на дарозе перавагу іншаму прынцыпу: цішэй едзеш — далей будзеш...

І гаворка іх з самага пачатку бы адлюстравала гэтую розніцу натур. Ельцын адразу ж даў зразумець, што ён і ягоная «каманда» — у самым баявым настроі. Трэба секчы гордзіеў вузел, безнадзейна заблытаны Гарбачовым, неабходна моцная альтэрнатыва няўклюдна прыхарошваемай імперскай канцэпцыі Саюзнага дагавора. Добра, заўважаў ягоны субяседнік, але ці можна спадзявацца, што Краўчук увогуле пойдзе на нейкую форму аб'яднання нашых рэспублік? А калі ён катэгарычна запярэчыць?

Гэта нагадвала дзелавую гульню на тэму «Як зацікавіць украінскага прэзідэнта?» Ягоны самалёт прыбывае у аэрапорт праз некалькі гадзін. (Дарэчы, у першыя ж хвіліны пасля прызямлення Краўчук яскрава прадэманструе сваю пазіцыю перад прэсай, адказваючы на пытанне, ці не ўгавораць-такі Украіну ўступіць у Саюз: «Ніхто нікога не можа ўгаварыць... Калі можна ўгаварыць Краўчука, то нельга ўгаварыць украінскі народ».)

А тым часам Авальную залу Вярхоўнага Савета Беларусі запаўнялі дэпутаты, урадавыя асобы, журналісты. Сцішана каменціравалі змену ў інтэр'еры: там, дзе раней быў бюст Леніна, цяпер застаўся толькі п'едэстал. Веянне часу — ці проста каб не раздражняць Барыса Мікалаевіча?

Сустрэча з расійскім прэзідэнтам пачалася ў адзінаццаць гадзін.

Напачатку выступлення той нагадаў аб агульных каранях Расіі і Беларусі, блізкасці моў і нават назваў рэспублік, неабходнасці ўмацоўваць і развіваць узаемавыгадныя стасункі ў сённяшніх няпростых умовах.

Усё гэта былі правільныя, але ж агульныя словы. Зала чакала...

Голас Ельцына зазвінеў металічнымі ноткамі.

— Адышла ў нябыт спроба аднаўлення Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у ленінскай інтэрпрэтацыі!..

Хто-ніхто міжволі скіраваў позірк на пусты п'едэстал.

...Рэспублікі адмовіліся добраахвотна дэлегаваць Цэнтру такі аб'ём паўнамоцтваў, які ён ад іх запатрабуе. Сёння церпяць няўдачу і «паўфедэрацыя», і «паўканфедэрацыя»... Такія гульні нельга весці бясконца. Усіх палохае наяўнасць Цэнтра і яго магчымае адраджэнне. Удзельнікаў перамоў становіцца ўсё менш. Калі так будзе працягвацца, за стол перамоў не будзе каму сесці, нават нягледзячы на тое, што ў дзяржаў ёсць узаемная зацікаўленасць і ўзаемнае прыцягненне... А гэта дастатковая падстава для садруж-

насці нашых дзяржаў, тым больш, што ў нас ёсць воля стварыць менавіта такі тып адносін... Галоўнае — не патрабаваць адзін ад аднаго немагчымага ў дадзены момант.

Апошнія словы «падрэсорылі» ўсю тыраду. Ельцын бы спахапіўся, што занадта адкрыта выкладае намеры. А так — можна лічыць, што ён у звычайнай сваёй манеры правёў яшчэ адну псіхалагічную атаку на пазіцыю Гарбачова: рабі, маўляў, высновы, пакуль не позна.

Крыху пазней, адказваючы на пытанні, Ельцын стараўся абыходзіцца і ўвогуле дыпламатычнымі фармулёўкамі. Калі пацікавіліся магчымымі рашэннямі лідэраў трох рэспублік, адказаў даволі няпэўна: «У нас будзе не менш чатырох-пяці варыянтаў».

Рэшту часу да прылёту Краўчука занялі афіцыйныя мерапрыемствы, дзеля якіх, згодна з версіяй для прэсы, і прыбыў сюды маскоўскі госць. Ельцын і Шушкевіч абмяняліся ратыфікацыйнымі граматамі ў сувязі з дагаворам паміж Расіяй і Беларуссю, падпісалі пагадненне аб прынцыпах гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў. Расійская дэлегацыя ўсклала вянок да абеліска Перамогі на аднайменнай мінскай плошчы. За цырымоніяй з цікаўнасцю назірала даволі шматлюднае кола сталічных жыхароў: не кожны дзень выпадае пабачыць «жывога Ельцына». Вакол яго тады яшчэ ярка ззяў арэол жнівеньскай славы, калі, стоячы на танкавай вежы, расійскі лідэр патэтычна клікаў масквічоў на змаганне з путчыстамі. Тыя кадры ўбачыла на тэлеэкранах уся краіна. Пройдзе яшчэ нямала часу, перш чым жнівеньскія падзеі згубяць першапачатковую чорна-белую трактоўку і шмат кім пачнуць пераасэнсоўвацца, а сам Барыс Мікалаевіч атрымае не адзін балючы ўдар па рэпутацыі героя-дэмакрата...

А тады, 7 снежня, у Ельцына выдаўся пасля афіцыйных мерапрыемстваў невялікі «тайм-аўт», і ён накіраваўся ва ўрадавую рэзідэнцыю ў Заслаўе, што паблізу ад Мінска.

Шушкевіч жа тым часам спяшаўся зноў у аэрапорт «Мінск-2», дзе вось-вось павінен быў прызямліцца самалёт украінскага прэзідэнта.

Краўчук, выслухаўшы прапановы, адразу ж прадэманстраваў дзелавы настрой: нашто гуму цягнуць, Станіслаў Станіслававіч, — вось наш самалёт «на ўсіх парах», месцаў хопіць, сядайце разам са сваімі памочнікамі ды і махнем адразу на Брэстчыну, а Барыс Мікалаевіч дагоніць...

Побач стаяў і беларускі Як-40, але сапраўды: нашто марнаваць час ды адмаўляцца ад магчымасці лішніх паўгадзіны пагутарыць з Краўчуком на борце ягонага лайнера па дарозе ў Віскулі?

Атакавалі журналісты, давялося ахвяраваць колькі хвілін. Краўчук нагадаў пра вынікі нядаўняга рэферэндуму на Украіне: 31 мільён чалавек, 90,3 працэнта выбаршчыкаў выказаліся за самастойнасць і незалежнасць украінскай дзяржавы. Трохі «прайшоўся» наконт Міхаіла Сяргеевіча, намякнуўшы, што няварта таму валіць з хворай галавы на здаровую, вінавацячы Украіну за свае ўласныя палітычныя правалы. І рэзюмаваў: «...Усе ў душы разумеюць, што гэты Саюз ужо асуджаны».

Не пазбег журналісцкай цікаўнасці і гаспадар сустрэчы. Адказваючы на пытанне аб яе магчымых выніках, зазначыў:

— Гэтыя дні павінны пакласці канец тым маніпуляцыям, што робяцца... Я спадзяюся, што першае слова наконт гэтага будзе сказана на Беларусі.

* * *

### Адступленне. Аўтарскі «допыт» (люты 1993 года)

*— Ці прадбачылі Вы напярэдадні, што сустрэча ў Віскулях можа завяршыцца менавіта такімі радыкальнымі рашэннямі: вынесці бязлітасны «прысуд» старому Саюзу і ўтварыць Садружнасць трох дзяржаў, пакінуўшы Гарбачова «па-за гульнёй»?*

— Калі зусім шчыра, то я на такое не разлічваў, дакладней — не спадзяваўся. Безумоўна, адчуваў, што Ельцын гатовы да самых рашучых крокаў у гэтым кірунку. Але ж вы памятаеце, якое рэха даносілі тады сродкі масавай інфармацыі з Украіны: толькі канчатковае аддзяленне, толькі поўная самастойнасць! І чакаць ад Краўчука той пазіцыі, якую ён у рэшце рэшт заняў у Віскулях, я, прабачце, не мог. Гэта было для мяне нечаканасцю. Гэта змяніла ўвесь падыход да справы.

*— Цяпер хто-ніхто з палітыкаў і газетных каментатараў сцвярджае: Шушкевіч, маўляў, толькі воляй абставін апынуўся ў кампаніі двух зацятых праціўнікаў Гарбачова, якія даўно марылі яму «насаліць», і мусіў падпарадкавацца іх націску...*

— Нагадаю: да таго часу я толькі тры месяцы быў на пасадзе Старшыні Вярхоўнага Савета. Безумоўна, у сэнсе палітычнага вопыту ні з Ельцыным, ні з

Краўчуком цягацца не мог. І адчуваў, што трохі не «дарос», каб такія крокі прапаноўваць. Я абмежаваўся б, напэўна, меншымі вынікамі. Ну, а тыя два прэзідэнты прадэманстравалі гатоўнасць ісці далей. Так што — скажу шчыра — рашучасцю сваёй яны тады мяне пераўзыходзілі. Хоць чыста лагічна перад сустрэчай я выводзіў тую ж выснову: далей цягнуць немагчыма... І ўжо дарогай у Віскулі адчуў: адным камюніке, адной канстатацыяй сваіх поглядаў на сітуацыю мы не абмяжуемся.

— *Вы не баяліся абвінавачванняў у змоўніцтве, у вераломстве, якія ў рэшце рэшт і абрынуліся з вуснаў палымяных змагароў за аднаўленне «адзінага і магутнага» Савецкага Саюза?*

— Не, у мяне было адчуванне, што мы маем маральнае права на такія рашэнні, што мы робім адзіна магчымыя ў такіх варунках захады, каб захаваць цывілізаваныя кантакты паміж нашымі краінамі, перавесці іх гістарычныя сувязі на новую, сапраўды справядлівую падставу. Сёння ад многіх чуеш: СНД сябе не апраўдала! Але хто можа сцвярджаць, што без СНД было б лепей, што мы не дакаціліся б да югаслаўскага варыянту распаду унітарнай дзяржавы?

— *І што, сапраўды, там, у Віскулях, вы фармулявалі дакументы экспромтам, маючы перад сабой толькі чысты стос паперы? Няўжо ў Ельцына, напрыклад, не было нейкіх папярэдне падрыхтаваных «шпаргалак»?*

— Калі што і было, то я, ва ўсякім разе, гэтага не прыкмеціў і дагэтуль веру, што ўсё фармулявалася менавіта там, у Віскулях. Хіба што тэзіс аб дэнансацыі Саюзнага дагавора 1922 года быў падрыхтаваны расійскай дэлегацыяй загадзя. Я гэта адчуў па выказванні расійскага дзяржсакратара Генадзя Бурбуліса адразу ж, калі пачаўся наш дыялог.

— *Дарэчы, ёсць версія, што менавіта Бурбуліс, якога нядобразычліўцы ахрысцілі «шэрым кардыналам» Ельцына, стаў галоўным ідэйным натхніцелем белавежскага пагаднення — маўляў, усё рабілася ледзь ці не пад ягоную дыктоўку.*

— Такія выказванні проста зневажаюць Ельцына як магутную, неардынарную палітычную фігуру. У Віскулях жа з поўным напружаннем працавалі ўсе тры дэлегацыі. Вядома, Бурбуліс — філосаф па адукацыі, чалавек вострага, нестандартнага мыслення — актыўна ўдзельнічаў у вызначэнні, так бы мовіць, сэнсавага калідора нашых рашэнняў, а пасля ўжо ідэі «абрасталі» юрыдычна абгрунтаванымі, адточанымі фармулёўкамі.

Тут, дарэчы, я асабліва адзначыў бы ролю Сяргея Шахрая. Увогуле ў Віскулях сабралася тады даволі шмат тых, каго я ўжо добра ведаў па сумеснай дзейнасці ў складзе дэмакратычнай плыні з'езда народных дэпутатаў СССР — Міжрэгіянальнай групы. У нас быў немалы вопыт сумеснай выпрацоўкі рашэнняў, якія, дарэчы, нярэдка ўяўлялі сабою менавіта альтэрнатыву лініі Гарбачова.

* * *

У поўным складзе дэлегацыі сабраліся ў віскулёўскай рэзідэнцыі вечарам 7 снежня. Апошняй, ужо зацемна, прыехала расійская. За вячэрай гаварылі аб усім, акрамя таго, дзеля чаго сюды з'ехаліся. Хоць, бадай, кожны ўжо выразна адчуваў: пачынаецца падзея, рэха якой прагучыць сапраўдным выбухам не толькі ў Крамлі, але і ва ўсім свеце.

Між тым абслуга ўрадавай рэзідэнцыі звыкла забяспечвала традыцыйную праграму прыёму высокіх гасцей. За мінулыя гады іх тут перабывала досыць. Кіраўнікі БССР любілі здзівіць «важных птушак» з Масквы ці з-за мяжы казачнай патрыярхальнай веліччу гэтага запаведнага кутка Беларусі: векавыя дрэвы, волаты-зубры, неверагодны, першабытны спакой дрэмлючай прыроды... Мусіць, гэткім жа непахісным здаваўся і той лад рэчаў, за які не аднойчы ўздымалі келіхі ў гэтай рэзідэнцыі яе ранейшыя гаспадары і госці. І, вядома ж, нікому з іх нават у благім сне не магло прымроіцца, што некалі менавіта тут збяруцца людзі, якія наважацца паставіць кропку ў гісторыі непераможнай, непахіснай, як падавалася, супердзяржавы.

А знешне ўсё выглядала напачатку зусім як у ранейшыя часы. Адмыслова дастаўлены з Мінска шэф-кухар шчыраваў над апетытнымі стравамі, якія потым увішна падхоплівалі афіцыянткі, і ўжо былі акуратна складзены камплекты паляўнічай амуніцыі: ну хто ж, трапіўшы ў Белавежу, адмовіцца ад спакусы ўласнаручна заваліць лютага клыкастага дзіка? Ды яшчэ надвор'е як па заказу: марозік бадзёрыць кроў, ні адна галінка не калыхнецца ды ззяе цнатлівай беллю снег пад агромністай поўняй...

Егераў, аднак, чакала лёгкае расчараванне. Шушкевіч (а ён, дарэчы, сам тут быў упершыню) увогуле, як высветлілася, не аматар цэліць у нешта жывое з дубальтоўкі («Ведаеце, толькі аднойчы, у 1954 годзе, падстрэліў нейкую качку, дык і дагэтуль не ўцямлю, нашто я гэта зрабіў...»). Катэгарычна адмовіўся ад

палявання і Ельцын. У рэшце рэшт колькі энтузіястаў усё ж назбіралася і традыцыя парушана не была. (Назаўтра, калі на сняданак было пададзена мясное, астатнія паўжартам-паўсур'ёзна цікавіліся: а ці не з вашай, панове, дзічыны?)

Большасці ж тым вечарам было зусім не да палявання. Сумесная мазгавая атака ішла да глыбокай ночы. Пасля таго як лідэры паразумеліся ў галоўным, іх «каманды» адпрацоўвалі чарнавыя варыянты дакументаў.

Раніцай 8 снежня справу ўзяла ў свае рукі шасцёрка кіраўнікоў: ад Расіі — Ельцын і Бурбуліс, ад Украіны — Краўчук і прэм'ер Фокін, ад Беларусі — Шушкевіч і Старшыня Савета Міністраў Кебіч. Выбралі найбольшае ў рэзідэнцыі памяшканне — більярдную залу на першым паверсе. Туды хуценька зацягнулі чатыры сталы, саставілі іх у «карэ», накрылі абрусам. Адсунутыя ўбок більярдныя сталы таксама аказаліся дарэчы: на іх раскладвалі розныя «дапаможныя» паперы, чарнавікі... Па суседству, за дзвярыма, ля якіх застылі двое мажных ахоўнікаў, знаходзіліся астатнія члены дэлегацый. Раз-пораз даводзілася запрашаць у більярдную залу то Гайдара, то Шахрая, то беларускага міністра замежных спраў Краўчанку, то яшчэ кагосьці: трэба яшчэ падумаць вось над гэтым абзацам, абмазгаваць вось гэтую фармулёўку — падключайцеся да справы... Лісты паперы з накідамі тэкстаў качавалі міма ахоўнікаў то туды, то сюды. Афіцыянткі ледзь паспявалі падносіць каву і мінералку. У рэшце рэшт у більярдную залу праплыў паднос з кілішкамі малдаўскага каньяку. Гэта было тады, калі «шасцёрка» адчула: галоўныя, ключавыя думкі, можна лічыць, ужо адчаканены па ўсіх канонах. «Што ж, мы, бадай, і сапраўды заслужылі нешта трохі мацнейшае за каву!» — усміхнуўся хтосьці. Вядома, дозы выглядалі зусім сімвалічнымі: наперадзе чакаў яшчэ кавалак працы. (Потым, дарэчы, «алкагольны» аспект белавежскай сустрэчы стане адной з улюбёных тэм для найбольш зацятых нядобразычліўцаў: маўляў, трэба было няйначай як у сцельку набрацца, каб гэткае сатварыць!)

Тым часам па калідорах рэзідэнцыі, апасліва каса-вурачыся на ахоўнікаў, нецярпліва кружылі некалькі цудам трапіўшых сюды з Мінска журналістаў. Прафесійны нюх падказваў: будзе нешта так-о-о-е!.. Адзін з іх крадком зазірнуў праз нечае плячо ў толькі што аддрукаваную машыністкай паперчыну: «Саюз ССР...

спыняе сваё існаванне». Аж дух заняло: нічога сабе «заявачкі»!

Між тым у фае перад більярднай залай адчулася нейкае ажыўленне. Доўгі стол аздобілі мініяцюрнымі дзяржаўнымі сцяжкамі трох краін. Журналісты імгненна занялі пазіцыі побач і літаральна свідравалі поглядамі дзверы більярднай залы.

Вось яны нарэшце расчыняюцца. Першы выходзіць Ельцын, за ім — астатняя пяцёрка. Садзяцца за стол і ставяць подпісы пад галоўным дакументам сустрэчы. Спахапіўшыся, мінскі газетчык фіксуе для гісторыі час падзеі — 14 гадзін 17 хвілін 8 снежня 1991 года.

Праз колькі часу кіраўнікі трох дзяржаў падымуцца на другі паверх, у апартаменты Ельцына, і Шушкевіч патэлефануе Гарбачову...

* * *

У свой час ён, Шушкевіч, тады яшчэ проста прафесар-фізік, перажыў перыяд сапраўднага, шчырага захаплення новым савецкім лідэрам, фігура якога так кантраставала з аблічам ягоных крамлёўскіх папярэднікаў — знясіленых старэчымі хваробамі людзей, што адзін за адным сыходзілі ў магілу на пачатку 1980-ых: Брэжнеў, Андропаў, Чарненка...

У красавіку 1985-га ў цяжкой, гнятучай, бы наскрозь прасякнутай тым могілкавым пахам атмасферы жыцця велізарнай краіны выразна адчуліся свежыя павевы. Газетчыкі, праўда, хутка зашмальцуюць да брыдоты метафару «красавіцкі вецер перамен», ды і самі перамены набудуць у вачах многіх жахлівы, катастрафічны выгляд, але тады, на самым пачатку, утапічныя лозунгі перабудовы, рэфармавання камуністычнай сістэмы сапраўды заваражылі, ап'янілі — перш за ўсё інтэлігенцыю — салодкай мрояй пра новы, «гуманны» сацыялізм.

Ды што там казаць, калі пасля эпохі панавання «крамлёўскіх дзядоў» сапраўдны фурор рабіла ўжо адно тое, што новы генеральны сакратар ЦК КПСС гаворыць без паперкі і без рызыкі згубіць пры гэтым штучную сківіцу!

Пройдзе даволі шмат часу, перш чым прамовы Гарбачова пачнуць выклікаць у савецкіх грамадзян напачатку лёгкае, а затым усё нарастаючае раздражненне, бо з удасканаленнем ягонага красамоўства справы ў падначаленай яму дзяржаве будуць ісці ўсё горай і горай...

Шушкевіч жа ўпершыню зірнуў на Гарбачова іншымі вачыма пасля жахлівых дзён вясны 1986-га, калі

чарнобыльскі выбух абсыпаў Беларусь смяротным радыеактыўным попелам. Генсек ЦК КПСС, безумоўна, быў да драбніц інфармаваны аб жудасных маштабах трагедыі. Але мужнасці сказаць усю праўду так і не знайшоў: выступаючы неўзабаве па Цэнтральным тэлебачанні, настойліва даводзіў, што ніякай небяспекі, можна лічыць, няма... Ужо каго-каго, а фізіка-ядзершчыка Шушкевіча такія заявы ўвесці ў зман не маглі. Ён выдатна ўяўляў, што здарылася на справе, як добра ведаў і тое, што многія наступствы можна было прадухіліць элементарнымі экстранымі захадамі (каб людзі, напрыклад, пілі для прафілактыкі ёд, які абараняе ад нуклідаў шчытападобную залозу, ушчыльнілі вокны і дзверы, па магчымасці не выходзілі на вуліцу). І грунтоўныя, падрабязныя інструкцыі на гэты конт меліся ва ўсіх штабах грамадзянскай абароны. Аднак час быў злачынна змарнаваны, бо там, на камуністычна-дзяржаўным Алімпе, найперш захвалявaліся не пра лёс мільёнаў ахвяр чарнобыльскага выбуху, а, як заўсёды, пра імідж Сістэмы, пры якой, згодна са шматгадовай афіцыйнай міфалогіяй, ніякіх катастроф проста быць не можа...

Менавіта тады, у першыя дні, людзей зноў прынеслі ў ахвяру традыцыйнай Вялікай Хлусні. І беларускія, украінскія, расійскія дзеці бесклапотна корпаліся ў пяску, размахвалі чырвонымі сцяжкамі, седзячы на таткавых плячах падчас першамайскіх дэманстрацый (дні стаялі такія цёплыя, пагодлівыя, і ўсіх так цягнула на вуліцу!), а на іх усё сыпаўся і сыпаўся нябачны радыеактыўны пыл, што праз некалькі гадоў абернецца для многіх агоніяй на ложку анкалагічнага дыспансера...

Пазней, стаўшы народным дэпутатам СССР, Шушкевіч убачыў яшчэ шмат з таго, што не даносілі да мільёнаў радавых грамадзян тэлекамеры, усталяваныя ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў,— вытанчаную закулісную механіку выкручвання рук, жорсткага ціску на дэмакратычную апазіцыю, на тых людзей, што напачатку так шчыра паверылі Гарбачову і якіх ён потым, калі прастора для кампрамісаў паміж рэфарматарамі і артадоксамі пачала катастрафічна звужацца, усё часцей і часцей з'едліва называў «так званымі дэмакратамі», раз за разам усё выразней ад іх адмяжоўваючыся. Не дадало сімпатый да Гарбачова і ягонае спантаннае, няўзважанае абяцанне Захаду ў нерэальна імклівым тэмпе вывесці савецкія войскі з краін былога «сацыялістычнага лагера». Бо расплачвацца за наступствы гэтага шырокага жэста давялося найперш

менавіта Беларусі, і без таго самай мілітарызаванай савецкай рэспубліцы, куды хлынулі з захаду новыя палкі і дывізіі — тысячы ды тысячы людзей у пагонах, што, як і ўсе астатнія смяротныя, хочуць есці і мець дах над галавой.

Ну, і, нарэшце, тая восень 1991-га, калі новаспечаны кіраўнік беларускага парламента адчуў на пасяджэннях Дзяржсавета ў Маскве ўсю моц гарбачоўскага прэсінгу, накіраванага на тое, каб падмяць волю астатніх і навязаць-такі свой варыянт аб'яднання рэспублік. Дзяржсавет патрэбен быў яму толькі як шырма для дыктоўкі сваіх умоў. Трэшчына ва ўзаемаадносінах станавілася ўсё шырэйшай. А паміж Віскулямі і Крамлём была ўжо непераадольная бездань...

* * *

## Адступленне. Аўтарскі «допыт» (люты 1993 года)

— *Як вядома, Вам потым даводзілася неаднойчы сустракацца ўжо з экс-прэзідэнтам СССР. Ці закранаў ён пры гэтым хоць раз «белавежскую» тэму?*

— Не, ніколі. Праўда, выказваў крыўду з іншай нагоды. У верасні 1992 года і яго, і мяне запрасілі на прадстаўнічы міжнародны кангрэс у нямецкі горад Вольфсбург. Мне давялося там выказаць меркаванне — у тактоўнай форме, вядома, што Гарбачоў занадта эксплуатуе сваю папулярнасць на Захадзе, дае шмат парад, аднак лепш было б, каб ён сам імі як след карыстаўся, калі меў уладу. Міхаіл Сяргеевіч вельмі пакрыўдзіўся, асабліва на маю фразу пра тое, што ён быццам адчувае сябе прэзідэнтам Злучаных Штатаў Свету. Але я лічу, што для тых маіх выказванняў мелася падстава. Ну як, прабачце, можна разглядаць Гарбачова ў якасці патэнцыяльнага прэзідэнта Сусветнага Зялёнага Крыжа, калі на ягоным сумленні — утойванне маштабаў чарнобыльскай трагедыі? Маё перакананне: трэба перш за ўсё сапраўды рабіць дабро Радзіме, а не біць сябе ў грудзі, пераконваючы ў гэтым увесь свет.

* * *

Тых, хто заседзеўся ля тэлеэкранаў позна вечарам 8 снежня, адначасова бы тарганула электратокам. Імгненна зляцела дрымота, людзі ўскоквалі з канап, каб пабольшыць гук...

Беларускае тэлебачанне паведамляла пра вынікі белавежскай сустрэчы.

Фразы, што гучалі з тэледынамікаў, шмат каму падаваліся ірэальнымі, фантастычнымі, іх сэнс ніяк не хацеў укладвацца ў свядомасці. Саюза больш няма... створана Садружнасць трох незалежных дзяржаў... каардынацыйны цэнтр — Мінск.

Безумоўна, тое, што стары, збудаваны па сталінскай мадэлі Саюз асуджаны, тады ўжо разумелі, бадай, усе. Але мала хто мог прадбачыць, што разрыў з мінулым будзе менавіта такім — маланкавым, дзёрзкім, ашаламляльным...

І няўжо Гарбачоў капітулюе? Хто-ніхто апасліва адсоўваў фіранку: можа, ужо выязджаюць на вуліцы бронетранспарцёры?

Шушкевіч вярнуўся ў Мінск апоўдні 9 снежня. Журналісты ўжо каравулілі літаральна ля трапа. Далажылі: у замежных сродках масавай інфармацыі — натуральны фурор, «радыёгаласы» і тэлетайпныя стужкі няспынна даносяць усё новыя заявы палітыкаў і каментарыі экспертаў, дзе вылучаецца нота трывогі за магчымае развіццё падзей...

Шушкевіч выглядаў спакойна і ўпэўнена:

— Ці так драматычна, як гэта бачаць за мяжой, пагадненне змяняе сітуацыю ў краіне і ў свеце?.. Нам неабходна было знайсці дастойны варыянт для таго, каб, атрымаўшы сапраўдную суверэннасць, не раз'ядноўвацца граніцамі, праводзіць самастойную, але ўзгодненую з суседзямі палітыку. Вы ведаеце, што ў апошні час сітуацыя ў краіне стала крытычнай. Народ Украіны адназначна выказаўся за незалежнасць. Расія абнародавала сваю праграму жорсткіх эканамічных рэформ, якія не могуць не закранаць інтарэсы яе суседзяў... Думаю, не толькі мяне хвалявала пытанне: ці можна зрабіць так, каб не ўзводзіліся агароджы паміж Беларуссю і Украінай, Беларуссю і Расіяй? Мы, здаецца, знайшлі адказ і на гэта пытанне... У нас ёсць вера і надзея, што да гэтага пагаднення далучацца іншыя рэспублікі... Мяркуем, што да яго могуць далучыцца і тыя дзяржавы, якія не былі суб'ектамі былога СССР.

Праз колькі часу, перачытваючы гэтае інтэрв'ю, надрукаванае ў беларускай прэсе пад гучным загалоўкам «36 гадзін, якія ўскалыхнулі свет», ён з сумнаватым гумарам зазначыць: і нас тады не абмінула бальшавіцкая мроя пра «сусветную рэвалюцыю»! Прыбалтыка, нягледзячы на ўсе захады, ідэяй далучэння да Садружнасці

не загарыцца. Ды і ўнутры СНД справы пойдуць не так гладка, як хацелася. Расія і Украіна пачнуць зацята, абменьваючыся пагражальнымі заявамі палітыкаў, спрачацца за Чарнаморскі флот, потым — за лёс размешчанай на Украіне ядзернай зброі былога СССР. На межах рэспублік стануць паспешліва будавацца мытні, а друкарскія станкі пачнуць тыражаваць сурагаты нацыянальных валют — украінскія карбованцы, беларускія рублі-«зайчыкі», кыргызскія сомы... Паміж краінамі СНД будуць падпісвацца ўсё новыя эканамічныя пагадненні, але колькасць гэтых дакументаў упарта не захоча пераходзіць у іх якасць. І раз за разам Шушкевічу давядзецца трываць жорсткія, бязлітасныя ўдары апанентаў — тых, каму менавіта белавежскія рашэнні пададуцца той скрыняй Пандоры, адкуль раптам пасыпаліся ўсе беды. Ашалеламу ад дарагоўлі і чэргаў у крамах простаму люду будуць нагадваць пра танную каўбасу і гарэлку часоў СССР. А купка камуністаў, сабраўшыся ў пушчы ў гадавіну сустрэчы трох лідэраў, з імпэтам заб'е ў зямлю тры асінавыя калы...

Ну, з тымі, урэшце, усё зразумела. Куды больш крыўдна будзе, што і многія дэпутаты беларускага парламента хутка забудуцца, як дружна прагаласавалі яны ў свой час за ратыфікацыю падпісанага іх кіраўніком пагаднення, і ператворацца ў яго гнеўных крытыкаў.

А ў той дзень, 10 снежня, Шушкевіч і сам не чакаў, што справа вырашыцца гэтак імкліва. Спадзяваўся на трохі іншы, больш «лагодны» варыянт: калі ўдасца пераканаўча давесці парламентарыям сэнс белавежскага кроку, то Вярхоўны Савет адобрыць асноўныя палажэнні пагаднення і даручыць сваім камісіям дапрацаваць дэталі, каб потым ужо зрабіць канчатковы разгляд. Але абмен думкамі напачатку ў кулуарах, а потым і на парламенцкім пасяджэнні засведчыў нечакана рашучы настрой дэпутатаў: калі ўжо наважыліся на галоўнае, дык ці варта, маўляў, секчы хвост у некалькі прыёмаў — давайце ўжо адным махам!

Вынікі галасавання выглядалі эфектна: за ратыфікацыю — 263, устрымаліся — 2, супраць — толькі 1.

То быў, бадай, момант, калі прадстаўнікі самых розных парламенцкіх плыняў фенаменальна сышліся на глебе агульнай незадаволенасці палітыкай Гарбачова. Калі нацыянальна-дэмакратычная апазіцыя, напрыклад, націскаючы кнопкі галасавання, з асалодай помсціла Прэзідэнту СССР за ягоныя імперскія амбіцыі, то носьбіты артадаксальных, кансерватыўных поглядаў

разлічваліся такім чынам за ягоную «здраду справе КПСС», за абрыдлую нерашучасць, палавіністасць у барацьбе супраць «сепаратыстаў» і ўвогуле «так званых дэмакратаў». Тыя, хто марыў пра рэванш за страту «сацыялістычных заваёў», употай разважалі, відаць, што не бывае ліха без дабра: калі ўжо Цэнтр не здолеў гэтыя заваёвы абараніць, то, можа, якраз суверэнітэт дазволіць стаць гаспадарамі становішча ў асобна ўзятай невялікай рэспубліцы, дзе ўсё знітавана старымі наменклатурнымі сувязямі. Між іншым, далейшая хада падзей пакажа, што спадзяванні тыя былі не такімі ужо і беспадстаўнымі. Магутнае кансерватыўнае лобі, адчуўшы ў парламенце сваю сілу, будзе не аднойчы зводзіць на нішто намаганні рэфарматараў, «выкручваць рукі» Старшыні...

Тады ж, 10 снежня, быў поўны трыумф Шушкевіча. На працягу дня ён раз-пораз звязваўся па тэлефоне то з Масквой, то з Кіевам, і тое, аб чым яму паведамлялі, выразна сведчыла, што і ў расійскім, і ў украінскім Вярхоўных Саветах «працэс пайшоў» з гэткай жа імклівасцю і ашаламляльным поспехам.

Аднак да лунання ў аблоках было далёка. Як-ніяк, Прэзідэнт СССР заставаўся рэальнай фігурай і неўзабаве пасля «нямой сцэны» падчас тэлефоннага дыялогу з Шушкевічам авалодаў сабой. У сродках масавай інфармацыі прагучала ягоная прасякнутая гнеўнымі нотамі заява. Гарбачоў абвяшчаў белавежскія рашэнні авантурыстычнымі і незаконнымі, абмовіўшыся, праўда, што ўдзел Украіны ў сустрэчы падаецца яму добрым сімптомам, адыходам ад гранічна сепаратысцкіх настрояў. «Кожная рэспубліка мае права выхаду з Саюза, але лёс шматнацыянальнай дзяржавы не можа быць вызначаны воляй кіраўнікоў трох рэспублік»,— зазначыў Гарбачоў, імкнучыся, напэўна, сыграць на амбіцыях лідэраў Малдовы, Закаўказзя, Сярэдняй Азіі.

Якраз з імі і вёў у гэты час інтэнсіўныя тэлефонныя перамовы беларускі Старшыня. Потым ён прызнаецца, што ніколі ў жыцці не праводзіў столькі часу са слухаўкай у руцэ. Важна было як мага хутчэй схіліць усіх патэнцыяльных партнёраў да ідэі Садружнасці. А тут, як на грэх, гэтая мядзведжая паслуга журналістаў, што імгненна раструбілі на ўвесь свет пра «новы саюз славянскіх дзяржаў». Вось і вылузвайся цяпер са скуры, даводзячы, што ніякай славянскай фанабэрыяй тут і не патыхае...

Неўзабаве сродкі масавай інфармацыі пачалі паведамляць: за Садружнасць выказаліся Назарбаеў, Муталібаў, Тэр-Петрасян, Акаеў...

Гарбачоў яшчэ працягваў свае філіпікі, пагражаў, што звернецца «непасрэдна да народа»... Але сама гэтая фразеалогія, у той час як нават зацятыя фундаменталісты пазбягалі ўжо тэзісу пра «адзіны савецкі народ», выклікала міжволі іранічныя ўсмешкі. І шмат хто адчуваў, што ўсё гэта проста блеф. У рэшце рэшт і сам Прэзідэнт СССР зразумее, што пачаў выглядаць фігурай трагікамічнай. І, да ягонага гонару, зробіць, бадай, адзіна дастойны ў тым двухсэнсоўным становішчы крок — уласнымі вуснамі адрачэцца ад свайго тытула. Далёка не ўсе, дарэчы, адзначаць як след гэты ўчынак. Між тым, хто ведае, што магло б усчацца ва ўзбуджанай, знерваванай «перабудовачным» бязладдзем, нашпігаванай страшэннай зброяй краіне, каб у Гарбачова не хапіла тады цвярозасці мыслення, каб ён адчайна наважыўся ісці лоб у лоб да апошняга!

Неўзабаве знойдзецца багата ахвотнікаў без усялякай ужо рызыкі выцерці падэшвы аб былога Прэзідэнта СССР — ад эстрадных парадыстаў да шаноўных дзяржаўных мужоў. З Гарбачова будуць з асалодай здзекавацца і рэфарматары, і артадоксы, вінавацячы — кожны са сваёй званіцы — ва ўсіх магчымых і немагчымых грахах. Шушкевічу, у свой час перажыўшаму драму расчаравання ў былым куміру, будзе тым не менш ніякавата ад гэтай бязлітаснасці на мяжы садызму. Многія хутка забыліся, што менавіта былы генеральны сакратар ЦК КПСС адважыўся некалі ўскалыхнуць ідэямі рэфарматарства тую могілкавую атмасферу таталітарнай краіны, дзе палітычныя анекдоты расказвалі толькі паўшэптам на кухнях... І гэта вялікая чалавечая драма Гарбачова — тое, што «працэс пайшоў» значна далей, чым ён мог прадбачыць, пакінуўшы на ўзбочыне самога ініцыятара, у якога, мовячы спартыўным жаргонам, «не хапіла дыхалкі». Нават калі абставіны будуць вымушаць яго, Шушкевіча, да крытычных заўваг па адрасу экс-прэзідэнта Савецкага Саюза, слухачы будуць нязменна адчуваць ноткі тактоўнасці і чыста чалавечай павагі ад адной з самых неардынарных гістарычных асоб дваццатага стагоддзя.

* * *

### Адступленне. Аўтарскі «допыт» (люты 1993 года)

*— І ўсё ж ці не падаецца Вам, Станіслаў Станіслававіч, што фармальна Гарбачоў меў нейкую рацыю, заяўляючы, што трыма росчыркамі пяра*

*нельга вырашаць лёс шматнацыянальнай краіны? Як-ніяк у яе і сапраўды ўваходзілі не толькі славянскія рэспублікі...*

— Нагадаю: аб дэнансацыі Саюзнага дагавора 1922 года абвясцілі тры з чатырох рэспублік, якія ў свой час яго і падпісалі. І ва ўсякім разе пасля ратыфікацыі белавежскага пагаднення парламентамі Беларусі, Украіны і Расіі ўсе юрыдычныя праблемы, я лічу, былі знятыя. Ну, а крыху пазней, у Алма-Аце 21 снежня, як вы ведаеце, у СНД уступілі яшчэ восем рэспублік і такім чынам кропкі над «і» былі расстаўлены канчаткова.

А ўвогуле я прапанаваў бы зірнуць на сітуацыю з іншага боку: можа, неправамоцным быў якраз той, стары Саюз, утвораны сілай, бальшавіцкім прымусам? І мы проста адшукалі хай сабе, можа, і не стопрацэнтна дасканалы, але ўсё ж варыянт цывілізаванага выйсця з гэтага гістарычнага тупіка і аднаўлення справядлівасці. Скажыце, хто ў свой час пытаўся ў беларусаў, які шлях ім больш даспадобы?

* * *

І сапраўды — не пыталіся. Гвалтам загналі ў таталітарны бальшавіцкі «рай», а неўзабаве каванымі ботамі сталі выбіваць з душаў усё беларускае, з асаблівым садысцкім імпэтам абрушваючы ўдары на самых неардынарных, таленавітых — на эліту нацыянальнай культуры. Здавалася, што змрок ахутаў шматпакутную зямлю беларусаў назаўсёды, што жалезныя абдымкі крыважэрнага цмока не расціснуцца ніколі... І кінуты ў сібірскі лагер паэт-беларус Шушкевіч, вядома ж, нават у самых дзёрзкіх думках не мог сабе ўявіць, што менавіта ягонаму сыну наканавана праз паўстагоддзя з лішкам стаць адным з тых, хто вынесе канчатковы прысуд ужо калапсуючай савецкай імперыі.

«...Канстатуем, што Саюз ССР, як суб'ект міжнароднага права і геапалітычная рэальнасць спыняе сваё існаванне... 8 снежня 1991 года... За Рэспубліку Беларусь — С. Шушкевіч...»

## ДАЙСЦІ ДА БЕЛАРУСІ

За ранішнім кубкам гарбаты ён з усмешкаю сказаў жонцы:

— А ведаеш, што сёння прымроілася спрасоння, калі будзільнік пачуў? Што трэба ва універсітэт спяшацца — лекцыю чытаць.

Сказаў без задняй думкі, але адразу ж заўважыў па Ірынiных вачах, што міжволі закрануў балючую для яе тэму. Жонка з самага пачатку была не ў захапленні ад ягонага рашэння стаць палітыкам. Ад дабра дабра не шукаюць. Меў жа цікавую і прэстыжную працу, поспех, што выпадае далёка не кожнаму навукоўцу...

І раптам, усё кінуўшы,— у гэтае пекла. Палітыкам заўсёды і ўсюды на абаранкі добра давалі. Што ўжо казаць пра наш час і пра наша грамадства — хворае, затузанае, узбуджанае. Ды яшчэ са шматгадовай традыцыяй — абавязкова знаходзіць ворага, на якога можна спіхнуць віну за ўсе беды і няўдачы. Для студэнтаў ён быў богам, аракулам — а цяпер кожны, хто не лянуецца, можа вешаць усіх сабак. І не лянуюцца...

Між тым навука на месцы не стаіць. Былыя калегі мкнуць наперад, а ён і ранейшую кваліфікацыю, здаецца, пакрысе страчвае. Хіба што зрэдчас дапаможа сыну камп'ютэр наладзіць... І калі што якое — ці ўдасца вярнуцца на кругі своя, ці не чакаюць наперадзе разбітыя ночвы?

— Ты думаеш пра гэта, Станіслаў?

Ён усміхнуўся:

— Ведаеш, адно добра: пасля тваёй знішчальнай крытыкі мне ўжо любыя дэпутацкія наскокі дробяззю здаюцца...

* * *

Пад вокнамі кватэры чакае чорны службовы лімузін. Час на працу.



Сустрэчы на вуліцах Мінска: пытанні, праблемы, просьбы...

«Ну вось, і сам распанеў, як тыя аматары прывілей, якіх некалі так гнеўна бічаваў»,— іранічна адзначыў ён у думках.

У свой час прафесар Шушкевіч прызвычаіўся хадзіць на працу ва універсітэт пехатою. Выдатная размінка! Да таго ж — збіраешся з думкамі, яшчэ раз пракручваеш у галаве сюжэт будучай лекцыі. Хады ж ад дома на вуліцы Адоеўскага да галоўнага універсітэцкага корпуса — хвілін пяцьдзесят. Гэта калі няма нагоды асабліва спяшацца. Ну, а калі час падпірае — можна ўкласціся і ў сорак.

Спакваля прывучыў да рэгулярных шпацыраў і каго-кольвечы з калегаў, што жылі па суседству. У іх коле гэты маршрут атрымаў назву «сцяжыны Шушкевіча».

Ён спрабаваў спачатку хадзіць гэткім жа чынам і ў парламент. Але пра «сцяжыну Шушкевіча» даведалася занадта шмат людзей. Яго раз-пораз пільнавалі то са скаргамі, то з просьбамі, то з транспарантамі... Не адмахнешся ж як ад надакучлівых мух — даводзіцца прыпыняцца, выслухоўваць, адказваць. Зразумеў, што неўзабаве гэткім макарам не дапнеш да працы ўжо і за некалькі гадзін. Здаўся: стаў ездзіць у службовай машыне. Ад другой, на якую па рангу таксама меў права, адмовіўся.

Надзвычай няўтульна было першым часам у тых выпадках, калі разам з нейкім ганаровым госцем з-за мяжы стралой імчыш у ланцугу картэжа з міліцэйскімі «міргалкамі» праз горад, а паабапал увесь рух перакрыты і, вядома ж, вадзіцелі ды пасажыры спыненага транспарту нервова пазіраюць на гадзіннікі... Напачатку і ад аховы хацеў адмовіцца. Але людзі вопытныя пераканалі: гэта ўжо сціпласць залішняя. Потым, калі стаў часцей бываць за мяжой, упэўніўся: без падобнага ні ў адной краіне не абыходзяцца і дзейнасць адпаведных службаў апраўдана і выверана каласальным вопытам. І ганаровых гасцей усюды заведзена прымаць на належным узроўні. І без службовых машын тамтэйшае кіраўніцтва не абыходзіцца. Іншая справа, што на Захадзе высокапастаўленыя асобы страшэнна баяцца хоць на крок выйсці за межы афіцыйна ўсталяваных прывілей, тады як наша кіраўніцкая каста не толькі раздула гэтыя прывілеі звыш усялякай разумнай меры, але і ведае яшчэ безліч «неафіцыйных» спосабаў трохі палепшыць сваё жыццё за казённы кошт...

А ўсё ж ён куды больш камфортна адчуваў сябе за



Віншаванні з нагоды абрання С. С. Шушкевіча Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

рулём уласных «Жыгулёў» пятай мадэлі! Машына, дарэчы, нягледзячы на свой даволі сталы век, па-ранейшаму ў прыстойнай форме. Толькі цяпер за яе руль садзіцца жонка.

* * *

З універсітэцкае пары захавалася, аднак, завядзёнка з'яўляцца ў службовым кабінеце на гадзіну раней, чым афіцыйна пачынаецца працоўны дзень. Выдатны, спакойны час, калі не турбуюць тэлефоны, калі можна нетаропка паразважаць пра бліжэйшыя справы, сістэматызаваць іх, прадумаць тактыку вырашэння той ці іншай бягучай праблемы... Або пагутарыць, параіцца з чалавекам, якому асабліва давяраеш. Шушкевічу неаднойчы даводзілася чуць: праявіў, маўляў, мяккацеласць, не разагнаў стары апарат, не набраў сабе «каманду». Цікава, што тыя крытыкі разумеюць пад словам «каманда»? Разганяць апарат ён сапраўды не стаў. Тут — служачыя, што займаюцца перш за ўсё, так бы мовіць, тэхнічным забеспячэннем палітыкі. І ў пераважнай большасці сваёй робяць гэта сумленна, кваліфікавана. А што тычыцца генеравання ідэй, мазгавых атак — гэта ўжо трохі іншая задача, і адпаведная каманда, ён лічыць, ёсць. Тыя, хто ў яе ўваходзіць, не атрымліваюць тут зарплаты, кожны з іх пры сваёй справе: хто ў навуцы, хто ў бізнесе... Гэта

добрыя таварышы, аднадумцы, і плячо яны падстаўляюць як след. Іншая справа, што ён не бачыць асаблівай патрэбы афішаваць іх імёны.

* * *

Ягоны кабінет — на пятым паверсе масіўнага жоўтага будынка ў цэнтры Мінска. Да жнівеньскага путчу гэта быў штаб беларускіх камуністаў.

Прайграўшы бунт супраць грамадскіх перамен, партыя мусіла развітацца і са сваёй маёмасцю, у значнай ступені нажытай за народны кошт...

У свой час яму неаднойчы даводзілася бываць у гэтым будынку па выкліках. Партыйныя багі не заўсёды вызначаліся пунктуальнасцю. Іншым разам просты смяротны гадзіну, а то і болей марнуецца ў прыёмнай, пакуль пра яго не «прыгадаюць». Трэба ж, каб багі паказвалі сваю веліч і тытанічную загружанасць больш маштабнымі справамі. А выкліканы ўсё адно чакаць будзе, нікуды не падзенецца, галубок...

Аднойчы — тады яго «запрасілі» па нейкай справе разам з сакратаром універсітэцкага парткама — Шушкевіч, раз-другі зірнуўшы на гадзіннік, не вытрымаў:

— Ты як хочаш, а ў мяне справы. Перадай прывітанне!

І пайшоў. Такой дзёрзкасці ў гэтых сценах, мусіць, яшчэ не назіралася...

Партыя — дакладней, яе апаратная каста — так і не адчула, што няўмольна надыходзіць іншы час, што яе нахабнае панаванне выклікае ў людзей ужо не страх, а толькі раздражненне і нянавісць. Калі Шушкевіч паклаў на парткамаўскі стол заяву аб выхадзе з КПСС, гэта ўжо не выглядала сенсацыяй. Тады, у тыя месяцы, такіх людзей былі тысячы і тысячы. Непапраўныя артадоксы будуць крычаць услед; «Пярэваратні!».

Шушкевіч згадае тады афарызм класіка пра тое, што сваіх поглядаў не мяняюць адны дурні...

* * *

«Давайце толькі факты!» — рашуча запатрабаваў Шушкевіч ад работнікаў апарату ў першыя дні сваёй працы Старшынёю.

Бо калі трэба было падрыхтаваць даведачны матэрыял па нейкай праблеме, многія па старой завядзёнцы шчодра аздаблялі тэксты пустапарожнімі пасажамі ў стылі бюракратычнага «навамоўя».

За шмат гадоў апарат прызвычаіўся: не кіраўнік піша даклад, а кіраўніку пішуць... З кавалкаў, падрыхтава-



Свой пункт погляду даводзіцца тлумачыць, даказваць, адстойваць...

ных у розных аддзелах і службах, амаль што механічна склейваўся гатовы «выраб». Шаноўнаму шэфу заставалася толькі «агучыць» тэкст. У каго-кольвечы і гэта атрымлівалася, на жаль, не бліскуча...

Шушкевіч, атрымаўшы лапідарныя даведкі, узбройваецца ўлюбёнай аўтаручкай з чорным чарнілам і усё астатняе робіць самастойна. У многіх выпадках (калі гэта не штосьці такое звыш-звышафіцыйнае) яму дастаткова для выступу накідаць толькі сціслыя тэзісы. А іншым разам пад настрой ён увогуле адсоўвае паперчыну ўбок і аддае перавагу экспромту, бо хвіліну назад, гледзячы ў вочы аўдыторыі, адчуў: людзі чакаюць менавіта вось гэтых слоў... І тады атрымліваецца, бадай, найлепей.

Быў выпадак, калі дэпутат-ветэран, вядомы дакучлівым пракламаваннем сваіх артадаксальных поглядаў, імпэтна абрынуўся на адну недапушчальную, на ягоны розум, думку, выказаную Шушкевічам у газетнай публікацыі. Ветэран зрабіў з'едлівую выснову: відаць, Старшыня паленаваўся нават прачытаць перад адпраўкай у друк тую бязглуздзіцу, што нехта ад ягонага імя напісаў...

— Прабачце, шаноўны,— звярнуўся Шушкевіч да

свайго крытыка,— гэта, мусіць, вы, у адрозненне ад мяне, прызвычаіліся, каб за вас нехта пісаў...

Дэпутату, які падчас свайго выступу сапраўды не адрываў вачэй ад паперчыны, не было чаго адказаць.

* * *

Да пачатку прамой тэлетрансляцыі — некалькі хвілін.

Грымёрка спяшаецца трохі прыпудрыць твары Старшыні і вядучага — інакш будуць блішчэць пад распаленымі юпітэрамі. Папярэдне, каб пудра не трапіла на адзенне, завязвае шаноўнаму госцю студыі экзатычны чырвоны фартух.

Шушкевіч азірае сябе:

— А што, нядрэнна! Можа, так і выйсці ў эфір?

Ён у гуморы, хоць справа чакае нялёгкая. Тут, у студыі, у яго няма ніякіх шпаргалак. Выхад у эфір, як кажуць тэлевізійшчыкі,— «жыўцом».

Успыхвае чырвонае вочка тэлекамеры. Паехалі!

У студыі бесперапынна звоняць тэлефоны, на стол вядучага кладуцца дзесяткі, сотні запісак з толькі што атрыманымі пытаннямі гледачоў. Каго хвалююць маштабныя палітычныя праблемы, каго — адсутнасць гарэлкі ў краме...

Жывы эфір адразу «распранае» таго, хто перад тэлекамерай. Тугадумства, касназыкасць, няшчырасць — усё як на далоні. Мабыць, таму ранейшыя кіраўнікі рэспублікі лічылі за лепшае не завітваць у тэлестудыю.

Шушкевіч першы стаў з'яўляцца на экране рэгулярна і гаварыць без паперкі. Так званыя «прамыя лініі» з ім пачалі збіраць ля экранаў зайздросную для палітычных перадач аўдыторыю. За гадзіну эфіру ён звычайна паспявае даць трыццаць-сорак адказаў: лаканічных і ёмістых, калі трэба — эмацыянальных, калі ёсць нагода — жартоўных. Той, хто знаёмы са спецыфікай тэлебачання, ведае: такі дынамічны тэмп можа трымаць далёка не кожны госць студыі...

І што яшчэ адметна — адказы гэтыя гучаць на выдатнай, бездакорнай беларускай мове.

Дарэчы, і ў самім Вярхоўным Савеце толькі з прыходам да кіраўніцтва Шушкевіча праз старшынёўскі мікрафон упершыню загучала спрадвечная мова таго народа, які і выбраў гэты парламент.

* * *

Як жа яе затапталі, закатавалі, нашу мову, калі гэта стала для нас дзівам!

За вершы, складзеныя на роднай мове, дваццаць гадоў адпакутаваў у Сібіры бацька Шушкевіча. А колькі такіх, аб'яўленых «нацыяналістамі», і ўвогуле сталі лагерным пылам... Дзесяцігоддзямі Сістэма няўхільна праводзіла на Беларусі цынічную, езуіцкую палітыку русіфікацыі. А сёння духоўныя нашчадкі Сістэмы (якія, дарэчы, і мовячы па-руску, у масе сваёй далёка не выглядаюць Цыцэронамі) натужліва крычаць на мітынгах ды і ў парламенце: «Какая мова?! Да посмотрите — народ ее знать не хотит!»

І то сказаць: як ён яшчэ ўвогуле выжыў, гэты народ.

* * *

Неяк адзін з дэпутатаў, даводзячы з трыбуны, што беларуская мова нікому не патрэбная, стаў спасылацца на даныя сацыялагічнага апытання.

— Прабачце, а выбаркі рэпрэзентатыўныя? — пацікавіўся Шушкевіч.

Бядак страшэнна збянтэжыўся і як вады ў рот набраў. Хутчэй за ўсё, увогуле ўпершыню чуў гэты тэрмін.

На жаль, з першых жа дзён працы гэтага складу парламента незайздросны ўзровень эрудыцыі і палітычнай культуры прадэманстраваў далёка не адзін дэпутат... У Вярхоўны Савет прыйшлі пераважна палітыкі-дылетанты. Нават тыя, хто ўжо не адзін год меў дачыненне да дзяржаўных спраў, былі абсалютна не гатовыя да новых «правілаў гульні», бо засвоілі зусім іншыя правілы: без усіх гэтых працэдур, дэбатаў і іншых дэмакратычных «штучак», а проста — як сказаў, так падначаленыя павінны і зрабіць...

І гэтая акалічнасць ужо сама па сабе — нават калі не браць пад увагу спецыфіку поглядаў большасці — вызначыла не надта вялікі стваральны патэнцыял выбранага ў 1990-ым Вярхоўнага Савета.

Напачатку парламент безнадзейна блытаўся ўжо на стадыі працэдурных пытанняў. З прыходам на кіруючую пасаду Шушкевіча сесіі, дзякуй Богу, сталі трохі меней нагадваць бязладны калгасны сход. Праўда, гучалі і крыўды: маўляў, Старшыня паводзіць сябе на пасяджэннях занадта ўладна, па-дыктатарску, «затыкае рот»... Але ў хуткім часе адчулася: у парламенце з'явіўся нарэшце сапраўдны спікер, які дасканала вывучыў працэдуру, умела ўціхамірвае бязладдзе, лагічна і доказна прапануе аптымальны варыянт абмеркавання таго ці іншага складанага пытання. Карацей кажучы, вядзе рэй так, як і належыць спікеру.



Так, Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі
гэта не зусім тое ж, што спікер у брытанскім парламенце...

Безумоўна, і сам Шушкевіч спасцігаў шмат якія сакрэты палітычнага рамяства, ужо «ўвязаўшыся ў бойку» і атрымліваючы кухталі. Абклаўся кнігамі палітолагаў, перш за ўсё замежных (пра белетрыстыку, чытанне «для душы» давялося, як ні сумна, практычна забыць).

На жаль, айчыннае палітычнае жыццё занадта доўга працякала ў вельмі спецыфічных умовах, таму вартасць адпаведных тэарэтычных прац, напісаных савецкімі аўтарамі, сёння можна ацаніць, як правіла, толькі макулатурным коштам змарнаванай на гэтыя фаліянты паперы. Не дзіўна, што такое, напрыклад, паняцце як «іміджмейкінг» для большасці нашых палітыкаў — цёмны лес. Шушкевіч спасцігаў яго ў свой час інтуітыўна. Ды і цяпер не мае ў сваім штаце тых, хто б прафесійна дапамагаў «ляпіць вобраз». Тым не менш, прагледзеўшы падараваныя за мяжой відэакасеты з запісамі некалькіх сваіх выступленняў, зрабіў выснову, што вялікіх падстаў для роспачы няма...

І ўсё ж, адказваючы напрыканцы 1992 года на пытанне карэспандэнта газеты «Звязда» — маўляў, ці можаце вы ўжо назваць сябе палітыкам — Шушкевіч выглядаў самакрытычна: «Не. Але я не лічу палітыкамі



Сесія будзе цяжкай...

і многіх, хто тут так называўся і называецца па сённяшні дзень. Каб прафесійна займацца гэтай справай, трэба перш за ўсё мець адпаведную адукацыю ў галіне паліталогіі. У мяне стыхійная адукацыя ў гэтай галіне, а на інтуіцыі тут далёка не паедзеш. І калі я нават адчуваю сябе палітыкам, калі здаецца, што нешта людскае зрабіў — удалося, напрыклад, адстаяць у міжнародных перамовах нашы інтарэсы, пазіцыі,— пасля я пераконваюся, што выкарыстаў ардынарны прыём, які ўвайшоў у падручнікі...».

На жаль, у многіх дэпутатаў да гэтых падручнікаў увогуле рукі не дойдуць.

Дарэчы, менавіта перавага ў эрудыцыі, тактычным мысленні, прамоўніцкім майстэрстве не аднойчы дапаможа маленькай апазіцыі валіць у пыл парламенцкую большасць, як Давід Галіяфа.

Шушкевічу ж будзе надзвычай цяжка працаваць яшчэ і таму, што тая самая большасць стане раз за разам з асалодай «заразаць» прапануемых ім кандыдатаў на вакансію намесніка Старшыні.

Шмат часу з першых жа дзён пачала адбіраць і адрасаваная на яго імя пошта. Шушкевіч узяў за правіла

асабіста знаёміцца практычна з усімі такімі лістамі. Іншая справа, што далёка не ўсе пытанні, узнятыя ў тых зваротах, уваходзяць у кампетэнцыю Старшыні. Простыя грамадзяне ў масе сваёй пакуль што, на жаль, не ўсвядомілі як след, што такое падзел уладаў. За шмат гадоў існавання Сістэмы людзі прызвычаіліся да таго, што ў рэспубліцы абавязкова ёсць «першы», «гаспадар» — так клікалі за вочы вышэйшых партыйных босаў, карацей, чалавек, якому падуладна ўсё. Адсюль — і крыўды на Старшыню, калі накіраваны на яго імя ліст перапраўляецца для прыняцця адпаведных захадаў у нейкую інстанцыю. І паспрабуй растлумач, што мы ж нездарма абвясцілі лозунг прававой дзяржавы, што не можа ён, Шушкевіч, росчыркам уласнага пяра «караць і мілаваць», як колішнія самадзержцы!

З іншага боку, ліст да Старшыні — гэта нярэдка жэст гранічнага адчаю, калі чалавек прайшоў ужо ўсе «колы пекла» і канчаткова зняверыўся, што можна знайсці справядлівасць у кабінетах мясцовых ды ведамасных чынуш.

Атрымаўшы мноства скаргаў ад жыхароў Барысава, Шушкевіч пабываў у гэтым горадзе восенню 1992-га. І на свае вочы ўбачыў: большасць з таго, пра што яму з абурэннем пісалі,— чыстая праўда. Ён звярнуўся да мясцовых кіраўнікоў з заклікам навесці ў горадзе парадак. Але тыя закасалі рукавы зусім з іншай мэтай... Яны вырашылі правучыць Старшыню. Кіраўнік гарсавета Шыдлоўскі заявіў, што Шушкевіч, маўляў, займаецца папулізмам, «заклікае да перавароту ў горадзе».

З паўгода сачыла прэса за развіццём «барысаўскага канфлікту». Адмысловая праверка афіцыйна выявіла цэлы букет непарадкаў у «гаспадарцы» Шыдлоўскага. Але ў выніку, атрымаўшы ад абласных уладаў толькі чыста сімвалічныя спагнанні, барысаўскія кіраўнікі наглядна прадэманстравалі сваю «непатапляльнасць».

Высілкі Старшыні не аднойчы будуць такім вось чынам грузнуць у магутнай, глыбока эшаланіраванай абароне старой наменклатурнай гвардыі, намёртва з'яднанай кругавой парукай. Шушкевіч адчуе: прабіць брэшы ў гэтай абароне дапаможа толькі новая, дэмакратычная рэдакцыя закона аб мясцовым кіраванні, калі кіраўнікоў пачнуць абіраць усе дарослыя жыхары адпаведнага горада ці рэгіёна.

Ён пачне настойліва паўтараць гэту ідэю ў сваіх выступленнях і інтэрв'ю, чым адразу ж выкліча дадатковае раздражненне «князькоў». Да пары да часу яны закусяць губу...




І такія бываюць сустрэчы ў Старшыні Вярхоўнага Савета. Барысаў, 1992 год

* * *

Нягледзячы на адсутнасць намесніка, удалося з цягам часу арганізаваць сваю працу так, каб не заседжвацца ў кабінеце да ночы. Іншы начальнік лічыць такое няспанне вялікай доблесцю: паглядзіце, маўляў, як дбаю я пра інтарэсы справы, як «гару на рабоце». У Шушкевіча крытэрый іншы: калі «зашыўся» — значыць, дрэнна спланаваў і арганізаваў свой дзень, не здолеў размеркаваць руцінную працу паміж падначаленымі. Ды і які з цябе назаўтра работнік са свінцовай адператамлення галавой?.. (Адно толькі: пашастаць, як раней, па дарозе дадому ў пошуках такіх-сякіх пакупак па крамах — ужо не выпадае...)

Ён узяў за правіла даваць сабе паўнацэнны адпачынак і ў выхадныя. Усе думкі аб працы — убок. А найлепшы адпачынак — пацюкаць малатком ці пазавіхацца каля бетонамяшалкі на будаўніцтве сваёй загараднай «вілы», дзе фронт работ яшчэ шырачэзны. Для яго гэтае будаўніцтва так і засталося індывідуальным у самым натуральным сэнсе.

Аднойчы, наступіўшы там на цвік, пракалоў нагу. Журналісты, даведаўшыся, адразу ж растыражавалі навіну. Ён з гумарам адзначыў: для палітыка, ва ўсякім разе, гэта не самы горшы «пракол», пра які піша прэса...

Між тым друк пачаў раз за разам выцягваць на свет Божы даволі непрывабныя факты, звязаныя з імёнамі тых ці іншых «шышак». У рэспубліцы цішком пайшоў працэс, які ў народзе трапна ахрысцілі «прыхватызацыяй». Пакуль тармазілася прыняцце заканадаўства, што адкрыла б шлях да справядлівай прыватызацыі з удзелам радавых грамадзян, Савет Міністраў прыняў «часовыя» рашэнні, пад прыкрыццём якіх найменш абцяжараныя маральнымі прынцыпамі «тузы» пачалі жвава прыбіраць да сваіх рук спакуслівыя кавалачкі дзяржаўнай маёмасці. Адным з улюбёных стаў, напрыклад, спосаб, калі гэтая маёмасць па «ну, ве-ельмі смешных» цэнах спускаецца новаствораным прыватным фірмам, дзе на ключавых ролях апынуліся сваякі і сваячкі шаноўных босаў. Колішнія палымяныя змагары супраць «буржуазнай ідэалогіі» аказаліся на дзіва ўвішнымі бізнесменамі...

На непрывабных справах быў схоплены за руку і хто-кольвечы з дэпутатаў.

У інтэрв'ю «Народнай газеце» у лістападзе 1992-га Шушкевіч пракаменціраваў гэта так: «Каб, напрыклад, мяне ў друку абвінавацілі ў тым, у чым абвінавацілі асобных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь,— прабачце, я або застрэліўся б, каб змыць ганьбу са сваіх дзяцей, калі б гэта была праўда, альбо хацця б падаў у адстаўку. А калі б не адчуваў за сабой віны, то бараніў бы свой гонар. Калі ж людзі не ўзбуджаюць справу аб паклёпніцтве і не змагаюцца за сваю рэпутацыю ў судзе, што застаецца думаць? Можа, яны лічаць, што «сорам не дым, вочы не выесць»? Што ўсё неяк пакрысе забудзецца? Я лічу, што гэта проста не да твару народнаму дэпутату. Трэба ж мець хоць нейкі гонар! На жаль, я не бачу такой маральнасці ў тых, у каго яна павінна быць».

Увогуле ягоныя ацэнкі дэпутацкага корпуса, іншых кіруючых структур, усёй старой плеяды «адказных работнікаў» пачалі гучаць больш рэзка. У інтэрв'ю італьянскаму інфармацыйнаму агенцтву «АНСА» ў чэрвені 1993-га Шушкевіч выказаўся адкрытым тэкстам: «Прывыкнуўшы працаваць у ранейшай жорсткай каманднa-адміністрацыйнай сістэме, гэтыя людзі перабудавацца ўжо не могуць».

І гэтыя словы яму таксама неўзабаве прыгадаюць...



Дома за чаем

* * *

Да таго як Шушкевіч стаў дзяржаўным лідэрам, за мяжой яму давялося пабываць усяго некалькі разоў, ды і то выключна ў краінах, што ўваходзілі тады ў так званы сацыялістычны лагер,— Польшчы, ГДР, Югаславіі. Гэта былі не турыстычныя ваяжы — абменьваўся вопытам з калегамі, чытаў лекцыі. Вельмі дарэчы сталіся ўрокі польскай, атрыманыя некалі ад маці і бабулі. Дарэчы, у Югаславію ў 1966-ым і ў Польшчу ў 1974-ым давялося ехаць праз... Маскву, бо папярэдне належала прайсці адмысловы інструктаж у ЦК КПСС. Як выглядалі тады такія інструктажы, можна добра ўявіць па сатырычных песнях Уладзіміра Высоцкага... Савецкім грамадзянам строга прадпісвалася быць за мяжой наглуха зашпіленымі на ўсе гузікі — і ў пераносным, і ў прамым сэнсе. Памятаецца забаўны эпізод: падчас калёквіуму ў Любляне ў аўдыторыю зайшоў хударлявы барадаты чалавек у шортах (а дзень быў сонечны, гарачы) і спакойна прымасціўся проста на сходах. «Хто гэта?» — ціха пацікавіўся Шушкевіч у суседа. І пачуў імя знакамітага заходняга навукоўца. Аслабаняючы неўпрыкмет вузел гальштука, падумаў: нашага за такую вольнасць адразу б у парткам павалаклі...

Пасля распаду Савецкага Саюза свет напачатку пільна прыглядаўся: што ж гэта за новыя незалежныя дзяржавы, наколькі ўсё гэта сур'ёзна, ці варта з імі мець справу? Ішоў зандаж сітуацыі. І першыя паездкі лідэра маладой суверэннай Беларусі за мяжу не мелі характару афіцыйных міждзяржаўных кантактаў. Так, напачатку 1992-га яго запрасілі на Сусветны эканамічны форум у Швейцарыю. Трое беларускіх прадстаўнікоў прыляцелі туды звычайным пасажырскім авіярэйсам. Шушкевіч змог грунтоўна пагутарыць з шэрагам дзяржаўных дзеячаў розных краін, што ўдзельнічалі ў форуме.

— А што ж вы без аховы гуляеце? — пацікавіўся ў яго нехта з суразмоўцаў.

Шушкевіч не збянтэжыўся, кіўнуў на свайго памочніка Леаніда Камарова:

— А вось Леанід Захаравіч тут адзіны ў дзвюх асобах.

Вядома ж, узброены быў Камароў хіба што аўтаручкай з зарадам чарніла. Гэта потым, калі свет болей даведаецца пра маладую краіну, надыдзе час афіцыйных візітаў і на борце лайнера з выявай бел-чырвона-белага сцяга і надпісам «Беларусь» на

фюзеляжы, вядома ж, знойдзецца месца і для сімпатычных дужых хлопцаў з адпаведнай службы.

А тады... Не абышлося і без кпінаў, праўда, не з боку іншаземцаў, а з-пад пяра лідэра Беларускага народнага фронту. Пасля першай паездкі Шушкевіча ў Германію Зянон Пазьняк надрукаваў з'едлівы артыкул: сорам, маўляў,— кіраўнік незалежнай дзяржавы разменьваецца на запрашэнні нейкіх другаразрадных закардонных арганізацый...

Але тыя першыя кантакты не сталіся марнымі. Спакваля, кажучы мовай фізікі, нарошчвалася іх крытычная маса. У той самы час хто-кольвечы з урадавых асоб Беларусі, вярнуўшыся з-за мяжы, пераможна абвяшчаў: пашчасціла дамовіцца аб пастаўцы бясплатнай партыі апельсінаў! Шушкевіч вяртаўся ў Мінск без апельсінаў. Аддаючы належнае гуманітарнай дапамозе, ён, аднак, з самага пачатку зрабіў акцэнт на іншыя прыярытэты. Каб хутка мадэрнізаваць эканоміку рэспублікі, патрэбны выгадныя замежныя крэдыты, буйныя інвестыцыі. Трэба пераканаць заходніх партнёраў, што яны такім чынам не выкінуць грошы на вецер. А гэта вельмі няпроста, улічваючы, што ў беларускім парламенце з упартасцю, вартай лепшага ўжывання, тарпедуюцца законы, закліканыя даць прастору развіццю цывілізаванай рыначнай эканомікі, забяспечыць надзейныя гарантыі замежным інвестарам... Пасля адной з паездак Шушкевіч мусіў жорстка канстатаваць на прэс-канферэнцыі: «Нас у Еўропе ніхто асабліва і не чакае». І патлумачыў: «У рамках еўрапейскай інтэграцыі мы з працягнутай рукой нікому не патрэбны. Беларусь могуць успрымаць толькі як раўнапраўнага партнёра, здольнага садзейнічаць развіццю». У іншых гутарках з журналістамі ён таксама неаднойчы падкрэсліць гэтую думку: ніхто не збіраецца браць нас на ўтрыманне, ніхто не пройдзе за нас наш шлях.

* * *

Тым не менш у кабінетах заходніх дзеячаў усё часцей пачыналі з цікавасцю адшукваць на карце невялікую новую дзяржаву ў цэнтры Еўропы. Пакрысе бралася пад увагу ўсё: і нарастанне працэсаў ломкі Сістэмы, і адметнае геапалітычнае становішча Беларусі, і адносная развітасць яе эканомікі, і адсутнасць сур'ёзных міжэтнічных калізій, і традыцыйна памяркоўны менталітэт насельнікаў гэтага краю...

Асаблівыя ж сімпатыі ў свеце выклікалі рашучыя

крокі маладой незалежнай краіны ў напрамку ўмацавання міжнароднай бяспекі. Беларусь адразу ж выказала жаданне найхутчэй пазбавіцца ад страшэннай ядзернай спадчыны Саюза, ад дзесяткаў усталяваных тут некалі маскоўскімі стратэгамі ракет, кожная з якіх магла б пахаваць, бадай, цэлую еўрапейскую краіну сярэдняй велічыні...

26 лютага 1992 года ў Хельсінкі Станіслаў Шушкевіч падпісаў ад імя сваёй рэспублікі Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Выступаючы на ўрачыстай цырымоніі ў палацы «Фінляндыя», беларускі кіраўнік сцісла, але ёміста сказаў пра тое, чаму ідэя міралюбства так моцна валодае свядомасцю ягонага народа: «На працягу стагоддзяў, ні на кога не нападаючы, але знаходзячыся на геаграфічным і гістарычным раздарожжы, мая Радзіма пастаянна была арэнай спусташальных ваенных сутыкненняў паміж яе суседзямі. Ахвяры нашага народа каласальныя. Толькі апошняя сусветная вайна, паводле апошніх даных, забрала жыццё амаль кожнага трэцяга з 10-мільённага насельніцтва Беларусі.

Стагоддзі фізічнага знішчэння народа спалучаліся з яго духоўным падаўленнем. Сціплым і цярплівым беларусам унушалі, што такога народа наогул няма, што яго мовы — адной з самабытных і старажытнейшых славянскіх моў — таксама няма, што ў яго няма ні гісторыі, ні культуры. Нацыянальныя святыні і культурныя рэліквіі, якія цудам захаваліся пасля нашэсцяў заваёўнікаў, былі вывезены ў музеі іншых краін.

Як гэта ні горка, але наш народ, які змог выжыць і адстаяць сваё нацыянальнае «я» ў крывавых бойнях і прыгнётах мінулага, напаткала новая страшная трагедыя — чарнобыльская катастрофа, якая ўсеяла радыеактыўным попелам нашу краіну і паставіла пад сумненне захаванасць генафонду беларускай нацыі. Пацярпеўшы больш за ўсіх у гэтай бядзе, мы спадзяёмся на сумесную дапамогу і падтрымку з боку еўрапейскіх дзяржаў, многія з якіх згубнае чарнобыльскае воблака таксама не абышло.

Я думаю, з улікам сказанага не трэба растлумачваць, чаму ў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь дакладна сфармулявана мэта — зрабіць рэспубліку нейтральнай дзяржавай, а яе тэрыторыю — бяз'ядзернай зонай. Для Беларусі гэта — гістарычная неабходнасць, выказаная ў волевыяўленні нашага народа і парламента».

4 лютага 1993 года Вярхоўны Савет Беларусі ра-




З Лехам Валенсам на прэс-канферэнцыі. Мінск, 1993 год

тыфікаваў Дагавор аб скарачэнні і абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў (СНУ-1) і Лісабонскі пратакол да яго. Было прынята таксама рашэнне аб далучэнні да Дагавора аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі. Неўзабаве Шушкевічу патэлефанаваў новы прэзідэнт ЗША Біл Клінтан. Вітаючы міралюбівы курс Беларусі, ён запэўніў, што ягоная краіна прадаставіць маладой рэспубліцы гарантыі бяспекі, фінансава і тэхнічна дапаможа працэсу раззбраення. Меней чым праз паўгода, у ліпені, Вашынгтон цёпла сустрэне афіцыйную беларускую дэлегацыю. «Я нават здзівіўся такому добраму стаўленню да Рэспублікі Беларусь, такой павазе да яе пазіцый»,— скажа журналістам Станіслаў Шушкевіч. Падчас візіту была прынята сумесная дэкларацыя аб адносінах паміж ЗША і Беларуссю, якая акрэсліла спрыяльныя перспектывы супрацоўніцтва ў самых розных сферах.

Лайнер з выявай бел-чырвона-белага сцяга раз за разам бярэ курс на замежныя сталіцы. На працягу 1992—1993 гадоў Шушкевіч на чале афіцыйных дэлегацый сваёй краіны праводзіць плённыя перамовы з кіраўніцтвам Францыі, ФРГ, Кітая, Польшчы, Румыніі...



Станіслаў Шушкевіч і генеральны сакратар ЦК КПК Цзян Цзэмін. Пекін, 1993 год

Не застаецца па-за ўвагай і так званае блізкае замежжа — былыя савецкія рэспублікі. У той час як працягваюць бязлітасна знішчаць адзін аднаго армяне і азербайджанцы, калі не сціхае дыпламатычная перастрэлка паміж Расіяй і краінамі Балтыі, калі спрэчкі за Чарнаморскі флот і ядзерныя боегалоўкі раз-пораз напаляюць да крытычнай тэмпературы стасункі паміж Масквой і Кіевам,— Беларусь упэўнена мацуе ўзаемаразуменне з суседзямі.

Удалося дамовіцца з Расіяй, каб яна хутчэй, чым меркавалася, ачысціла беларускую зямлю ад ядзерных ракет. Адна з сустрэч Шушкевіча з Леанідам Краўчуком адбылася на поўдні Беларусі, на Гомельшчыне, дзе, як высветлілася толькі ў наш час, загінуў на савецка-германскім фронце і быў пахаваны бацька ўкраінскага прэзідэнта. Вось так, бывае, і асабісты душэўны боль яшчэ раз нагадвае пра перапляценне гістарычных лёсаў двух народаў...

Таксама цесна перапляла гісторыя лёсы беларусаў і літоўцаў. Як вядома, у часы сярэднявечча яны жылі ў адзінай дзяржаве — Вялікім княстве Літоўскім. У



Станіслаў Шушкевіч і Леанід Краўчук у Акцябрскім раёне



Вітаўтас Ландсбергіс наведаў парламент Беларусі

апошнія гады гісторыкі дзвюх рэспублік разгарнулі зацятую палеміку: кожнаму боку хочацца давесці, што менавіта ягоны народ дамінаваў у жыцці княства. Не абмінула спрэчка і тэрытарыяльную праблему... З падобных спрэчак, дарэчы, некалі пачыналася карабахская трагедыя. Лідэрам Літвы і Беларусі ўдалося паразумецца, канстатаваць узаемную адсутнасць тэрытарыяльных прэтэнзій, дамовіцца аб сумесным клопаце пра інтарэсы беларускіх літоўцаў і літоўскіх беларусаў. Станіслава Шушкевіча цёпла вітаў Вільнюс, Вітаўтаса Ландсбергіса і Альгірдаса Бразаўскаса — Мінск.

...Няўрымслівыя крытыкі не аднойчы за гэты час патэтычна ўсклікалі: «У рэспубліцы няма сапраўднай канцэпцыі знешняй палітыкі! Мы плывём без руля і без ветразяў!» Што ж, маладая беларуская дыпламатыя і сапраўды яшчэ шмат чаму вучыцца, што-кольвечы спасцігае на памылках. Але і таго, што на нас не глядзяць спадылба суседзі, што Беларусь прыкмецілі — і здаецца, не з горшага боку — у свеце, для пачатку, бадай, не так ужо і мала.

* * *

У гэты самы час Шушкевіч паспеў даволі паездзіць і па Беларусі — Барысаў, Орша, вёскі Магілёўшчыны... І хоць падчас публічных сустрэч вострыя пытанні сыпаліся як з мяшка, звычайна зала праводзіла Старшыню воплескамі.

Часам даводзілася твар у твар сутыкацца з палітычнымі антыподамі, якія не выбіралі дыпламатычных выразаў...

Так, аднойчы, на самым пачатку сустрэчы з афіцэрамі-вайскоўцамі, бы Піліп з канапель, выскачыў наперад маёр з палаючымі лютасцю вачыма. Ён абрынуўся з праклёнамі за «развал» Саюза і адзінай савецкай арміі: там, маўляў, так выдатна служылася, а вось цяпер, калі вайскоўцы трапілі пад юрысдыкцыю Беларусі, усё дрэнна... Назваўшы белавежскае пагадненне здрадай, маёр закончыў філіпіку пагрозлівым рытарычным пытаннем:

— А вам вядома, што заўсёды рабілі са здраднікамі на Русі?!

— Пачнём з таго, што вы не на Русі, а ў незалежнай Беларусі,— спакойна заўважыў Шушкевіч.

Выслухаўшы іншых афіцэраў (больш ніхто з іх не дазволіў сабе хамства, але пра свае шматлікія праблемы — і прафесійныя, і бытавыя — кожны гаварыў з болем, а то і крыўдай), Старшыня ўзяў слова. У яго

не было напісанага тэксту, але выступ прагучаў фантастычна бездакорна і пераканаўча — на гэтай думцы сышліся потым усе журналісты, што былі ў зале.

Шушкевіч на канкрэтных лічбах паказаў, да якой неверагоднай ступені перанасычана Беларусь войскам і ўзбраеннямі. «Людзей з ружжамі» прыпадае тут на душу насельніцтва прыкладна ў пяць разоў болей, чым гэта лічыцца нормай у цывілізаваных краінах! Вось вынік старой, імперскай ваеннай дактрыны, і рэспубліцы такія каласальныя ўзброеныя сілы зусім не патрэбны. Можна было б проста адправіць лішніх вайскоўцаў на ўсе чатыры бакі... «Беларусь і не прэтэндавала б на тое, каб браць пад сваю юрысдыкцыю ўсё войска на яе тэрыторыі,— зазначыў Шушкевіч.— Але ж чые вы тады будзеце? Каму станеце прад'яўляць прэтэнзіі?»

Шмат хто з афіцэраў у зале, бадай, упершыню асэнсаваў гэтую элементарную, здавалася б, ісціну. Саюза ўжо няма, ад савецкай арміі засталіся толькі пагоны з зорачкамі, і трэба ацаніць высакародства беларусаў, што разумеюць драму людзей, якіх службовы лёс сюды закінуў... Разумеюць — і як могуць дзеляцца жытлом, прадуктамі, усім, чаго і так небагата. Утрыманне войска ды змаганне з чарнобыльскай бядою «з'ядаюць» аж чвэрць рэспубліканскага бюджэту... І ўсё ж беларускае кіраўніцтва дало афіцэрам досыць часу, каб падумаць, ці гатовы яны прыняць прысягу на вернасць рэспубліцы, вырашыла скарачаць войска плаўна, па магчымасці бязбольна для лёсу службоўцаў, прадугледзела шэраг захадаў, якія ў бліжэйшы час падмацуюць матэрыяльна-бытавое становішча людзей у пагонах...

У канцы сустрэчы ўзняўся хтосьці з афіцэраў:

— Даруйце нам, Станіслаў Станіслававіч, за таго маёра...

А праводзілі Шушкевіча стоячы, пад дружныя воплескі.

Вядома, наіўна было б меркаваць, што гэтая сустрэча як рукой здыме вайсковыя праблемы. Працэс стварэння беларускага войска — сучаснага, кампактнага, заснаванага на прынцыпах выключна абарончай дактрыны і, што надзвычай важна, шчыра адданага народу гэтай зямлі — будзе натыкацца не толькі на бюджэтныя цяжкасці, але і на ўпартае супраціўленне тых высокіх чыноў у мундзірах, што так і не змогуць пазбавіцца тугі па часах імперыі. А хто-кольвечы будзе муціць ваду не з-за ідэйных перакананняў, а проста таму, што за час вайсковага бязладдзя прызвычаіўся грунтоўна

ўладкоўваць свой «суровы» быт за кошт казённай маёмасці ды дармавой салдацкай працы.

І ўсё ж надыдзе дзень, калі над урачыстым строем залунаюць словы клятвы на вернасць народу Беларусі. Прысягу прымуць практычна ўсе афіцэры. Беларускае войска пачне сваю гісторыю. І дай Божа, каб яму заўсёды даводзілася страляць толькі на палігонах.

* * *

Хіба ж не нонсенс: руплівы народ, спрадвеку прызвычаены да сёмага поту шчыраваць на ніве, сёння не можа як след сябе пракарміць?

Сталін, гвалтам зганяючы сялян у калгасы, абяцаў краіне прадуктовы рай. Сёння нашыя суайчыннікі душацца ў чэргах за дрэннай каўбасой і намазваюць на скібкі заморскае «гуманітарнае» масла.

Сталінская мадэль калектыўнага гаспадарання на зямлі пацярпела фіяска. Перш за ўсё таму, што не стала сапраўднага гаспадара.

Вядома, бязглузда было б заклікаць сёння да бязлітаснага руйнавання калгасна-саўгаснага ладу. На гэтым ужо апякліся суседзі беларусаў — літоўцы. Але тое, што гранічна неабходна даць на вёсцы прастору прыватнай ініцыятыве,— бясспрэчна... Логіка ж эканамічнага развіцця ўсё расставіць па сваіх месцах...

Такія ці прыкладна такія меркаванні Шушкевіча шмат разоў за апошнія гады гучалі ў самых розных аўдыторыях.

Здавалася б, якія могуць быць пярэчанні супраць аргументаванай і памяркоўнай праграмы пераўтварэнняў у аграрным сектары?

Аказалася, могуць. Сістэма сфарміравала слой аграрных начальнікаў, якім надзвычай па сэрцу сталася роля ўсемагутных, непадзельных валадароў сваіх «латыфундый». Каб яшчэ нейкія там фермеры вока мазолілі?! А калі заўтра ўсе фермерамі стаць захочуць?

Вось гэта і палохала болей за ўсё. Калі кожны пачне гаспадарыць на ўласнай зямлі і на свой розум, што застанецца рабіць аграрнаму «правадыру» з усёй ягонай канторай? Кім камандаваць?

Маючы прыкметную моц у парламенце, апалагеты татальнага калгасна-саўгаснага ладу не шкадавалі высілкаў, каб «забадаць» ці хоць знявечыць ненавісныя ім законапраекты. З вялікімі цяжкасцямі, у пашкуматаным выглядзе ўбачыў свет закон аб фермерскай гаспадарцы. Ён яшчэ не даваў права прыдбаць зямлю, а толькі дазваляў атрымаць надзел у асабістае кары-



Станіслаў Шушкевіч з сынам фермера.
Барысаўскі раён, 1992 год

станне. Але ж і дзеля гэтага трэба ісці на паклон да мясцовых «князькоў»! Адусюль да Шушкевіча паляцелі слёзныя скаргі: учыняецца суцэльны здзек! Ці ўвогуле адмаўляюць у зямлі, ці даюць такія пусткі, дзе сто гадоў нічога не вырасце... І нават калі ўчастак выдзелены, у арсенале «князька» застаецца багата дзейсных метадаў, каб той небарака, што рызыкнуў падацца ў фермеры, хутка згадаў прымаўку дзядоў наконт Маркі, што трапіў у пекла.

У адным з газетных інтэрв'ю Шушкевіч эмацыянальна назваў гэтых адыёзных ваяроў за старыя парадкі на вёсцы «чырвонымі памешчыкамі». Які ўзняўся вэрхал! Ледзь ці не ўвесь корпус калгасных старшынь і саўгасных дырэктараў палічыў гэта за страшэнную абразу свайго гонару. Група разгневаных аграрных начальнікаў пагражала нават падаць на Старшыню Вярхоўнага Савета ў суд...

Сапраўдны бой давялося вытрымаць Шушкевічу і падчас абмеркавання законапраекта аб праве ўласнасці

на зямлю, які абяцаў даць дадатковы штуршок прагрэсіўным пераўтварэнням на вёсцы, падтрымаць фермерства. Ягоныя праціўнікі імкнуліся любой цаной замацаваць у законе тэзіс аб калектыўнай уласнасці. Пры слове «прыватная» шмат каго з іх аж трэсла...

«Калектыўную ўласнасць» высмакталі з пальца першнаперш для таго, каб затлуміць мазгі простым калгаснікам, сыграць на недасведчанасці многіх з іх у юрыдычнай сутнасці праблемы. Людзей сталі палохаць: раз Шушкевіч супраць калектыўнай уласнасці, значыць, наважыўся ў імгненне вока разагнаць усе калгасы і зрабіць вас жабракамі... Быў нават выпадак, калі масу збітых з панталыку вяскоўцаў з шэрага раёнаў арганізавалі, пасадзілі ў адмыслова заказаныя аўтобусы і накіравалі ў Мінск — пратэставаць, давіць Старшыні на псіхіку. Многія з удзельнікаў той «акцыі пратэсту» нават і не падазравалі, што пра калектыўную ўласнасць не згадваецца і ні ў адным з існуючых законаў...

Напрыканцы 1992-га, калі Шушкевіч ездзіў па Магілёўшчыне, у адной з вёсак на яго заўзята насеў дырэктар мясцовай гаспадаркі, імкнучыся даказаць, што без калектыўнай уласнасці на зямлю аграрнаму сектару — труба...

— Прабачце, а што вы разумееце пад калектыўнай уласнасцю?

— Ну, вядома ж, што — калгасы!

— Дык а хіба ж калгас карыстаецца не дзяржаўнай зямлёю?

Дырэктар напачатку сумеўся, а потым вырашыў ударыць пад дых: маўляў, можа ў ядзéрнай фізіцы, Станіслаў Станіслававіч, вы і вялікі знаўца, а вось у сельскіх праблемах, відаць, не вельмі...

Шушкевіч парыраваў імгненна:

— Ведаеце, ва ўсякім разе, заўсёды адрозню карову ад свінні.

Падчас сваіх паездак па рэспубліцы Старшыня як мог тлумачыў людзям, што ідзе несумленная гульня... Вось што казаў ён, выступаючы ў Горацкай сельгасакадэміі ў снежні 1992-га:

— У сучасны момант у нас ёсць толькі дзяржаўная ўласнасць на зямлю. І пра гэта забываюцца не толькі простыя людзі, але і вельмі адукаваныя прафесары і акадэмікі. І калі я выступаю супраць калектыўнай уласнасці на зямлю па адной простай прычыне — я не ведаю, што гэта такое, то яны пачынаюць сцвярджаць, што я супраць калгасаў і саўгасаў. Але ж гэта не так! У нас ніколі не было калектыўнай уласнасці на зямлю,

але калгасы і саўгасы існавалі. Існуюць яны і зараз. І ніхто ім не пагражае. Іншая справа, што калі чалавек хоча, каб яго гаспадарку ніхто не адабраў, не зруйнаваў, то патрэбна заканадаўчае забеспячэнне яго інтарэсаў... Таму нам трэба разглядаць дзве формы ўласнасці: дзяржаўную і прыватную.

...Доўгая, вострасюжэтная барацьба вакол гэтага закона закончылася ў чэрвені 1993-га поўнай перамогай Шушкевіча і ягоных аднадумцаў. У выніку «калектыўную ўласнасць» без слёз пахавалі нават тыя парламентарыі, што напачатку, здавалася, гатовыя былі самі легчы за яе касцьмі.

* * *

Але трыўмфаваць даводзілася далёка не так часта, як хацелася б.

Ва ўпартую, знясільваючую і малапрадукцыйную барацьбу палярных падыходаў вылілася абмеркаванне праекта новай Канстытуцыі рэспублікі. З тым, што старая, створаная ў часы непадзельнага панавання камуністычнага рэжыму, стала анахранізмам, не мог спрачацца ўжо ніхто. Але на гэтым кансенсус і скончыўся...

Кансерватары цвёрда паставілі сабе на мэце працягнуць у новы Асноўны Закон максімум палажэнняў, што дазволілі б зберагчы, а то і ўмацаваць далёка не разбураны яшчэ падмурак Сістэмы. У трохі больш моднай абгортцы падсоўваўся той самы заляжалы тавар...

Для прыхільнікаў жа рашучай ломкі старога ладу цяжкасць была яшчэ і ў тым, што ідэолагі Сістэмы, трэба аддаць належнае, навучыліся спрытна маніпуляваць лозунгам сацыяльных гарантый. Люмпенская псіхалогія «роўнасці ў беднасці» пусціла, на жаль, глыбокія карані у масавай свядомасці. Шмат хто прызвычаіўся да гэтага сурагату сацыяльнага шчасця: практычна незалежна ад тваіх здольнасцяў і ступені працоўнай аддачы дзяржава забяспечвае заробак, якога хапае, ва ўсякім разе, на танную каўбасу і піва; дзяржава раней ці пазней дае хай сабе і не надта ўтульнае, аднак жа бясплатнае жытло... Кідаючы гэтыя косткі, кіруючая эліта Сістэмы ўзрошчвала бяздумную пакорлівасць, адсякала масу простага люду ад палітыкі, атрымлівала магчымасць бесперашкодна правіць свой баль у высокіх дзяржаўных сферах.

Прыкрываючыся той самай дэмагогіяй, «старая гвардыя» імкнулася захаваць сваё становішча і ў новых,



Палітычная ідылія

посткамуністычных умовах. Жорсткае супраціўленне прагрэсіўнаму варыянту новай Канстытуцыі, радыкальным эканамічным рэформам матывавалася «клопатам пра абарону інтарэсаў народу». Сапраўды, няцяжка заваяваць лаўры адважнага ваяра за гэтыя інтарэсы, дамагаючыся ў парламенце папулісцкіх рашэнняў, якія ў выніку канчаткова спустошаць і без таго дзіравую казну... Калі ж высветліцца, што грошай на абяцаныя людзям «пернікі» няма адкуль болей браць, усіх сабак можна павесіць на ненавісных палітычных сапернікаў: маўляў, гэта іх рэфарматарскі сверб давёў эканоміку да калапсу...

Шушкевіч, хоць і не аднойчы падпадаў пры гэтым пад агонь папулісцкай крытыкі, настойліва даводзіў і ў парламенце, і на тэлебачанні, і ў друку бясспрэчную для яго ісціну: далейшая эксплуатацыя старога казарменна-размеркавальнага механізму — гэта варыянт тупіковы; усе прыгожа сфармуляваныя гарантыі застануцца на паперы, калі знясіленая, выпрацаваўшая свой каманднa-адміністрацыйны рэсурс эканоміка не рушыць наперад па новых, рыначных рэйках, калі месца люмпенскай псіхалогіі ўтрыманства не зойме псіхалогія здаровай канкурэнцыі... Мадэрнізаваная ж эканоміка, моцная і дынамічная, якраз і дазволіць найлепей падтрымаць старых, інвалідаў, беспрацоўных, шматдзетных — усіх тых, хто не ў стане на роўных канкурыраваць за месца пад сонцам.

Новая сістэма сацыяльных арыенціраў пачне пакрысе замацоўвацца ў масавай свядомасці. Хоць сілы рэваншу яшчэ не аднойчы паспрабуюць разыграць сваю карту, спекулюючы на рэштках старой псіхалогіі і эканамічных цяжкасцях. Адновіць сваю дзейнасць на Беларусі камуністычная партыя. Парламент дасць на гэта афіцыйны дазвол, безумоўна, без вяртання партыі ранейшых уладных прывілей і маёмасці. За гэтае рашэнне выкажацца і Шушкевіч, матывуючы тым, што ў паслядоўна дэмакратычным грамадстве права на аб'яднанне павінны мець людзі любых поглядаў, калі толькі яны не заклікаюць да гвалту. За гэта яму добра перападзе ад апазіцыі, а адзін радыкальны журналіст напіша нават, што Шушкевіч такім чынам здрадзіў памяці бацькі, які столькі пацярпеў ад камуністычнага рэжыму... І ўсё ж пазіцыя Старшыні на гэты конт застанецца непахіснай. У ролі спікера на пасяджэннях ён не аднойчы будзе рашуча ахалоджваць імпэт тых выступоўцаў-антыкамуністаў, што дазволяць сабе надта ўжо абразлівыя выпады супраць палітычных супастатаў.

Камуністы, аднак, не сталі плаціць яму за гэта гарачымі пачуццямі. Ды і ад заклікаў на барыкады духоўныя нашчадкі бальшавікоў утрымацца не змаглі. А ў іх газетках раз-пораз пачалі з'яўляцца злосныя карыкатуры на Шушкевіча. Пераважна — даволі безгустоўныя, прымітыўныя. Шушкевіч паставіцца да іх па-філасофску, а часам, убачыўшы больш-менш прыстойны ў мастацкіх адносінах твор, будзе канстатаваць амаль што з задавальненнем:

— А што, на гэты раз нават прыгажэй, чым на самой справе...

Што ж, камуністы таксама скарысталі плады дэмакратычнага дрэва: у часы іх панавання падобныя жартачкі па адрасу кіруючых асоб напрасткі прывялі б на лагерныя нары...

А ўвогуле новыя камуністычныя правадыры не здолеюць пахваліцца масавасцю сваіх мітынгаў. Слухаць іх прамовы будуць звычайна толькі невялікія купкі пераважна старых людзей. Характэрны штрых: добра ўсведамляючы «папулярнасць» камуністычных лозунгаў у масах, пад сцягі партыі не рызыкне афіцыйна вярнуцца практычна ніхто з высокапастаўленых чыноўнікаў. Іншая справа, што мысленне многіх з іх застанецца па сутнасці ранейшым. І тарпедаваць рэформы яны будуць пры любой зручнай магчымасці.

Што, дарэчы, самым непасрэдным чынам адаб'ецца і на лёсе канстытуцыйнага праекта.

Недзе ў маі—чэрвені 1993-га Шушкевічу стане зразумела: амаль што трохгадовая праца над праектам канчаткова забуксавала. Пасля чарговага раунду практычна безвыніковых парламенцкіх спрэчак дакумент зноў і зноў даводзілася адкладваць убок. Чыста арыфметычны прагрэс, здавалася б, назіраўся — да сярэдзіны 1993 года ўдалося прыняць галасаваннем крыху болей за палову артыкулаў (хоць часам даходзіла да анекдота: з першай спробы не змаглі прагаласаваць нават назву — «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь»). Але гэта былі пераважна дэкларатыўныя артыкулы, што тычыліся, у прыватнасці, правоў чалавека. (Сталінская Канстытуцыя, дарэчы, таксама была шчодрая на прыгожыя дэкларацыі, што не перашкодзіла скручваць народ у бараноў рог...). Калі ж справа дайшла да палажэнняў, закліканых вызначыць прынцыповыя рысы сістэмы ўлады,— бакі схліснуліся не на жыццё, а насмерць. У штыкі была прынята вылучаная дэмакратамі ідэя цалкам прафесійнага парламента, у якім ужо немагчыма было б мець крэсла, адначасова захоўваючы



У перапынку паміж пасяджэннямі з віцэ-спікерам Вячаславам Кузняцовым

высокі чыноўніцкі пост. Парламенцкая большасць некалькі разоў мяняла стаўленне да прапануемага інстытута прэзідэнцтва — у залежнасці ад таго, наколькі моцнымі пачуваліся на той ці іншы момант шанцы яе патэнцыяльнага кандыдата на прэзідэнцкае крэсла... Кансерватарам удалося выкрасліць з праекта палажэнне аб прамых выбарах кіраўнікоў мясцовых адміністрацый.

А ўвогуле стала выразна бачна, што большасць узяла на ўзбраенне элементарную тактыку зацягвання часу, каб па магчымасці даўжэй пратрымацца ў крэслах, аддаліць наступныя выбары. Бо на іх, нягледзячы на ўсе хітрыкі, можна і «праляцець», а пакуль што дэпутацкі мандат дае магчымасць разжыцца такімі-сякімі дабротамі на чорны дзень. Карацей, пасля нас — хоць патоп...

Канчаткова ўпэўніўшыся, што з гэтым складам Вярхоўнага Савета прыняць дастойную Канстытуцыю немагчыма, Шушкевіч летам 1993-га пачаў настойліва прапагандаваць ідэю Канстытуцыйнай асамблеі, куды б

увайшлі новыя, адмыслова выбраныя народам людзі, закліканыя разумна і энергічна зрабіць толькі адну, але найважнейшую справу — стварыць прагрэсіўны, цывілізаваны Асноўны Закон. І хоць Старшыня старанна падкрэсліваў, што статут асамблеі ні ў якім разе не дазволіць ёй зрабіць замах на іншыя прэрагатывы парламента, прадстаўнікі дэпутацкай большасці імгненна абвінавацілі Шушкевіча ў намеры «падкапацца» пад існуючы Вярхоўны Савет.

* * *

Крызіс улады на Беларусі нарастаў. Процiборства старых і новых тэндэнцый уваходзіла ў рашаючую фазу.

У палітычнай атмасферы рэспублікі ўсё мацней павявала навальніцай.

# ПОДЫХ НАВАЛЬНІЦЫ

Навальніца грымнула на ўсю моц акурат у сярэдзіне 1993-га.

З хмараў, што няўмольна згушчаліся над Старшынёю ў папярэднія месяцы, вырваліся ў той дзень дзесяткі маланак непрыхаванай варожасці, абрынуўся нябачаны град найцяжэйшых абвінавачванняў і проста абраз.

Які вецер і з якога боку нагнаў тыя грозныя хмары, усім было добра зразумела. Парламенцкая большасць апошнім часам перад тым ужо не хавала сваіх намераў: гэты чалавек павінен быць змецены са старшынёўскай пасады любым чынам, любой цаной.

Уключыць у парадак дня пытанне аб адстаўцы Шушкевіча ягоным праціўнікам, аднак, не ўдалося. Тады вырашылі скарыстаць абходны манеўр: на галасаванне паставілі пытанне аб даверы Старшыні.

* * *

...Прыкладна за паўгода да таго падчас адной з сустрэч Шушкевічу сярод іншых задалі і пытанне наконт жонкі: якога, маўляў, роду-племя?

Ён адказаў: з вайсковай сям'і, напалову руская, напалову ўкраінка. І жартам дадаў прыблізна такую фразу: калі здарыцца нешта накшталт дзяржаўнага перавароту, то можна прасіць палітычнага прыбежышча на любой з дзвюх яе гістарычных радзім — на выбар...

Зала ацаніла гумар дабрадушным смехам: каб на нашай ціхай Беларусі ды нейкія перавароты...

Тое, што адбудзецца ў беларускім парламенце праз паўгода, дэмакратычныя сілы кваліфікуюць менавіта як спробу дзяржаўнага перавароту.

Не, на мінскіх вуліцах не заляскалі гусеніцамі баявыя машыны пяхоты, у Авальную залу парламента не ўрываліся аўтаматчыкі ў касках... Але ў тым, што дэпутацкая большасць распачала, мовячы па-вайсковаму, «агонь на знішчэнне» — на палітычнае



Парламенцкая большасць атакуе

знішчэнне свайго непрыяцеля — сумненняў не заставалася. І ў тысяч, дзесяткаў тысяч людзей, што прыпалі тады да радыёдынамікаў, адчуванне было зусім такое ж, як у тыя хвіліны жніўня 1991-га, калі самыя лютыя ваяры за ідэалы Сістэмы, пайшоўшы па-банку, узнялі ў краіне пракамуністычны путч.

* * *

Той путч праваліўся. Праваліўся 1 ліпеня 1993-га і раз'юшаны наступ парламенцкай большасці ў Авальнай зале.

У выніку галасавання недавер Старшыні выказалі 166 дэпутатаў. Арганізатарам акцыі не хапіла васьмі галасоў, каб атрымаць абсалютную перавагу, што развязала б рукі для бязлітаснага маральнага ціску на Шушкевіча з той самай запаветнай для ягоных праціўнікаў мэтай — змусіць Старшыню да адстаўкі.

Па-першае, тым, хто хацеў нанесці знішчальны ўдар, па розных прычынах не ўдалося сабраць тады ў парламенцкай зале ўсе надзейныя сілы: хто быў у адпачынку, хто ў камандзіроўцы...

Па-другое, яшчэ раз прадэманстравала ўдалую тактыку выступіўшая на баку Шушкевіча апазіцыя. Яна



Падказкі не будзе...

не толькі сама адмовілася галасаваць, але і пераканала «выйсці з гульні» каго-кольвечы з дэпутацкага «балота». Кворум стаў мінімальным, і дастаткова было некалькіх сапсаваных бюлетэняў, каб з задумы агрэсіўнай групоўкі атрымаўся пшык... Так яно ўрэшце і сталася. Менавіта восем (!) бюлетэняў былі палічаны несапраўднымі. (Апазіцыйная газета «Свабода» з'едліва сцвярджала потым, што падчас перапынку перад галасаваннем хто-ніхто з атакаваўшай брацii паспеў занадта пазаліхвацку адзначыць з келіхам у руцэ немінучую, як уяўлялася, перамогу).

Карацей, ініцыятарам галасавання заставалася ў той дзень толькі кусаць локці.

* * *

Што ж, горшага не адбылося. Але ці нагода гэта, каб лунаць у эмпірэях?

З аднаго боку, тыя, каму давялося пакуль што пакусаць локці, зусім не збіраюцца складаць зброю. На наступнай сесіі іх ударны кулак можа стаць больш масіўным.

З другога боку, прад'явіла свой рахунак апазіцыя. Яна выразна дала зразумець, што цяпер спадзяецца заўжды бачыць Старшыню толькі пад сваім сцягам.

Зноў, які ўжо раз,— між молатам і кавадлам. І прасторы для кампрамісаў, здаецца, не засталося.

* * *

А між тым менавіта на кампраміс была зроблена стаўка ў верасні 1991-га, калі Шушкевіча абралі Старшынёю Вярхоўнага Савета.

Парламенцкая большасць была дэмаралізавана правалам пракамуністычнага путчу. Каму-кольвечы мроіліся ўжо астрожныя краты... Таму ранейшага Старшыню — Мікалая Дземянцея — «здалі» практычна без супраціўлення. І разумелі: нікому са «старой гвардыі» кіраўнічае крэсла ў парламенце ў такіх варунках не «свеціць». Апазіцыя, натхнёная падтрымкай «вуліцы» (а большасць народу не хавала сваёй зларадпасці з тае нагоды, што нахабным партбосам далі нарэшце як след у нюхаўку), выціскала максімум са спрыяльнай сітуацыі, дамаглася шэрага рашэнняў, якія незадоўга да таго здаваліся проста фантастычнымі (прыпыненне дзейнасці рэспубліканскай кампартыі, канстытуцыйнае замацаванне незалежнасці Беларусі!),— але і яна, апазіцыя, у сваю чаргу разумела, што, нягледзячы на ўсё, яе моцы ў парламенце недастаткова, каб паставіць на чале Вярхоўнага Савета кагосьці са сваіх прызнаных лідэраў.

Вось тады позіркі бакоў і скрыжаваліся на фігуры Шушкевіча... У пэўнай ступені паўтарылася сітуацыя, калі яго выбралі намеснікам Старшыні.

Праз некалькі месяцаў, у снежні 1991-га, Вярхоўны Савет Беларусі практычна аднагалосна адобрыў рызыкоўны крок, зроблены Шушкевічам у Белавежскай пушчы.

Гэта быў час ягонага палітычнага трыумфу — такой аднадушнасці, шчыра кажучы, ён і сам не чакаў.

Недасведчанаму назіральніку магло б здацца, што ўсё ідзе, кажучы афіцыйнай мовай, «у канструктыўным накірунку». Можна, як высвятляецца, знаходзіць рашэнні, за якія дружна галасуюць тыя, хто прызвычаіўся глядзець адзін на аднаго скасавурана.

Час, аднак, паказаў, што тое адзінства было ілюзорным.

Кансерватары, галасуючы за белавежскае пагадненне, разлічвалі ператварыць Беларусь у рэліктавы запаведнік Сістэмы.

Дэмакратычная плынь марыла пра пабудову вольнай, цывілізаванай дзяржавы, дзе будуць рашуча разбураны рэшткі таталітарызму і ўсталюецца дынамічная рыначная эканоміка.

Шушкевіч ніколі не адчуваў духоўнай роднасці з

парламенцкай большасцю. Аднак ён мусіў канстатаваць, што дэмакратычная апазіцыя ў многіх выпадках грашыць дылетантызмам, наіўнай верай у спрошчаныя «цудадзейныя» рэцэпты, рэцыдывамі неабальшавіцкай псіхалогіі. У інтэрв'ю беларускай службе радыё «Свабода» ў жніўні 1992-га Шушкевіч, аддаўшы належнае высілкам апазіцыі, скіраваным на нацыянальна-дэмакратычнае адраджэнне беларускага грамадства, разам з тым падкрэсліў: «Я ніколі не прысягаў Беларускаму народнаму фронту... Я не магу падзяліць падыходы, калі людзі ўносяць у грамадства азлабленне, супрацьстаяць вялікія натоўпы людзей адзін другому... І дазвольце мне мець сваю думку...».

Цяжка сказаць, чаго ў гэтай заяве было болей — канстатацыі сапраўдных разыходжанняў у поглядах ці проста тактычных меркаванняў.

Народны дэпутат Беларусі Аляксандр Сасноў зазначыць пазней у адным са сваіх артыкулаў: «...устаць на бок большасці яму не дазвалялі перакананні, зрабіць жа стаўку на апазіцыю ён не мог, бо выпрабаваныя клакёры большасці хутка паказалі б яму хто ёсць хто. Трэба аддаць Шушкевічу належнае: амаль два гады яму, хоць і цаною вялікіх страт, удавалася балансаваць паміж Сцылай апазіцыі і Харыбдай большасці».

* * *

Між тым эканоміка рэспублікі ўвесь гэты час працягвала калапсаваць.

За эканоміку перш за ўсё адказвае, безумоўна, урад. У дэмакратычных колах беларускі ўрад быў увянчаны стойкім эпітэтам — «пракамуністычны». Многія ключавыя пасады там занялі былыя «адказныя работнікі» КПБ. Адна за адной цярпелі крушэнне ўрадавыя праграмы «аздараўлення» эканомікі, заснаваныя на старых адміністрацыйна-камандных метадах кіравання, толькі трохі закамуфляваных рынкачнай тэрміналогіяй.

Разам з тым урад, узначальваемы Вячаславам Кебічам, здолеў узяць у свае рукі гіганцкія паўнамоцтвы. Вось якое меркаванне выказаў напрыканцы 1992-га карэспандэнт маскоўскай «Независимой газеты»: «Спікер (маецца на ўвазе Шушкевіч.— Аўт.), які зрабіў стаўку на павышэнне свайго рэйтынгу ў радавых выбаршчыкаў, верагодна, спадзеючыся на ўсеагульныя прэзідэнцкія выбары, апынуўся ў пройгрышы. Яго абышла «каманда» Кебіча, якая здолела ўзяць у свае рукі асноўныя рычагі рэальнай улады: прэсу, войска, адносную большасць у парламенце.



У шахцёраў Салігорска

Кебіч — па сутнасці адзіны палітык у рэспубліцы, за якім стаіць добра зладжаная, падабраная па прынцыпах асабістай адданасці «каманда», рэкрутаваная цалкам з былой наменклатуры». Прыкладна ў той самы час англійскі часопіс «Эконаміст» канстатаваў: «Камандная эканоміка не знікне на Беларусі без барацьбы. Яе бюракраты змагаюцца за апошні кавалачак чырвонай стужкі».

* * *

Трэба было тэрмінова зваліць на каго-небудзь віну за эканамічныя правалы. Вядома ж, нават калі ў кулеш сцерці выбраную ахвяру, тавараў на паліцах крамаў болей не стане. Але ж галоўнае — выйграць час, адцягнуць увагу. А там — ці на пенсію, ці на цёплае месцейка ў прыватнай фірме, прадбачліва прыгрэтай за кошт дзяржаўнай маёмасці...

Мелася і іншая, нават больш сур'ёзная падстава, каб атакаваць Шушкевіча.

Як там ні было б, але і ў складаных, драматычных варунках, пры жорсткім супраціўленні парламенцкай большасці, рэфарматарская плынь беларускіх дэпутатаў здолела-такі сяго-таго дамагчыся. Скарыстоўваючы ціск грамадскай думкі, сваю перавагу ў эрудыцыі,

прамоўніцкім майстэрстве, гібкасці тактычнага мыслення — карацей, усе магчымыя спрыяльныя фактары, рэфарматары правялі цэлы шэраг рашэнняў, якія спакваля, пядзь за пяддзю, паглыблялі рэчышча для неабарачальных грамадскіх пераменаў. Апазіцыя, вядома ж, будзе лічыць, што гэтага замала, але іншы бок аднойчы прыйдзе да высновы: не, гэта ўжо занадта...

Замаячыла перспектыва масавай, справядлівай прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці. Пакрысе пайшло ў рост фермерства. Стала надзвычай папулярнай ідэя новай, дэмакратычнай сістэмы выбараў кіраўнікоў мясцовай улады. Пачалося адраджэнне беларускай духоўнасці, культуры, мовы... Карацей, народ стаў пакрысе распростваць плечы, радавыя грамадзяне адчулі, што яны могуць і павінны быць не «вінцікамі» Сістэмы, а гаспадарамі на сваёй Бацькаўшчыне.

А калі так, то ў хуткім часе большасць тых, хто прызвычаіўся ўсім камандаваць і ўсё размяркоўваць (вядома ж, не крыўдзячы і сябе), проста застануцца «па-за гульнёй».

Вось яны, адчуўшы, што глеба пачынае сплываць з-пад ног, і абрынулі ўсю сваю нянавісць да пераменаў на парламенцкага кіраўніка.

* * *

Пасля бурных падзеяў у парламенце, 2 ліпеня, Станіслаў Шушкевіч зазначыў на прэс-канферэнцыі, што, па сутнасці, толькі раскрылася сітуацыя, што існавала ўвесь час. «Шукаючы згоду,— сказаў Старшыня,— я ішоў па шляху павольнага рэфармавання... Але далей трэба рэфармаваць эканоміку. Эканоміку нельга рэфармаваць дэкларацыямі, а гэта ўжо закранае інтарэсы правіцеляў... Я стаў небяспечнай фігурай, я ўжо не прыкрываю, а неяк псую настрой».

Адкрыта выказаўся ён наконт падаплёкі таго, што адбылося, і ў інтэрв'ю БелаПАН, надрукаваным днём пазней: «Я зразумеў, што для большасці парламента важней не справа, а свая каманда. Калі на іх ціснуў страх, яны пагадзіліся з абраннем мяне на пасаду Старшыні Вярхоўнага Савета. Я тады ўспрыняў гэта як пошук імі ўзаемапаразумення. І пры такіх падыходах мы ўсё-такі многае зрабілі. Зараз жа пад уздзеяннем урадавага лобі вырашана, што я перашкаджаю ім панаваць».

Апазіцыя ў тыя самыя дні публічна заявіла, што «ў сённяшняй сітуацыі адхіленне С. Шушкевіча ад пасады азначала б неабмежаваную канцэнтрацыю ўлады і ўсіх

органаў кантролю за ўладай (у тым ліку і КДБ) у руках адной структуры — Савета Міністраў, палітыка якога не вызначаецца кампетэнтнасцю і дальнабачнасцю, клопатам пра дзяржаўную незалежнасць і доўгатэрміновыя інтарэсы». Апазіцыйны дэпутат Лявон Баршчэўскі выказаўся ў друку так: «Мы абаранялі не Шушкевіча. Сітуацыя была больш сур'ёзная, бо не пра Шушкевіча ішла размова. Фактычна стаяла пытанне пра лёс дэмакратыі, пра нашу незалежнасць... Ім трэба пасада Шушкевіча, каб узяць пад свой поўны кантроль усё: і КДБ, і знешнюю палітыку, і наступныя выбары...».

* * *

Фармальнай жа падставай для рашучага наступу на Шушкевіча была выбрана пазіцыя, занятая ім падчас дыскусіі аб мэтазгоднасці далучэння Беларусі да сістэмы калектыўнай бяспекі краін СНД. Гэтая дыскусія старанна распальвалася пачынаючы з сакавіка 1993-га. Шушкевіч, як і чакалася, адразу ж катэгарычна запратэставаў супраць далучэння да дагавора аб калектыўнай бяспецы, нагадаўшы, што Вярхоўны Савет заканадаўча канстатаваў у свой час імкненне рэспублікі да нейтралітэту і бяз'ядзернасці, абвясціў пра гэта на ўвесь свет...

І адразу ж па ім ударыла з усіх ствалоў загадзя падрыхтаваная цяжкая артылерыя.

Пазіцыю Шушкевіча з нумару ў нумар з усё большай апантанасцю крытыкавала падуладная ягоным апанентам прэса. Уступіла ў бой магутная кагорта прамысловых «генералаў» — кіраўнікоў тых індустрыяльных гігантаў, што дзесяцігоддзямі былі арыентаваныя на выгадныя ваенныя заказы Масквы. «Генералы» пачалі спекуляваць на цяжкасцях канверсіі, на страху рабочых іх прадпрыемстваў страціць свае месцы. На баку прыхільнікаў дагавора выступіла і шматлікая група розным шляхам ангажаваных палітолагаў, сацыёлагаў, экспертаў...

Шушкевічу заявілі, што ягоныя ўяўленні пра нейтралітэт безнадзейна састарэлі, што ад такой палітыкі, маўляў, ужо адыходзяць і класічна вядомыя ў гэтым сэнсе Швецыя ды Швейцарыя. Што калі не пайсці на ваенны саюз — перш за ўсё, безумоўна, з Расіяй,— то вялікая ўсходняя суседка вельмі пакрыўдзіцца і, бы муху, прыдушыць маленькую Беларусь эканамічна. І нарэшце, што ён, Шушкевіч, займаецца звычайным танным папулізмам і наўмысна застрашвае беларускіх мацярок прывідам цынкавых трун з целамі іх сыноў,



Саратнікі ці праціўнікі?

што могуць скласці галовы ў «гарачых кропках» СНД,— застрашвае, каб нажыць палітычны капітал для барацьбы за магчымую ў перспектыве на Беларусі пасаду прэзідэнта. Але народ, маўляў, усё добра разумее і, безумоўна ж, у масе сваёй за ваенны саюз з Масквой.

Шушкевіч прапанаваў: давайце сапраўды даведаемся пра думку простага люду, давайце вынесем пытанне аб дагаворы на рэферэндум! І дадаў: калі высветліцца, што большасць народу думае на гэты конт не так, як я,— падаю ў адстаўку...

На слова «рэферэндум» праціўнікі Шушкевіча адрэагавалі прыблізна так, як рэагуе на чырвоную анучу раз'юшаны бугай. Годам раней парламенцкая большасць паспяхова пахавала ўжо ідэю аднаго рэферэндуму, прапанаванага апазіцыяй. Цяпер гэтая большасць вырашыла «пахаваць» Старшыню.

Аднак трэба было знайсці нейкую зачэпку. Бо зусім ужо абсурдна здымаць парламенцкага кіраўніка толькі за тое, што ён адважыўся мець уласную думку па спрэчнай праблеме. Ды і выступаць з ініцыятывай рэферэндуму — ягонае законнае права. Так, ён не хавае спадзявання, што народ у рэшце рэшт скасуе ініцыятыву апалагетаў калектыўнай бяспекі, але ж пакуль што выканаў волю парламенцкай большасці — падпісаў адпаведны дагавор.

І тады — а што яшчэ заставалася? — прычапіліся да... формы, у якой тое было зроблена. Яна, гэтая форма, ніяк не рэгламентавалася. Шушкевіч выбраў такі

варыянт: разаслаў кіраўнікам краін — удзельніц сістэмы калектыўнай бяспекі ліст, дзе канстатавалася падпісанне адпаведнага дагавора і Беларуссю.

Вось тут і ўзняўся вэрхал: Старшыня хітруе, падманвае, усё несапраўдна, трэба было ставіць подпіс на самім дакуменце! Дарэмна стараўся Шушкевіч давесці, што такая працэдура не прадугледжана, што дакумент зачынены і ўзяты дэпазітарыем на адказнае захоўванне... Парламенцкая большасць, распаліўшы сябе да сапраўднай лютасці, ужо нічога не хацела чуць. За адным махам зрабілі Старшыню і галоўным віноўнікам эканамічнага крызісу: маўляў, усё гэта з-за ягонай некампетэнтнасці, ну і, вядома ж, з-за «злачыннага развалу Саюза» ў Белавежскай пушчы. А потым хто-кольвечы і ўвогуле адпусціў тармазы, перайшоўшы на звычайнае прымітыўнае хамства. Дарэмна дэпутат Станіслаў Бабачонак заклікаў апамятацца, не дэманстраваць, як ён выказаўся, узровень пячорнага чалавека. Дарэмна іранізаваў прадстаўнік апазіцыі Сяргей Навумчык: «Калі пасадзіць вельмі няздольных музыкантаў, то дай ім хоць Растраповіча, але Шапэна яны не сыграюць». Дарэмна іншыя парламентарыі-дэмакраты заклікалі прыслухацца да думкі народу.

...Калі 1 ліпеня 1993 года эмоцыі ў Вярхоўным Савеце дасягнулі апагею, адзін з самых зацятых нядобразычліўцаў Шушкевіча, палемізуючы з апазіцыяй, міжволі вымавіў сімвалічную па-свайму фразу:

— Пры чым тут народ?

* * *

Але народ усё адно сказаў у тыя дні сваё слова. Бязлітасны бой у Вярхоўным Савеце прыкаваў да радыёдынамікаў і тэлеэкранаў увагу тысяч і тысяч людзей па ўсёй Беларусі. Такой масавай і напружанай завочнай аудыторыі дэпутаты не мелі даўно... Простыя грамадзяне будуць не толькі слухаць — яны засыплюць Вярхоўны Савет градам лістоў і тэлеграм.

* * *

### З тэлеграм і лістоў тых дзён (канец чэрвеня — пачатак ліпеня 1993 года)

«Мы абураныя той наменклатурнай палітычнай гульнёй, што вядзецца часткай дэпутатаў ва ўгоду ўласным карпарацыйным інтарэсам... Спрабуюць наладзіць гэты палацавы пераварот, а самі няспынна ўзбагачаюцца за

народны кошт, будуючы сабе палацы-катэджы, дачы, прыхватызуюць за бясцэнак прадпрыемствы, дзяржаўную маёмасць, здзекуюцца над людзьмі, карыстаючыся сваёй беспакаранасцю...

Народныя дэпутаты Барысаўскага гарсавета: ГАЎРУСЕЎ, ШЧАРБІНІН, ХАРКОЎ, ЕШЧАНКА, СМАГІН, ПІШЧАЛАЎ, ШАРСТНЁЎ, КОРАЧКІН, КАЛЕНІК, КУДЗЕЙКА».

«Дэпутаты, не будзьце іудамі і не лічыце народ за дурняў, калі адхіліце Шушкевіча, будзе югаслаўскі варыянт. Пашкадуйце хоць сваіх дзяцей, калі не шкадуеце нашых.

Выбаршчык ІЛЬЯНКОЎ. Віцебск».

«Падтрымліваем Шушкевіча, выказваем недавер бальшавіцкаму Вярхоўнаму Савету.

ЛЯВОЦКАЯ, ЛЫСАК, ПОДКАС. Пінск».

«Спадары дэпутацкая большасць, народ верыць Шушкевічу больш, чым вам. Не ствараййце напружання, у выніку прайграеце вы і, на жаль, Беларусь.

Вадзім БАРШЧЭЎСКІ. Віцебск».

«Паважаны Станіслаў Станіслававіч, Вы на правільным шляху. Добрага здароўя, вытрымкі, мужнасці, так неабходных будучаму прэзідэнту. Наша пагарда агрэсіўнай большасці...

Ад групы вашых выбаршчыкаў — ХОЦІНА. Мінск».

«Дарагі Станіслаў Станіслававіч, не паддавайцеся на правакацыі партакратаў. Выбаршчыкі, народ з Вамі.

Сем'і МАКАРЭВІЧ, ДЗЕРБАН, ШАЎЦОВЫ, МУДРАГЕЛАВЫ і іншыя выбаршчыкі. Мінск».

«Да глыбіні душы абураныя правакацыйнай антынароднай дзейнасцю камуністычнай большасці ў Вярхоўным Савеце. Выказваем Вам, Станіслаў Станіслававіч, сваю самую гарачую падтрымку. Вы былі і застаяцеся гонарам і сумленнем беларускай нацыі.

Сям'я БАБІЧ. Глыбокае Віцебскай вобласці».

* * *

Такіх зваротаў былі сотні — з усіх куткоў Беларусі, з вялікіх гарадоў і глыбінных вёсачак, ад рабочых і выкладчыкаў, ад студэнтаў і пенсіянераў... Супраць Шушкевіча выказаліся, здаецца, толькі два ці тры аўтары.

Безумоўна, аналіз гэтай пошты не мог прэтэндаваць на статус сацыялагічнага даследавання. І ўсё ж сама па сабе напрошвалася выснова: народ зрабіў свой выбар.

Гаворка тут, вядома, не толькі пра асобу Станіслава Шушкевіча. Народ зрабіў цвёрды выбар на карысць

рашучага рэфармавання ўсіх сфераў грамадскага жыцця. І яму, падобна, імпануе менавіта той шлях, які спавядае Шушкевіч: без новых барыкад, без гвалту, без крыві... І хай сабе тыя, каму б хацелася адкінуць грамадства ў часы ўсемагутнасці Сістэмы, нават здолеюць атрымаць яшчэ колькі лакальных перамог,— час улады гэтых людзей усё адно катастрафічна мінае. Эпоха запатрабавала кіраўнікоў іншага складу, іншага мыслення — здольных правесці карабель пад назвай Беларусь праз шторм крызісу курсам да вольнага, справядлівага, заможнага жыцця, аб якім так даўно мараць на гэтай шматпакутнай зямлі.

І шмат хто на Беларусі звязвае надзеі са Станіславам Шушкевічам...

* * *

Выбліснула з-за хмар сонейка, высвеціла медныя ствалы гонкіх прыбярэжных сонаў, заіскрылася на нарачанскіх хвалях.

Ідылія!

Не трэба нікуды спяшацца, раз-пораз кідаць вокам на гадзіннік, старанна ўзважваць кожную фразу. Бы на нейкай іншай планеце застаўся ўвесь той тлум — чуйныя парламенцкія ды журналісцкія мікрафоны, бесцырымонныя вочкі тэлекамер, неўтаймоўныя тэлефонныя апараты,— усё тое, што трымае як у абцугах, не дае ні на хвіліну расслабіцца, перавесці дух.

Палітык рэдка належыць самому сабе. І бязвоблачныя, ціхамірныя хвіліны ў ягоным жыцці гэткія ж нячастыя, як вось гэты сонечны выбліск сярод дажджлівага, свінцова-пахмурнага жніўня 1993-га.

* * *

Урэшце, і апошнія тыдні перад адпачынкам прайшлі для Шушкевіча адносна спакойна, без непрыемных сюрпрызаў і стрэсавых сітуацый. На Беларусі ўсталяваўся на нейкі час палітычны штыль. Пасля баталій XII сесіі дэпутаты раз'ехаліся хто куды: адны спяшаліся набрацца новых сіл у санаторыях, іншых захліснулі гаспадарчыя клопаты — пад дажджамі гінуў ураджай, у многіх калгасах і саўгасах паліўныя цыстэрны стаялі напярэдадні жніва зусім пустыя. Праўда, месяцы за два да таго ўрад запэўніў, што наконт паставак нафты паразуменне з расіянамі будзе, і тая заява супакоіла Шушкевіча — хоць, як потым высветліцца, дарэмна. Пакуль жа Прэзідыум Вярхоўнага Савета нетаропка абмяркоўваў руцінныя

пытанні, да якіх раней не даходзілі рукі. 14 ліпеня, у прыватнасці, вырашылі ўсталяваць дыпламатычныя стасункі з Ямайкай...

Адметнымі ж у ліпені 1993-га былі, бадай, дзве падзеі.

8-га ў Мінску адкрыўся I з'езд беларусаў свету. На Бацькаўшчыну з'ехаліся сотні людзей, якіх лёс — найчасцей жорсткі, драматычны — раскідаў некалі па розных кутках планеты. У камуністычныя часы пра гэтых людзей стараліся не згадваць, калі ж афіцыйная прапаганда і заводзіла гаворку пра беларусаў-эмігрантаў, то звычайна запісвала іх усіх без разбору ў лік здраднікаў. Многія ўжо і не спадзяваліся, што ступяць калі-небудзь на родную зямельку. Але часы памяняліся — і вось Радзіма шчыра, цёпла вітае сваіх далёкіх сыноў і дачок, што здолелі зберагчы на чужыне зайздросную пашану да роднай мовы, культуры, гісторыі, пранеслі праз доўгія гады разлукі пяшчотную любоў да бацькоўскага краю.

У Шушкевіча былі напагатове некалькі аркушаў з тэкстам для выступу. Але ў кулуарах з'езда, адразу ж трапіўшы ў шчыльнае кола ўзрушаных людзей, што наперабой імкнуліся пацiснуць руку, змахвалі набягаўшыя міжволі сентыментальныя слязінкі,— ён адчуў, што будзе гаварыць іначай. Не, на паперцы ўсё было правільна, узважана, грунтоўна — але ж, як стала цяпер зразумела, занадта казённа, афіцыйна. А трэба, каб словыляглі на душу, прагучалі ва унісон акрыленаму, рамантычна-прыўзнятаму настрою тых, хто тут сабраўся.

Пасля выступу яму доўга апладзіравалі, і па тварах прысутных лёгка было пераканацца, што гэта зусім не дзяжурныя воплескі.

Другой неардынарнай падзеяй ліпеня стаў візіт у Злучаныя Штаты. Шушкевіч аказаўся адным з першых сярод кіраўнікоў былых савецкіх рэспублік, якога афіцыйна прыняў у Белым доме прэзідэнт Клінтан. Гэтым запрашэннем наймагутнейшая дзяржава Захаду імкнулася падкрэсліць, што ёй даспадобы цвёрды намер маладой незалежнай краіны добраахвотна пазбавіцца ядзернага арсеналу і што на гэтым шляху маленькая Беларусь можа разлічваць на ўсебаковую дапамогу вялікай Амерыкі. Што і засведчыла падпісаная ў Вашынгтоне сумесная дэкларацыя аб адносінах паміж дзвюма краінамі. Злучаныя Штаты паабяцалі дапамогу ў дэмілітарызацыі, рэфармаванні эканомікі, пераадоленні наступстваў Чарнобыля.

Шушкевіча па-добраму ўразіла надзвычайная праста-

та, натуральнасць паводзін амерыканскага прэзідэнта: ні ценю пыхі, ганарыстасці (якія часам так, прабачце, і пруць з нашых дробных наменклатурных сошак) — Клінтан вёў гутарку з адкрытай, прываблівай усмешкай, абсалютна нязмушана, як са старым добрым прыяцелем. («Ну проста свой, беларускі хлопец!» — скажа потым Шушкевіч.) Адна толькі акалічнасць азмрочыла тыя дні: трагічна загінуў лепшы сябар амерыканскага прэзідэнта. Клінтан, аднак, не адмяніў сустрэчу з Шушкевічам, а толькі прапанаваў перанесці яе час.

На развітанне ж гаспадар Белага дома падарыў госцю ігральныя карты. Спадарожнікі жартавалі: «Бачыце, Станіслаў Станіслававіч, ЦРУ ведае нават, што вы калекцыяніруеце». Ну, а палітычныя апаненты выкарысталі гэту акалічнасць для ядавітага іранізавання: вось, маўляў, і ўсё, з чым вярнуўся з-за акіяна наш шаноўны спікер...

Замежныя паездкі Шушкевіча ўвогуле надзвычай іх раздражнялі. Не раз гучала: у нас, маўляў, заводы без сыравіны стаяць, каровы без корму, а ён, бач, з візітамі шастае (гучала ж гэта, дарэчы, пераважна з вуснаў тых, хто непасрэдна адказваў і за сыравіну, і за кармы). Такім чынам прарывалася не толькі непрыязнасць да самога Шушкевіча, але і застарэлая, убітая ў свядомасць у эпоху «жалезнай заслоны» ваяўнічая ксенафобія. Носьбіты гэтага заскарузлага мыслення нават з парламенцкай трыбуны неаднойчы на поўным сур'ёзе даводзілі, што ледзь ці не ўсе нашыя эканамічныя беды — вынік падрыўной дзейнасці нейкіх заморскіх «цэнтраў»...

Пра сапраўдныя ж прычыны крызісу Шушкевіч даволі жорстка (хоць падстава была святочная) сказаў пасля вяртання са Штатаў падчас выступлення па тэлебачанні і радыё 27 ліпеня — у той дзень споўнілася тры гады Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі: «...адсутнасць ліберальна-дэмакратычных традыцый, карумпаваная сістэма кумаўства і блату ў кабінетах улады, недахоп прафесіянальных (ды і проста адукаваных) палітыкаў з прагматычным стылем работы не спрыяюць спакойнаму і эфектыўнаму ходу рэформ... Былая партыйная наменклатура хацела б захаваць за сабой уладу, больш таго — зрабіць яе бескантрольнай. Гэтым, у першую чаргу, тлумачацца і спробы на апошняй сесіі перападпарадкаваць КДБ выканаўчай уладзе, адхіліць ад пасады Старшыню Вярхоўнага Савета і стварыць непераадольныя перашкоды на шляху ўмацавання асноў доўгатэрміновага супрацоўніцтва са Злучанымі Штатамі

Амерыкі. Небяспека саюза былой партнаменклатуры, разбагацеўшай на перапродажы дзяржаўнай маёмасці, і мафіёзных камерцыйных структур павялічваецца».

Што і казаць, чарговая гадавіна Дэкларацыі аб суверэнітэце не давала асаблівых падстаў для трыумфавання. Больш таго, менавіта ў тыя дні старая наменклатурная гвардыя, зблакаваўшыся з маладымі неакамуністамі, пачала актыўна разгортваць працэс, які лідэр апазіцыі Зянон Пазьняк з уласцівай яму рэзкасцю і афарыстычнасцю ахарактарызуе так: «Каб застацца хоць на рэшту часу пры ўладзе, яе прадстаўнікі гатовы прадаць нашу дзяржаву ў палон Расіі».

* * *

Кансерватыўнаму беларускаму істэблішменту, які ўсё мацней сумаваў па часах СССР, падалося тады, што дні Барыса Ельцына ў крэсле расійскага прэзідэнта ўжо злічаны. Сапраўды, ягоныя палітычныя праціўнікі хутка акрыялі ад шоку жніўня 1991-га, калі быў разгромлены камуністычны путч. Іх парламенцкае ядро, адчуўшы сваю моц і згуртаванасць, пачало заўзята тарпедаваць рэформы, скандальна правальваць адну за адной Ельцынавы ініцыятывы. На ролю вярхоўнага галоўнакамандуючага антыельцынскага фронту спакусіўся былы паплечнік прэзідэнта па барацьбе з путчыстамі — спікер расійскага Вярхоўнага Савета Руслан Хасбулатаў. Улада — страшны наркотык. І паплечнік стаў ворагам. Не разумеючы, што ім карыстаюцца толькі як разменнай фігурай, уявіўшы сябе богам на палітычным Алімпе, Хасбулатаў пайшоў на жорсткую, бескампрамісную канфрантацыю з Ельцыным. Той пачаў атрымліваць адну за адной цяжкія маральныя аплявухі...

Наступ праціўнікаў Ельцына ў Расіі акрыліў іх беларускіх братоў па духу. Пачалося актыўнае мацаванне кантактаў. У жніўні ў белакаменную накіроўваецца група эмісараў беларускай парламенцкай большасці. Перамовы з Хасбулатавым і ягонымі таварышамі па барацьбе праходзяць у цёплай, сяброўскай атмасферы.

Дарэчы, сам Хасбулатаў яшчэ за некалькі месяцаў да таго, у красавіку, прылятаў у Мінск на «рэкагнасцыроўку». Напярэдадні патэлефанаваў у прыёмную Шушкевіча. Той вельмі не жадаў прымаць у сябе, як змушаў да таго пратакольны этыкет, расійскага калегу-спікера, што да тае пары ўжо кінуў Ельцыну пальчатку. Але сакратарка, забыўшыся на тайнае Шушкевічава ўказанне («Мяне няма!»), машынальна

ўключыла прамую сувязь. Давялося даць згоду на сустрэчу. Гаворка двух спікераў у Мінску прайшла суха, нацягнута, і, падобна, абодва былі надзвычай задаволеныя, што гэтае фармальнае рандэву хутка скончылася. Хасбулатаў жа, трэба меркаваць, неўзабаве адвёў душу з іншымі суразмоўцамі.

Скаардынаваўшы намаганні, расійскія і беларускія ваяры за рэстаўрацыю савецкай звышдзяржавы дзейнічалі ўсё больш самаўпэўнена, агрэсіўна. Разгарнулася масіраваная прапагандысцкая апрацоўка радавых суграмадзян. На Беларусі, у прыватнасці, скарысталі ў якасці фальшывага козыра ў гэтай палітычнай гульні жорсткі паліўны голад, што апанаваў рэспубліку тым летам. Ранейшыя абяцанкі ўрада Кебіча, што нафта да жніва будзе, сталіся пустым гукам. Расія, натуральна, не жадала больш за «дзякуй» перапампоўваць сваё чорнае золата згалелай, няздольнай разлічыцца малодшай сястрыцы. Але ўрад, які давёў рэспубліканскую эканоміку да ручкі, намаганнямі свайго парламенцкага ды газетнага лобі клапатліва выводзіўся з зоны крытыкі. Затузанаму ж незлічонымі нягодамі абывацелю падсоўваўся прасценькі тэзіс: ва ўсім вінаватыя тыя, хто «злачынна разваліў Саюз» у Белавежскай пушчы. Трэба скінуць іх, бязлітасна пакараць і дружным шыхтом, спяваючы эсэсэсэраўскі гімн, рушыць у светлае мінулае — на берагі запаветнага мора таннай нафты і гарэлкі...

Сярод пустэльні эканамічнага крызісу шмат каму хацелася верыць у гэты міраж.

* * *

Над Нараччу ж усё цяжэй навісалі хмары. У пераносным сэнсе — таксама. Апаненты Шушкевіча скарысталі сітуацыю, каб зноў перамыць ягоныя костачкі: жніво зрываецца без паліва, палову Палесся заліла паводка, а вышэйшая службовая асоба рэспублікі, бач ты, прахалоджваецца ў цяньку...

Шушкевіч мусіў перарваць адпачынак. Начны цягнік імчыць яго ў Маскву на тэрміновую сустрэчу з Ельцыным. Трэба неяк адбіць папрокі, быццам ён, Шушкевіч, нічога не робіць дзеля эканамічнай рэінтэграцыі з Расіяй, хоць, калі разабрацца, гэта перш за ўсё клопат кіраўніка ўрада, а не парламенцкага спікера, амплуа якога — накіроўваць заканатворчы працэс, ствараць належную прававую прастору для рэфарматарскай дзейнасці выканаўчай улады. Але прагрэсіўныя законы тармозяцца якраз урадавым лобі, Саўмін зусім не пакутуе ад рэфарматарскага свербу, а

ў выніку менавіта яго, Шушкевіча, робяць нечым накшталт японскай гумавай лялькі для лупцоўкі...

І беларускі спікер, і расійскі прэзідэнт адчувалі ў тыя дні адно і тое ж: іх метадычна, бязлітасна заганяюць у кут, каб расправіцца парай рашаючых udараў. Розніца ж была ў тым, што магутныя прэзідэнцкія паўнамоцтвы давалі Ельцыну непараўнальна больш магчымасцяў адбівацца і контратакаваць, тым самым трохі стрымліваючы і палітычных праціўнікаў Шушкевіча.

Двое лідэраў, лёсы якіх цесна знітавала белавежскае пагадненне, вядома ж, не сталі афішаваць у прэсе ўсе дэталі той сваёй жнівеньскай гаворкі. Вярнуўшыся ў Мінск, Шушкевіч скупа далажыў на прэс-канферэнцыі: «Я не хадзіў туды з працягнутай рукой... Думаю, мы вырашылі пытанне аб крэдытных лініях, якія забяспечаць Беларусь нафтай і газам у значна большай ступені, чым гэта ёсць на сённяшні дзень. Але я хачу заявіць, што звышкатэгарычных змен у гэтым не будзе... Трэба жыць па сродках!» Пытанне ж: чаму ездзіў у Маскву цягніком? — ён парыраваў трохі змрочным жартам: «А вы хацелі, каб я паехаў на танку?»

Пасля цягніка Шушкевіча чакаў верталёт: Старшыня Вярхоўнага Савета наведаў пацярпелыя ад паводкі мясціны Палесся.

Масква ж і сапраўды скаланецца неўзабаве ад ляскату танкавых гусеніцаў...

* * *

У верасні процiборства дзвюх галінаў улады ў расійскай сталіцы стала нагадваць паядынак на самым краі прорвы. Па прыкладу хасбулатаўскай кааліцыі дзейнічала і дэпутацкая большасць на Беларусі. Яе правадыры адкрыта пракламавалі намер дэнансаваць белавежскае пагадненне (маючы на ўвазе і адпаведныя наступствы для яго ных ініцыятараў). Беларускі прем'ер Вячаслаў Кебіч, які таксама меў грэх пакінуць у свой час аўтограф на тым злашчасным дакуменце, паспяшаўся пасыпаць галаву попелам і публічна выказаўся за стварэнне Савецкага Саюза «ў абноўленым выглядзе» (праўда, потым, калі кан'юнктура рэзка змяніцца, народу будзе растлумачана, што гэта блытанікі-журналісты не так інтэрпрэтавалі словы прэм'ера).

Шушкевіч, здавалася, нарэшце адчуў, што ў гэтай сітуацыі адзіна магчымым відам абароны застаецца адчайны наступ ў адказ. Ён тэрмінова збірае газетчыкаў на прэс-канферэнцыю, потым выходзіць у прамы эфір рэспубліканскага тэлебачання і радыё. Гэтакай жорсткай

крытыкі ўрада з ягоных вуснаў, бадай, яшчэ не чулі... Хопіць шукаць ахвярнага казла, досыць валіць з хворай галавы на здаровую! — такі быў лейтматыў моцных, эмацыянальных выказванняў спікера. Ён яшчэ раз зазначыў, што суверэннасць Беларусі «не мае ніякага дачынення да ізаляцыі, не перашкаджае, каб мы цесна ўзаемадзейнічалі эканамічна, гандлёва. І калі ісці ў тым накірунку, што быў азначаны ў Віскулях, будзе тое цеснае ўзаемадзеянне, аб якім мараць людзі». Іншая справа, што ўрад замест таго, каб напаўняць канкрэтыкай ужо заключаныя ў рамках СНД эканамічныя пагадненні, плодзіць адзін за адным нейкія манілаўскія праекты — накшталт «траістага эканамічнага саюза «славянскіх рэспублік былога Саюза. «Як у анекдоце — навошта мыць брудных дзяцей, калі прыемней рабіць новых»,— з саланаватым гумарам рэзюмаваў Шушкевіч. Адзначыўшы, што «дылетантаў ва ўрадзе больш чым трэба», ён лагічна прапанаваў гаварыць сёння не аб адстаўцы спікера, а «аб іншай адстаўцы, аб тых, што мелі ў сваіх руках усю паўнату выканаўчай улады, але прывялі рэспубліку да цяжкага стану».

Такіх рэзкіх, тэмпераментных выпадаў у бок Кебіча ад Старшыні Вярхоўнага Савета, які дагэтуль старанна вуаліраваў свае нелады з прэм'ерам, яўна не чакалі. Прэса, адразу ж правёўшы паралель з расійскай сітуацыяй, узбуджана загаманіла пра такі ж самы, як і там, канфлікт дзвюх галінаў улады. Але параўнанне, безумоўна, кульгала. Хаця б таму, што Ельцын меў, як-ніяк, згуртаванае кола адданых саратнікаў-збраяносцаў, Шушкевіч жа мусіў амаль што ў адзіноце трымаць два фронты — супраць кансерватыўнага ўрада і супраць кансерватыўных дэпутатаў. З адпаведнымі шанцамі ацалець...

Падзенне Ельцына, безумоўна, паскорыла б і развязку палітычнай драмы Станіслава Шушкевіча.

Але маскоўскія падзеі пайшлі па іншым сцэнарыі. Процiборства дзвюх непрымірымых сіл закруціла крывавую, д'ябальскую інтрыгу...

* * *

Кажуць, што Ельцынава цярпенне лопнула пасля таго, як Хасбулатаў публічна шчоўкнуў пальцам па горле, намякаючы на любоў прэзідэнта да моцных напояў. Калі і так, то, зразумела ж, гэты фрывольны жэст стаў толькі апошняй кропляй, што перапоўніла чашу. Ружжо, якое даўно ўжо вісела перад вачыма гледачоў на маскоўскай палітычнай сцэне, рана ці позна павінна было стрэліць.

21 верасня 1993 года сваім указам № 1400 Ельцын скасоўвае паўнамоцтвы з'езда народных дэпутатаў і Вярхоўнага Савета Расіі і прызначае на снежань выбары ў новы орган заканадаўчай улады — Федэральны сход. Парламент у сваю чаргу кваліфікуе прэзідэнцкі ўказ як дзяржаўны пераварот, аб'яўляе аб прыпыненні паўнамоцтваў Ельцына і прыводзіць да прысягі ў якасці «в. а. прэзідэнта» аднаго з паплечнікаў Хасбулатава — былога лётчыка, удзельніка афганскай вайны, а потым віцэ-прэзідэнта краіны Аляксандра Руцкога. Напружанне дасягае апагею...

Шушкевіч (як і парламенцкая апазіцыя БНФ), не вагаючыся, падтрымаў дзеянні Ельцына, накіраваў яму адпаведную тэлеграму. За што адразу ж трапіў пад жорсткі прэсінг — у большасці членаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі быў іншы погляд на маскоўскія падзеі.

— Фактычна Прэзідыум паставіў мне ультыматум: асудзіць крокі Ельцына,— распавёў потым Шушкевіч.— Але я адразу даў зразумець, што ніякіх антыельцынскіх заяў падпісваць не буду. І мае апаненты мусілі ў рэшце рэшт пайсці на праўкі ў падрыхтаваным імі (пераважна, наколькі я ведаю, Дзмітрыем Булахавым) тэксце заявы Прэзідыума з нагоды расійскіх падзей. У выніку ўся іх задума практычна была зведзена на нішто.

Сапраўды, у канчатковым, апублікаваным толькі 25 верасня выглядзе заява ўяўляла сабой абсалютна выхалашчаны прадукт цяжкога кампрамісу: ніякіх ацэнак, толькі заклапочанасць драматычнай сітуацыяй у суседзяў — пачуццё, якое аднолькава шчыра маглі дэклараваць нават зацятыя палітычныя непрыяцелі. Хоць гэта, вядома ж, ні на ёту не зближала іх поглядаў.

Хацелася верыць, што ў Маскве абыдзецца ўсё ж без крыві. Але... хасбулатаўцы дзёрзка атакуюць мэрыю, затым бяруць на аўтаматныя мушкі тэлецэнтр «Астанкіна». Першыя ахвяры...

І вось — жахлівая развязка, бясстрасна паказаная на цэлы свет усюдыіснымі апаратамі Эн-Бі-Сі: танкі б'юць прамой наводкай па Белым доме. З вокнаў атачонага парламента паўзе густы чорны дым. Снарады, выпушчаныя аднымі расіянамі, рвуць на шматкі целы іншых расіян. Цэнтр Масквы. Канец дваццатага стагоддзя. Жудасны сон...

* * *

Шушкевіч цяжка, пакутліва перажываў маскоўскую трагедыю. Але для ягоных апанентаў усё было ясна як

Божы дзень: даўно і метадычна складаемы імі рэестр смяротных грахоў беларускага спікера папоўніўся яшчэ адным радком: падтрымка «крывавага дыктатара» Ельцына. Праўда, паражэнне маскоўскіх мяцежнікаў на нейкі час зблытала карты беларускай парламенцкай большасці. Яна акрыяе духам у снежні, пасля расійскіх выбараў, калі высветліцца, што дэмакраты пацярпелі фіяска і новы тамтэйшы парламент абяцае стаць для Ельцына, бадай, яшчэ мацнейшым арэшкам.

* * *

Шушкевічу звычайна не падабаліся журналісцкія параўнанні палітыкі са спартыўнымі адзінаборствамі. Ён зазначаў прыкладна так: я не імкнуся перамагчы коштам нечага паражэння, я хачу, каб выйгралі ўсе...

На жаль, палітыка амаль ніколі не дае такой магчымасці і рамантызм у ёй дорага каштуе. На справе стасункі паміж парламенцкай большасцю і спікерам усё болей нагадваюць назіральнікам знясільваючы баксёрскі бой, які зацягнуўся даўжэй, чым чакалі. Даўно ўжо бачна, на чыім баку перавага ў грубай і яраснай моцы, але прыціснуты да канатаў праціўнік нейкім цудам ухіляецца чарговы раз ад свінцова-бязлітаснага ўдару — за імгненне да выратавальнага гонга.

Праўда, выратавальная паўза — толькі да наступнага раунда. І з лагера сваіх жа балельшчыкаў гучаць горкія папрокі: нельга адно бараніцца, трэба рызыкаваць і ісці ў контратаку, у такіх паядынках нічыіх не бывае... А ў іншым лагеры тым часам пракручваюцца тактычныя варыянты: як жа правесці нарэшце рашаючы, сакрушальны, накаўтуючы ўдар?

* * *

На XII сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі, на пачатку чэрвеня 1993 года, адбылася падзея, якую мала хто прыкмеціў, аддаючы ўвагу палкай дыскусіі аб калектыўнай бяспецы. Мусячы неяк рэагаваць на трывогу грамадскасці: «наменклатура рабуе дзяржаву!»,— парламент абвясціў аб стварэнні часовай камісіі для вывучэння дзейнасці камерцыйных структур, дзеючых пры рэспубліканскіх і мясцовых органах улады і кіравання. Старшынёй камісіі абралі дэпутата Лукашэнку.

Сіплаваты, заўжды з гнеўнымі ноткамі голас Аляксандра Лукашэнкі, дырэктара саўгаса «Гарадзец» Шклоўскага раёна, аматары радыётрансляцый з сесій Вярхоўнага Савета вызначалі к таму часу ўжо беспамылкова з першай фразы. Ён рваўся да мікрафона пры

любой нагодзе, гаварыў хоць часам і не па тэме, але заўсёды палымяна. А галоўнае — кожны раз некага клеймаваў, выкрываў. І такім чынам закранаў патрэбныя струны ў душах тых грамадзян, што надзвычай любяць простыя сацыяльныя рэцэпты: вось чарговы вораг, яго трэба сцерці ў кулеш, і тады ўсім стане добра... З цягам часу ўлюбёнай мішэнню для філіпік Лукашэнкі стала асоба Станіслава Шушкевіча. Паколькі першы не выбіраў слоў, то другі, паддаючыся натуральным чалавечым эмоцыям, пачаў раз-пораз адказваць таксама колкімі рэплікамі, а то па праву спікера і перапыняў апанента, кваліфікуючы чарговы выпад як абразу... Іх стасункі сталі, мякка кажучы, не самымі цёплымі. Падтрымліваючы кандыдатуру Лукашэнкі на пост старшыні часовай камісіі (якая потым атрымала ў народзе спрошчаную назву «антымафіёзнай»), Шушкевіч спадзяваўся ўпотай, што такім чынам нястрымная энергія ягонага зацятага апанента накіруецца ў іншае рэчышча, што няўрымслівы змагар, раскапаўшы красамоўныя факты з патаемнага жыцця наменклатуры, увойдзе ў клінч з парламенцкай большасцю...

Але атрымалася зусім інача. Арэол бясстрашнага барацьбіта з мафіяй надзвычай узняў уласныя амбіцыі Лукашэнкі. Ён адчуў сябе рэальным прэтэндэнтам на пакуль што гіпатэтычнае, але ўжо вельмі магчымае прэзідэнцкае крэсла. Адным з наймацнейшых канкурэнтаў на гэтым шляху ўяўляўся, безумоўна, Станіслаў Шушкевіч.

І канфрантацыя паміж старшынёй «антымафіёзнай» камісіі і Старшынёй Вярхоўнага Савета перайшла ў яшчэ больш вострую, бескампрамісную фазу.

Лукашэнка пачаў раз за разам з пафасам заяўляць, што Шушкевіч нібыта ўсяляк перашкаджае працы ягонай камісіі. І хоць пераканаўчых доказаў не прыводзіў, абывацель згодна са сваёй логікай ужо мог рабіць выснову: ага, калі так, то ў каго-кольвечы рыльца, відаць, таксама ў пуху...

Тыя, хто даўно марыў зваліць Шушкевіча, толькі паціралі далоні: здаецца, удача сама бяжыць да іх у рукі.

* * *

9 лістапада 1993 года пачалася чарговая сесія Вярхоўнага Савета Беларусі — трынаццатая па ліку. Вось і не вер пасля гэтага ў прыкметы: менавіта яна, трынаццатая, стане для Шушкевіча апошняй у ролі спікера. Хоць, калі сур'ёзна, справа была зусім не ў чортавым тузіне — адбылося тое, што рана ці позна мусіла адбыцца...

Перад пачаткам сесіі было яскрава прадэманстравана, што дзеля дыскрэдытацыі дэмакратычных сілаў могуць ужывацца любыя метады. З'явіліся невядома дзе і кім сфабрыкаваныя ўлёткі, у якіх ад імя Народнага фронта і патрыятычнай арганізацыі «Беларускае згуртаванне вайскоўцаў» пракламаваліся заклікі да ўзброенага выступлення супраць уладаў. Усчалася сапраўдная істэрыя: маўляў, апазіцыя рыхтуецца ледзь ці не перастраляць сваіх непрыяцеляў проста ў парламенцкай зале... У дзень адкрыцця сесіі Дом урада густа ачапілі вайскоўцамі. Вядома ж, ніякіх баевікоў ніхто і ў вочы не ўбачыў... Але кругі ад кінутага каменя разыходзіліся яшчэ доўга.

Шушкевіч выступіў на сесіі з дакладам, у якім канстатаваў: нягледзячы на ўсе перашкоды, заканадаўчая база для рэфармавання эканомікі — хай сабе і не ідэальная — створана. Далейшае залежыць перш за ўсё ад урада, ягонай волі і кампетэнтнасці. Грунтоўна выклаў старшыня парламента і сваё бачанне эфектыўных шляхоў выхаду з крызісу.

Аднак урадавыя кіраўнікі, уздымаючыся на трыбуну, не давалі ніякай падставы западозрыць іх у жаданні карэнным чынам мадэрнізаваць старую, няўклюдную дзяржаўную эканоміку. Іх ідэяй фікс да таго часу стала аб'яднанне грашовых сістэм Беларусі і Расіі. Яшчэ ў верасні таго года прэм'ер Вячаслаў Кебіч падпісаў у Маскве адпаведнае пагадненне з расійскім калегам Віктарам Чарнамырдзіным. Урадавая прэса Беларусі гучна рэкламавала мяркуемую грашовую унію як панацэю для нацыянальнай эканомікі: маўляў, зальёмся таннай нафтай, касяком пойдуць з Расіі выгадныя прамысловыя заказы... І толькі малалікая апазіцыя стаяла на сваім: адбываецца цынічны, злачынны распродаж суверэнітэту, ператварэнне Беларусі ў калонію магутнай усходняй суседкі!

Шушкевіч у гэтай сітуацыі, мяркуючы па усім, не рызыкаваў выклікаць на сябе дадатковы агонь: прапановы зняць яго з пасады і так паспелі ўжо неаднойчы прагучаць і на гэтай, трынаццатай сесіі. Праўда, пакуль што былі толькі імпульсіўныя выпады найбольш гарачых адзіночак: парламенцкая большасць не спяшалася «завесціся». Адчувалася: вытрымліваецца прадуманая паўза... Гэтым разам рэжысёры кіравалі спрытней, чым на папярэдняй сесіі.

Праўда, іх задумы ледзь не зблытаў нечаканы бунт кіраўнікоў двух сілавых ведамстваў — міністра ўнутраных спраў Уладзіміра Ягорава і старшыні Камітэта

дзяржбяспекі Эдуарда Шыркоўскага. Гэтыя законапаслухмяныя дзяржаўныя служачыя вышэйшага рангу, якіх ніколі не адносілі да стану апазіцыянераў, але па праву лічылі сумленнымі, вопытнымі прафесіяналамі, нечакана ўсталі на дыбкі — у сваім адкрытым лісце, які абляцеў рэспубліканскую прэсу, яны сказалі ўсё, што думаюць, пра бесцырымонны, грубы дыктат у адносінах да іх ведамстваў з боку неканстытуцыйнай, на іх погляд, структуры — Дзяржсакратарыята па нацыянальнай бяспецы і барацьбе са злачыннасцю, створанага ў свой час у складзе беларускага Саўміна. Гэтая структура, як вынікала з сэнсу адкрытага ліста, імкнецца паставіць на калені, падмяць пад сябе сілавыя ведамствы, каб стаць усеўладнай, забяспечыць ураду поўную бескантрольнасць.

Але адкрыты ліст стаў «гласом вопиющего в пустыне». Ягораў і Шыркоўскі імгненна трапілі ў апалу, іх пачалі бязлітасна дзяўбсці з усіх бакоў... Праз колькі тыдняў яны развітаюцца са сваімі пасадамі. А ўслед надыдзе і чарга Шушкевіча...

* * *

### Адступленне. Аўтарскі «допыт» (красавік 1994 года)

— *Станіслаў Станіслававіч, а ці не варта было вам тады ўсё ж паспрабаваць неяк абараніць Ягорава і Шыркоўскага? Робячы свой рызыкоўны крок, кідаючы пальчатку магутным сілам, яны, відаць, разлічвалі і на вашу падтрымку, а ў выніку засталіся, мяркуючы па ўсім, расчараванымі і пакрыўджанымі...*

— Памятаеце: у свой час я паспрабаваў сказаць сваё слова ў дыскусіі аб калектыўнай бяспецы. І што ж? На пасяджэнні Савета бяспекі апынуўся адзін супраць усіх. І ў сітуацыі з сілавымі міністрамі важкасць майго слова была б гэткай самай. Так, я прамаўчаў, бо іншае было абсалютна бессэнсоўна. Ні Ягораў, ні Шыркоўскі — а я іх лічу вельмі і вельмі сумленнымі, патрыятычна зарыентаванымі людзьмі і прафесіяналамі высокага класа — не задавальнялі большасць. І тым самым іх службовы лёс быў перадвырашаны...

* * *

З набліжэннем таго дня, калі на сесіі павінен быў выступіць са справаздачным дакладам кіраўнік «антымафіёзнай» камісіі, ажыятаж і ў парламенцкай зале, і ва ўсім грамадстве нарастаў. Лукашэнка інтрыгаваў

публіку заявамі пра тое, што камісія сабрала цэлыя «чамаданы кампрамату» на вельмі вялікіх шышак.

14 снежня, калі Лукашэнка нарэшце ўзняўся на трыбуну, Шушкевіча ў Авальнай зале не было: напярэдадні ён тэрмінова вылецеў у Ташкент. З якой нагоды — прэс-служба Вярхоўнага Савета не тлумачыла...

На людзей недасведчаных даклад зрабіў сапраўды моцнае ўражанне — з выкрывальніцкім пафасам былі названыя дзесяткі імёнаў даволі важных «птушак», якія, па глыбокім перакананні дакладчыка, добра набілі валлякі з дзяржаўнай кармушкі.

Але калі распачаліся спрэчкі, высветлілася: ладная частка «кампрамату» — гэта не што іншае як сякера, знойдзеная пад лавай. Дакладней — пад «лавамі» МУС, КДБ, Пракуратуры. І праваахоўныя органы ў многіх выпадках ужо прымаюць адпаведныя захады па высветленых імі — менавіта імі! — фактах. Назваць жа каго б там ні было злачынцам можа суд і толькі суд, а не парламенцкая камісія, хай сабе і такая грозная ды бескампрамісная. А яшчэ адна частка «кампрамату» на вачах развалілася бы картачны дамок, калі на трыбуну сесіі пачалі ўзнімацца заклеймаваныя ў дакладзе службовыя асобы і аргументавана адмятаць прыцягнутыя за вушы абвінавачванні. У каго-кольвечы галоўны барацьбіт з мафіяй мусіў адразу ж прасіць прабачэння. Маўляў, так, хлопцы, трохі пагарачыўся, лес сякуць — трэскі ляцяць...

Гэта акалічнасць, аднак, Лукашэнку не збянтэжыла. На прэс-канферэнцыі ў той самы дзень ён заявіў, што «яшчэ не вечар», не ўсе козыры раскрытыя — у прыватнасці, «каб не гаварыць за вочы», давялося выключыць з тэксту даклада інфармацыю пра грахі шаноўнага спікера. Урэшце, намёк на характар грахоў быў зроблены: рамонтна-будаўнічае ўпраўленне Саўміна шчыравала, маўляў, на чатырох «аб'ектах», запісаных «на імя Шушкевіча»...

У наступныя два дні парламент нагадваў вулей, у які кінулі палаючую галавешку. Лукашэнка зноў узяў слова і стаў выграбаць з «чамаданаў» новыя порцыі «кампрамату». У прыватнасці, была «агучана» чарнавая даведка пра дзейнасць РБУ Саўміна, з чаго вынікала, што Шушкевіч нібыта недаплаціў за выкананыя па ягоных заказах работы.

Абвінавачаныя дэпутаты і службовыя асобы адзін за адным рваліся да мікрафонаў, каб даць гнеўны «адлуп». Лукашэнка не заставаўся ў даўгу. Усчаўся даволі непрыгожы абмен слоўнымі аплявухамі. У рэшце рэшт,

каб не ладзіць пасмешышча на ўсю краіну, вырашылі перапыніць трансляцыю...

Шушкевіч, які да таго часу ўжо вярнуўся з Ташкента і заняў крэсла ў Авальнай зале, стрымліваўся як мог, хоць збоку было добра бачна, чаго гэта яму каштуе. У рэшце рэшт нервы, відаць, не вытрымалі: падчас чарговай філіпікі Лукашэнкі старшыня парламента загадаў адключыць мікрафон. У Авальнай зале ўсчаўся нябачаны вэрхал... Пасяджэнне было сарвана.

Калі пасля перапынку дэпутаты зноў сабраліся ў зале, Шушкевіча сярод іх ужо не было. Прагучала інфармацыя: ён шпіталізаваны з дыягназам «гіпертанічны крыз».

Неўзабаве ўсё той самы няўрымслівы Лукашэнка заявіць, што старшыня парламента сімулюе хваробу, і дэпутат Рыгор Вячэрскі мусіць зачытаць медыцынскую даведку, з якой большасць прысутных на сесіі ўпершыню дазнаецца, што Шушкевіч пакутуе ад перыядычнага павышэння артэрыяльнага ціску яшчэ з 1981 года, а 20 снежня 1993-га, у прыватнасці, лекарскі манометр зафіксаваў у хворага скачок ціску да 190 на 110 міліметраў ртутнага слупа...

З-за хваробы Шушкевіч не здолее паляцець у Ашгабат на чарговы саміт лідэраў СНД — беларускую дэлегацыю ўзначаліць Вячаслаў Кебіч (які, вярнуўшыся, не праміне яшчэ раз закрануць ужо зашмальцаваную тэму падпісання-непадпісання дагавора аб калектыўнай бяспецы: маўляў, тую форму, у якой гэта нібыта зрабіў Шушкевіч, кіраўнікі іншых дзяржаў не прызнаюць...).

Сесія ж у адсутнасць спікера неўзабаве перапыніць працу, і дэпутаты раз'едуцца на калядныя вакацыі, адклаўшы фінал «сацыяльнага спектакля» (выраз Зянона Пазьняка) на другую палову студзеня наступнага года. Праўда, да перадкаляднага разбору андатравых шапак у парламенцкім гардэробе быў закладзены арганізацыйны падмурак далейшых дзеянняў: у кулуарах Вярхоўнага Савета распачаўся збор подпісаў за адстаўку ягонага кіраўніка. Хтосьці ставіў свой аўтограф са шчырай ахвотай, кагосьці з прадстаўнікоў «балота» давялося настойліва агітаваць, камусьці, падобна, паабяцалі «тое за тое»... Слупок подпісаў хутка рос, і ўжо можна было з пачуццём глыбокага задавальнення канстатаваць, што фінал спектакля пойдзе як па маслe,— тым самым масле, што для соцень тысяч радавых грамадзян рэспублікі паспела ўжо стаць амаль неверагоднай раскошай на навагоднім стале.

* * *

## Адступленне. Аўтарскі «допыт» (красавік 1994 года)

*— Калі вы адчулі, што адстаўка непазбежная? Ці, можа, да апошняга моманту цеплілася-ткі надзея, што ўсё неяк абыдзецца, што нейкім цудам тая чаша вас міне?*

— Не, ніякіх ілюзій не было ўжо летам 1993-га. Цудам хутчэй варта лічыць тое, што адстаўка не адбылася раней. І справа не ў Лукашэнку — пракамуністычная большасць выкарыстала б любую даўбешку.

Калі я канчаткова ўпэўніўся, што ўсё перадвырашана, заставалася адна мэта — не дапусціць, каб быў сарваны візіт Клінтана на Беларусь, запланаваны на студзень 1994-га. З маёй адстаўкай гэты візіт рабіўся б немагчымы. Я ж лічыў яго надзвычай важным для нашай краіны, для перспектыў яе інтэграцыі ў сусветную супольнасць. І вырашыў, што хоць тут не дам сябе перайграць...

Дарэчы, калі вяртацца яшчэ далей назад, варта зазначыць, што ў свой час праз наша Міністэрства замежных спраў рабіліся вялікія высілкі, каб на чале беларускай дэлегацыі ў Штаты паляцеў Кебіч. Я тады ад амерыканскага пасла даведаўся, што наш галоўны дыпламат Краўчанка, як кажуць, касцьмі клаўся, каб запрашэнне з Вашынгтона было адрасавана менавіта кіраўніку ўрада. Але яно прыйшло, як вы ведаеце, усё ж да мяне... І калі мы знаходзіліся ў Вашынгтоне ў ліпені 1993-га, я выразна ўсвядоміў яшчэ адну рэч: на перамовах за мяжой — калі гаворка ішла, напрыклад, пра крэдыты для рэфармавання эканомікі — пэўныя нашы высокапастаўленыя прадстаўнікі гаварылі адно, а вярнуўшыся дадому, рабілі зусім іншае. Прасілі грошы, не шкадуючы рэфарматарскіх абяцанак, а ў выніку толькі памнажалі дзяржаўны доўг (жахліва нават уявіць — за 1993 год ён падскочыў да мільярда долараў: палову запазычылі Захаду, палову — Расіі!). Эканоміка ж засталася па сутнасці старой і працягвае дэградаваць...

Пасля вяртання дэлегацыі з Амерыкі спадар Краўчанка зрабіў заяву, што візіт, маўляў, практычна безвыніковы. Хай гэта застаецца на ягоным сумленні. Я ж ганаруся, што ўдалося хоць у нейкай ступені прарваць інфармацыйную ізаляцыю, у якой знаходзілася Беларусь, што наш курс на поўнае ядзернае раззбраенне заваяваў такую павагу і ў ЗША, і ва ўсім свеце. А



Сустрэча Прэзідэнта ЗША Біла Клінтана ў аэрапорце «Мінск-2»

Клінтана, як вы ведаеце, я запрасіў наведаць нашу краіну.

Дык вось, як я ўжо сказаў, рабіліся ўсе захады, каб гэтаму перашкодзіць. І нават калі стала ясна, што амерыканскі прэзідэнт усё-такі едзе, барацьба працягвалася. Узняўся, напрыклад, страшэнны вэрхал з-за намеру Клінтана наведаць Курапаты. Нашы слаўныя ветэраны палічылі такі крок страшэннай для сябе абразай. Вядома ж, амерыканцам пра гэта адкрытым тэкстам не гаварылі. Дыпламатычна намякнулі: маўляў, няма ўпэўненасці, што ў Курапатах удасца забяспечыць належны ўзровень аховы. Але ж амерыканцы — людзі разумныя... Ад шэфа бяспекі Клінтана неадкладна прыйшоў факс: маўляў, ніколькі не сумняваемся, што ўсё будзе «о'кей».

Урэшце быў дасягнуты кампраміс. Памянялі месцамі пункты праграмы: напачатку Клінтан ускладае вянок да абеліска воінам і партызанам Вялікай Айчыннай на плошчы Перамогі, а потым ужо накіроўваецца аддаць даніну памяці курапацкім ахвярам.

Я лічу, гэта быў прыгожы візіт. Усе галоўныя перамовы выпала весці мне, і думаю, што падчас іх, пры ўсёй павазе да магутнай заакіянскай дзяржавы, Беларусь не выглядала ўгодлівай, прыніжанай беднай сваячкай.

— *Няцяжка здагадацца, што, калі вы гаварылі з Клінтанам з вока на вока, прагучалі і зусім канфідэнцыйныя рэчы...*

— Я на ўсіх этапах перамоў падкрэсліваў, што Беларусь — самастойная дзяржава, і, мяркую, той бок добра адчуваў мяжу, перасячэнне якой магло б кваліфікавацца як спроба ўмяшання ў нашыя ўнутраныя справы. Разам з тым, безумоўна, я хацеў як мага больш аб'ектыўна абмаляваць той няпросты, супярэчлівы пераходны стан, у якім знаходзіцца пакуль што наша дзяржаўнасць. Для мяне было важна, каб Амерыка адчула давер да Беларусі, упэўнілася, што тут ёсць здаровыя, прагрэсіўныя сілы, якія шчыра імкнуцца да інтэграцыі ў міжнароднае супольніцтва. Аднак у любых абставінах я лічу недапушчальным, ганебным для палітыка станавіцца перад некім на калені з працягнутай рукой, незалежна ад таго, куды працягваць руку — на Захад ці на Усход. І тут мой гонар, маё сумленне — чыстыя.

Безумоўна, яшчэ не надышоў час публічна распавядаць пра ўсе дэталі той прыватнай гаворкі з Клінтанам і гэткай самай папярэдняй гутаркі з дзяржсакратарам ЗША Крыстаферам. Гэта не значыць, што ёсць нейкія таямніцы, пра якія ніхто ніколі не даведаецца. Усё зафіксавана ў пратаколах, што захоўваюцца ў адпаведных нашых архівах. Дарэчы, гэта не былі, строга кажучы, дыялогі тэт-а-тэт. Побач знаходзіўся перакладчык, але такі, што стопрацэнтна гарантуе канфідэнцыйнасць. Пройдзе час, і ўсё будзе абнародавана — так, як гэта звычайна і робіцца ў практыцы міжнародных зносін.

* * *

А візіт і сапраўды быў прыгожы. І ягоным апафеозам (тут гэтае ўрачыстае, узнёслае слова якраз дарэчы) стала сустрэча Клінтана з мінчукамі на плошчы Перамогі.

Пасля таго як лёг вянок да абеліска, Шушкевіч па-англійску прапанаваў амерыканскаму прэзідэнту павітаць ветэранаў. (Увогуле, трэба заўважыць, прафесару Шушкевічу найчасцей даводзілася мець справу з вузкаспецыяльнымі навуковымі тэкстамі на гэтай мове,

а ў размоўным жанры віртуозам ён зусім сябе не адчуваў, але тут патрэбная фраза склалася неяк сама па сабе — і надзвычай дарэчы.)

Клінтан — элегантны, усмешлівы, падобны ў сваім доўгім чорным паліто і беласнежнай кашулі на дыры-жора — рушыў да натоўпу, што цясніўся за металічнымі бар'ерамі вакол плошчы, і пачаў пацiскаць рукі — адну, дзве, дзесяць, дваццаць... Мінчукі навалiліся на бар'еры, наперабой працягваючы далоні для жаданага поціску; бедакі-міліцыянты, тытанічна напружваючы мускулы, ледзь стрымлівалі гэты парыў; узмакрэлыя агенты спецслужбаў, як чаўнакі, снавалі ў людскім віры, і можна было толькі ўявіць, як шалёна калаціліся іх прасякнутыя звышсуровай адказнасцю сэрцы... І было яскрава бачна, што ў тым людскім парыве няма ні кроплі халопства, што гэта, бы крынічны струмень, прарываецца з нетраў чалавечых душ шчырае пачуццё павагі да лідэра вялікай нацыі, якая здолела пабудаваць для сябе заможнае і вольнае жыццё, і ў прагных поцісках рук пульсавала гарачая вера, што гэткае самае дастойнае жыццё здолеюць пабудаваць і беларусы.

Было відавочна, што распісаная да хвіліны праграма візіту ўжо трашчыць па ўсіх швах, але не было тае сілы, што магла разарваць гэты спантанна замкнёны энергетычны ланцуг яднання чалавечых душаў. І Клінтан працягваў агінаць аточаную бар'ерамі плошчу, і поціскі рук па-над гэтымі жалезнымі перагародкамі дарылі рэпарцёрам фенаменальныя кадры-сімвалы.

Шушкевіч у тыя хвіліны заставаўся па-за рамкамі рэпарцёрскіх відашукальнікаў. Ён ішоў трохі паводдаль услед за амерыканскім прэзідэнтам, і мала хто бачыў, што ў ягоных вачах свяціліся адначасова і радасць і сум...

А тым часам высокага госця ўжо чакала зала беларускай Акадэміі навук...

* * *

## Адступленне. Аўтарскі «допыт» (красавік 1994 года)

*— Сустрэчу з Білам Клінтанам у Акадэміі навук трансліравала беларускае тэлебачанне. І ўсё ж нешта цікавае, мусіць, засталося па-за кадрам?*

— Калі на плошчы Перамогі была сустрэча, так бы мовіць, эмацыянальная, то тут, у Акадэміі,— сэнсоўная.

Дарэчы, не абышлося без кур'ёзаў. Прадстаўнік Акадэміі спачатку трымаў уступнае слова па-англійску, а потым сказаў тое самае па-беларуску. Клінтан

занепакоіўся (відаць, вырашыў, што ў нас няма адпаведнай тэхнікі): маўляў, няўжо мяне таксама будуць «падаваць» у два прыёмы? Я кажу: не турбуйцеся, будзе сінхронны пераклад праз навушнікі. Тады ён супакоіўся...

І яшчэ: хоць задумвалася сустрэча менавіта з маладымі інтэлектуаламі (папярэдне ішла гаворка, што для дэпутатаў, у прыватнасці, узроставай мяжой будзе 1956 год нараджэння), у зале ў рэшце рэшт апынулася багата асоб, што зусім не адпавядалі першапачатковаму «цэнзу». Бо напярэдадні пачалі патрабаваць для сябе месцы члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета, потым — члены ўрада... Карацей, выявілася псіхалогія старых партыйных часоў: крый Божа не заняць ганаровае крэсла на чарговым мерапрыемстве — яшчэ падумаюць, што цябе перасталі паважаць у адпаведнасці з санам...

* * *

Але Клінтан, трэба меркаваць, дакладна ведаў, каму ў той зале трэба адрасаваць словы надзеі на дастойную будучыню беларускага народа.

Аглядальнік «Народнай газеты» не без вытанчанай з'едлівасці адзначыў у сваёй справаздачы: «Большасць аўдыторыі, а былі там пераважна маладыя навукоўцы, маладыя палітыкі і журналісты, культурная эліта, слухалі прэзідэнта ЗША, як гаворыцца, «жыўцом». У адрозненне ад дзяржаўных мужоў, што адразу пацягнуліся да навушнікаў з сінхронным перакладам. Як тут не згадзіцца з Білам Клінтанам, што гэтае новае, высокаадукаванае і таленавітае пакаленне і ёсць наша асноўная надзея!».

Але ля рычагоў рэальнай улады ў маладой краіне заставаліся на той момант пераважна людзі з навушнікамі...

## НЕЗАВЕРШАНЫ РАЗДЗЕЛ

Вось і ўсё.

Ён сышоў з трыбуны і, абмяняўшыся парай слоў з намеснікам, паволі рушыў да «закуліснага» выхаду з Авальнай залы — стомлены, трохі ссутулены ад нябачнага цяжару чалавек з вялікім маршчакаватым ілбом.

Даносчыкі-мікрафоны агучылі на ўсю рэспубліку ягоны яўна не разлічаны на такую аўдыторыю дыялог з намеснікам, што выглядаў прыблізна так:

— Хіба вы не застаяцеся на галасаванне? Ваш голас, дарэчы, таксама будзе ўлічвацца...

— Ат, ведаеце, мне ўжо ўсё адно... Паеду дадому!

Ён мог прадказаць вынікі, якія праз пару гадзін абнародуе падліковая камісія, з дакладнасцю практычна да голаса. Гэтаксама дакладна было ўсё пралічана і ягонымі праціўнікамі. Праз некалькі хвілін пачнецца тайнае галасаванне па пытанні аб змяшчэнні старшыні парламента з пасады. І 209 дэпутатаў выкрасляць у бюлетэнях ягонае прозвішча.

* * *

За некалькі дзён да таго, акурат у дзень прыбыцця ў Мінск амерыканскага прэзідэнта, парламенцкая большасць атрымала дзівосны падарунак. Цяжка сказаць, ці быў ён нечаканы — падаплёка падзеі так і засталася таямніцай за сямю пячаткамі. Фактам жа стала тое, што раніцай 15 студзеня са згоды кіраўнікоў беларускіх МУС і КДБ агенты літоўскіх спецслужбаў арыштавалі двух функцыянераў тамтэйшай нелегальнай кампартыі, якія хаваліся ў Мінску ад вышуку, абвінавачаныя ў злачыннай дзейнасці супраць суверэннай Літвы.

Іх беларускія браты па духу, з'ехаўшыся на парламенцкую сесію пасля калядных вакацый, адразу ж адсунулі ўбок усе запланаваныя пытанні і, выставіўшы за дзверы журналістаў, адключыўшы трансляцыю, аж на чатыры дні далі волю пачуццю святога гневу. З

глыбокім абурэннем асуджаючы дазвол на паланенне ў Мінску літоўскіх падпольшчыкаў, згадалі і пра зганьбаваны беларускі суверэнітэт, і пра міжнародныя каноны чалавечых правоў — карацей, менавіта пра тое, напамінак аб чым раней звычайна выклікаў у каго-кольвечы з выступоўцаў нешта падобнае на алергію. Зыход гэтага дружнага збівання на порхаўку міністра ўнутраных спраў і старшыні КДБ, бадай, ні ў кога не выклікаў сумненняў. Свярбела толькі адно пытанне: як такія мацёрыя прафесіяналы трапілі ў прымітыўную, дрэнна замаскаваную «воўчую яму»? Ды яшчэ пасля таго, як кінулі такі небяспечны выклік сваім нашумелым адкрытым лістом?

Больш зручнага выпадку, каб пакласці на плаху галовы апальных Ягорава і Шыркоўскага, не прыдумаў бы і сам д'ябал.

Лідэр Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады дэпутат Алег Трусаў перад тайным галасаваннем аб адстаўцы сілавых міністраў зазначыў у гутарцы з журналістам «Звязды»: «...Калі ім удасца пазбавіцца ад гэтых дзвюх асоб — яны праз некалькі дзён паставяць пытанне аб адстаўцы Шушкевіча. Шлях да поўнага захопу ўлады будзе адкрыты. План у іх адпрацаваны, і яны яго стараюцца выканаць».

Гэта гучала хутчэй нават не прагнозам, а проста канстатацыяй непазбежнага.

Па частцы ўзорнага выканання планаў «яны» заўсёды былі мастакамі.

* * *

У запланаваным парадку дэпутаты і вярнуліся да пытання, якое не здолелі «дабіць» перад калядамі,— аб нашумелым «антымафіёзным» дакладзе. Трэба ж было неяк рэагаваць на «кампрамат», прымаць пастанову, што дапамагла б у святым змаганні супраць «гідры карупцыі». І з падачы аўтара даклада большасць ахвотна прыйшла да высновы, што таму змаганню найбольш замінае... Старшыня Вярхоўнага Савета. Цвіком у праект адпаведнай пастановы быў забіты пункт аб адкліканні Станіслава Шушкевіча з займаемай пасады. Дзеля справядлівасці трэба дадаць, што праект прапаноўваў аналагічную меру пакарання і для прэм'ера Вячаслава Кебіча. Але апошняе, на думку многіх, рабілася толькі дзеля адводу вачэй: маючы ў парламенце магутнае лобі, Старшыні Саўміна не было чаго надта баяцца... Што і пацвердзіла потым галасаванне, па выніках якога Кебічава крэсла за ім жа і засталося.

Ну, а пра дзесяткі іншых важных персон, чые прозвішчы фігуравалі ў скандальным дасье Аляксандра Лукашэнкі, ніхто ўжо, здаецца, і не згадваў, тым болей, што не адна з тых персон якраз і засядала ў Авальнай зале...

Такім чынам у якасці свяшчэннай ахвяры на алтар барацьбы з карупцыяй кінулі неспрактыкаванага ў закулісных гульнях, мала прыстасаванага да «схваткі бульдогаў пад дыванам» ідэаліста-спікера. Яго адправілі ў адстаўку з фенаменальнай фармулёўкай — «у сувязі з непрыняццем мераў па барацьбе з карупцыяй, адсутнасцю кантролю за работай праваахоўных органаў і праяўленую асабістую нясціпласць». Асаблівае замілаванне выклікае гэтае «праяўленую» — для філолага бясспрэчны плеаназм, слова-паразіт, але ў дадзеным выпадку яно міжволі правакуе пытанне: а што, маглі б — і за «непраяўленую»? Дарэчы, апошні варыянт, бадай, болей адпавядаў бы ісціне, бо на момант галасавання абвінавачванне, быццам бы Шушкевіч за нешта там недаплаціў будаўнікам, было, прынамсі, не даказана, а пазнейшая грунтоўная праверка і ўвогуле дашчэнту развеяла той «кампрамат».

Але хіба кагосьці з праціўнікаў Шушкевіча хвалявала тады такая «дробязь» як прэзумпцыя невінаватасці? Пра яе згадаюць пазней, калі дэпутат-змагар Лукашэнка, увайшоўшы ў смак славы, не задаволіцца адведзенай яму роляю Шушкевічава «магільшчыка» і стане «падкопвацца» пад вышэйшых урадавых чыноўнікаў і саноўных парламентарыяў. Ён імгненна атрымае жорсткі адпор, а ягоную камісію проста скасуюць (што, зрэшты, толькі дадасць яму палітычных дывідэндаў напярэдадні прэзідэнцкай кампаніі). Светлую ж памяць пра «антымафіёзную» камісію ўвекавечыць частушачны фальклор:

Аляксандр Лукашэнка —
Беларуская ЧэКа:
Міліярды правароніў,
Скінуў Стася з-за цвіка.

Зрэшты, многія ініцыятары Шушкевічавай адстаўкі нават не ўтойвалі, што ім самім слаба верыцца ў тыя міфічныя цвікі, за якія ён нібыта не разлічыўся з казной. На прэс-канферэнцыі, што адбылася адразу ж пасля падвядзення вынікаў галасавання, вечарам 26 студзеня, дэпутат Віктар Ганчар спакойна канстатаваў: «Фармальныя падставы для адстаўкі Шушкевіча не супадаюць з рэальнымі прычынамі». І пераможна дэкламаваў: «паў першы «белавежскі зубр». Даведаўшыся пра гэтае выказванне, Шушкевіч неўзабаве ў

адным з інтэрв'ю падтрымае і дапоўніць метафару апанента: «Не мышы развважаць аб зубрыных па-водзінах».

Апазіцыя ж, ахарактарызаваўшы адстаўку як адзін з этапаў «паўзучага камуністычнага перавароту» (выраз Зянона Пазьняка), разам з тым дала даволі суровую ацэнку і старшынёўскай дзейнасці Шушкевіча. Галоўнымі былі папрокі ў нерашучасці, непаслядоўнасці, згодніцтве з пракамуністычнай большасцю.

Сам жа Шушкевіч на нейкі час з'ехаў з Мінска на дачу, каб трохі расслабіцца і спакойна сабрацца з думкамі. Праўда, шматлікія журналісты дапялі і туды. Прынамсі, можна было ў натуры прадэманстраваць ім «аб'ект», што трапіў у славутае «антымафіёзнае» дасье. «У гэтым доме амаль усё зроблена маімі ўласнымі рукамі,— тлумачыў гаспадар лецішча дасціпным працаўнікам пяра.— Але любому нармальнаму чалавеку зразумела, калі патрэбны зварачныя работы, тынкоўка, без майстроў не абысціся... Няма ніводнага рахунка, які б я не аплаціў. Калі хтосьці мяркуе, што тут усё робяць за капейкі, клянуся, гэта не так. Увесь мой заробак за апошнія два гады «лёг» у дачу. Жылі на жончыны грошы». На пытанне ж, чаму не даводзіў пра ўсё гэта на той чорнай для яго сесіі,— адказаў: «Уступаць у дыскусію па гэтым брудзе я лічу ніжэйшым за сваю годнасць. Тады, калі вы памятаеце, я сказаў на сесіі: маім дзецям за мяне чырванець не давядзецца. І палічыў, што гэтага дастаткова». А напрыканцы інтэрв'ю прызнаўся:

— Я шалёна стаміўся...

* * *

Але ўжо дзён праз дзесяць людзі ўбачылі іншага Шушкевіча — не стомленага, не прыціснутага цяжкімі думамі, а бадзёрага, энергічнага, упэўненага ў сабе. Першым пасля адстаўкі «выхадам у свет» стаў для цяпер ужо радавога дэпутата Шушкевіча публічны выступ у адной з аўдыторый Фрунзенскага раёна сталіцы, адкуль яго ў свой час і выбралі ў беларускі парламент. Былы Старшыня пацвердзіў сваё жаданне зноў уключыцца ў палітычную барацьбу.

Неўзабаве ён пачынае серыю паездак па краіне — Гомель, Брэст, Гродна, Барысаў, Віцебск... У залах, дзе Шушкевіч сустракаецца з суграмадзянамі,— не ўпасці яблыку. «Не ліпнуць да яго смехатворныя абвінавачванні ў асабістай нясціпласці,— канстатаваў у тыя дні аглядальнік «Народнай газеты».— Так што разборкі ў



Апошняя прамова Станіслава Шушкевіча на пасадзе Старшыні Вярхоўнага Савета. 26 студзеня 1994 года

сталіцы адгукнуліся для экс-спікера ў правінцыі, бадай, толькі павышэннем рэйтынгу».

Шушкевіч рэзка крытыкуе урад і парламент, выступае за іх тэрміновую адстаўку, хутчэйшае правядзенне новых выбараў у Вярхоўны Савет, аб'яднанне дзеля гэтай мэты ўсіх дэмакратычных сілаў Беларусі. Тры кіты, на якіх павінна трымацца тое адзінства, гэта, на думку Шушкевіча, дзяржаўнасць, дэмакратыя, рынак.

Тым часам парламент прымае нарэшце новую Канстытуцыю, якая прадугледжвае пасаду прэзідэнта, а неўзабаве з'яўляецца і закон аб прэзідэнцкіх выбарах. Хутка будзе абвешчана і іх дата — 23 чэрвеня 1994 года. Але да таго часу неафіцыйная перадвыбарная барацьба будзе ўжо ў разгары. Аб намеры падтрымаць у гэтай барацьбе Шушкевіча абвесціць блок дэмакратычных партый і рухаў «Вясна-94». Лідэры БНФ адрэагуюць на новыя палітычныя планы былога спікера холадна і нават з дрэнна схаваным раздражненнем, зноў нагадаўшы пра ягоныя ранейшыя «грахі» перад апазіцыяй. Народны фронт назаве сваім кандыдатам у прэзідэнты Зянона Пазьняка.

Увогуле ж прэтэндэнтаў на найвышэйшае дзяржаўнае крэсла акажацца на дзіва багата. Сімпатыі «левага» электарату нечакана апынуцца пад пагрозай раздраблення: у якасці патэнцыяльных канкурэнтаў Кебіча

(«пад» якога, на думку многіх, і прымаўся закон аб прэзідэнцтве) пачнуць вымалёўвацца фігуры ўжо добра вядомага Лукашэнкі, новага спікера — былога генерала міліцыі Грыба, каго-кольвечы яшчэ... На вылучэнца цэнтрысцкіх сіл стане прэтэндаваць мэр Маладзечна дэпутат Карпенка.

Шушкевіч з самага пачатку выдатна разумеў, што ягонае «другое прышэсце» ў палітыку зусім не стане бесклапотным шпацырам. І ўсё ж — рушыў...

* * *

## Адступленне. Аўтарскі «допыт» (красавік 1994 года)

— *Вы з зайздроснай хуткасцю «залячылі раны», адаптаваліся да ролі простага дэпутата, хоць, падобна, не збіраецеся задавальняцца ёю ў перспектыве... Што, дапамагло сабрацца з сіламі, адкуль гэтае моцнае «другое дыханне»?*

— А ў мяне, ведаеце, даволі вялікі вопыт адставак. Ён пачаўся з 1946 года, з піянерскага лагера ў Прылуках, дзе мяне абралі старшынёю савета атрада. Неўзабаве гэтая пасада прыйшлася мне не да густу, бо я павінен быў перастаць быць самім сабой...

Яшчэ адна своеасаблівая адстаўка адбылася, калі я пакінуў пасаду прарэктара радыётэхнічнага інстытута, бо не жадаў удзельнічаць у цкаванні сумленных, таленавітых навукоўцаў, а змагацца супраць лініі рэктара не ставала моцы. Цяпер, праўда, думаю, што тое маё адступленне было памылкай...

Увогуле ж адстаўка ў палітыцы — рэч звычайная, тут не трэба рабіць трагедыі. І званне «простага» дэпутата, за якога прагаласавалі некалі тысячы і тысячы суграмадзян, для мяне, паверце, вельмі ганаровае. Дый увогуле я, відавочна, значна менш сабою асабіста захапляюся, чым вы можаце падумаць.

— *Тады, 26 студзеня, вы нават не сталі чакаць вынікаў галасавання...*

—...бо ведаў, якія яны будуць. Прыхапіў па дарозе асабістыя рэчы са службовага кабінета і паехаў дадому. Там сабраў сяброў, і мы, так бы мовіць, падвялі рысу...

— *Кажуць, у вас адразу адабралі службовую машыну, знялі на кватэры спецсувязь, ахову...*

— Што да машыны, то не зусім так: я і цяпер магу выклікаць легкавік з гаража Вярхоўнага Савета, гэтае права прадугледжана адпаведным законам. Іншая справа, што гэтым не злоўжываю, хоць тыя, каму заўсёды

нешта мроіцца, адразу ж сталі падазраваць, што я езджу цяпер па гарадах рэспублікі на казённых «колах»...

Спецсувязь на кватэры сапраўды адключылі ўмомант, тут усё правільна. Па хлопцах жа з аховы толькі сын трохі пасумаваў, бо паспеў з імі моцна пасябраваць. На журналісцкія ж пытанні, ці не баюся за сваю бяспеку, адказваю: не хвалюйцеся, я «ўзброены і вельмі небяспечны».

Ну, а гарадскі тэлефон я ў той вечар сам адключыў — каб не распачалася ў хаце завочная прэс-канферэнцыя.

— *Як успрыняла навіну жонка?*

— Спакойна. Яна даўно была падрыхтаваная. Толькі вось цяпер кажа: ну нашто, маўляў, ты зноў лезеш...

— *Але ж вы не адмовіцеся ад барацьбы за прэзідэнцтва?*

— Калі мяне вылучаць, я буду змагацца. Сёння я падрыхтаваны не толькі тэарэтычна, але і практычна. Добра ўяўляю, якімі метадамі можна эфектыўна змагацца супраць антырэфарматарскіх сіл. Схема адгортвання іх ад улады, за якую яны ўчапіліся мёртвай хваткай, мне зараз добра зразумелая. А адгортваць трэба, бо нельга рабіць рэформы рукамі тых, хто гэтыя рэформы не падтрымлівае.

— *Шмат хто з дэмакратаў папракнуў вас за тое, што вы недастаткова рашуча змагаліся з кансерватарамі на пасадзе Старшыні Вярхоўнага Савета... А ваш палітычны лёс хто-кольвечы параўноўвае з лёсам Гарбачова, якога ў свой час таксама шмат крытыкавалі за непаслядоўнасць, палавіністасць рашэнняў, лавіраванне...*

— Хачу падкрэсліць адно сваё катэгарычнае адрозненне ад Гарбачова: той быў пры магутнай уладзе і імкнуўся яе захаваць, я ж пры такой уладзе ніколі не быў, вось што самае цікавае. Так, спікер у нас фармальна з'яўляецца вышэйшай службовай асобай краіны, а практычна... Я, напрыклад, не меў права нікога ні зняць з наменклатурнай пасады, ні прызначыць на яе, увогуле не меў доступу да рычагоў выканаўчай улады. Спікер — гэта чалавек, які толькі кіруе тымі, хто піша законы... І хіба можна такога чалавека параўноўваць з некалі амаль што ўсеўладным генсекам-прэзідэнтам Гарбачовым? Хіба што, у нейкай ступені,— у сэнсе знешнепалітычнай дзейнасці. І я ганаруся, што за апошнія тры гады пра Беларусь даведаліся ў свеце, што да яе добра ставяцца...

Пытанні ж рэфармавання эканомікі, напрыклад, я мог толькі выносіць на абмеркаванне ў парламенце, што і рабіў сістэматычна. А ўрад усё рабіў па-свойму, бо рэформы — яго магільшчык.

Ну на якія больш рашучыя крокі я мог пайсці? Перавысіць свае канстытуцыйныя паўнамоцтвы? Па-першае, хто б мне дазволіў, а па-другое, такім шляхам мы ніколі не пабудуем дэмакратычную прававую дзяржаву... Выйсці мітынгаваць на плошчу? Для Старшыні Вярхоўнага Савета метад, мякка кажучы, нязручны. Вось цяпер гэта зручна, што я і раблю, каб арыентаваць думку беларусаў у патрэбным накірунку.

— *Як прымае вас аўдыторыя ў новай ролі?*

— Красамоўная ў гэтых адносінах — сустрэча ў Барысаве з людзьмі, якіх у свой час намеснік старшыні гарвыканкама Трусаў абяцаў, калі будуць скардзіцца на жыллёвыя ўмовы, «згнаіць у бараках». Удалося ўсё ж такі гэтых людзей перасяліць, і вось зараз яны мяне сустракалі з хлебам і соллю. Здаецца, я ўпершыню ў жыцці адчуў іх сапраўдны смак...

Сустрэчу ж гэтую ў Барысаве ўсяляк імкнуліся забараніць лідэры тамтэйшых камуністаў. Нават тады, калі яна была ў самым разгары, разыгралі спектакль: з'явіўся кіраўнік раённай міліцыі і прапанаваў «освободить всем помещение, так как здесь заложена мина». Я звярнуўся да залы: «Ну, што, пасмяёмся разам?» Пасмяяліся і далей размаўляем. І вы ведаеце, як адрэагаваў на гэта той жа Іван Іванавіч Трусаў: маўляў, каб Шушкевіч клапаціўся аб людзях, хіба дазволіў бы ён праводзіць гэту сустрэчу, калі існуе пагроза выбуху?

Несумленнасць стала для многіх уладу маючых галоўным сродкам дасягнення мэтаў. Такая філасофія ў барысаўскіх бальшавікоў, якія там валодаюць усім. Але людзі ўсё бачаць і добра разумеюць, хто ёсць хто. Я вельмі, напрыклад, баяўся, што ў Гродне — пасля контрагітацыі па радыё — людзі не прыйдуць да мяне. Але зала была забіта цалкам. І такі высокі ўзровень культуры, адукаванасці, беларускасці! Праўда, і супрацьстаянне адпаведнае — ветэранская кагорта. Але прыемна, што пляскалі ў далоні і ветэраны, калі прымалі рэзалюцыю. Так што і іх можна вывесці з таго зману, у які іх заводзяць.

Маё цвёрдае перакананне: наменклатура і партыя ўлады заўсёды спрытна выкарыстоўвалі супярэчнасці ў дэмакратычных рухах. Калі знайсці спосаб аб'яднаць дэмакратычны рух на Беларусі на адной перадвыбарнай платформе, не сумняваюся, што дэмакраты б перамаглі,

і мы б пайшлі па шляху рэфармавання. Маё найпершае жаданне зараз — дасягнуць адзінства дэмакратаў. Многія гэта трактуюць так, што я хачу, каб яны вылучылі мяне кандыдатам у прэзідэнты. Схіляюся да думкі, што ўся дэмакратычная плынь рэспублікі павінна вылучыць аднаго кандыдата. І таго, верагоднасць абрання якога найбольшая.

Аб'яднанне гэта можа адбыцца на падставе трох пазіцый усіх дэмакратычных рухаў — беларускай дзяржаўнасці, дэмакратыі і рынку. Думаю, БНФ, на жаль, будзе выступаць як асобная сіла, але гэта не значыць, што нельга знайсці спосаб узаемадзеяння і каардынацыі намаганняў.

*— Цяперашняе кіраўніцтва Вярхоўнага Савета зазначае, што парламент, маўляў, пачаў працаваць дружна, эфектыўна, многія пытанні ўдалося зрушыць з мёртвай кропкі. Ці падзяляеце вы гэты аптымізм?*

— Большасць цяпер адкрыта паказвае, што яна большасць. Мне здаецца, што трэба чакаць і антырэфарматарскіх захадаў. Мячэслаў Грыб у сваім першым на пасадзе спікера інтэрв'ю газеце «Правда» заявіў: мы не будзем будаваць капіталізм, але мы будзем развіваць свабоднае прадпрымальніцтва. Гэта азначае наступнае: мы не будзем рабіць у доме светла, але ўключым электрычныя асвятляльнікі. Такія супярэчлівыя заявы на такім узроўні!

Я б сказаў так: мы не павінны дапусціць, каб быў антаганістычны, ненародны капіталізм. Дзяржава павінна рэгуляваць, каб уладальнікамі маёмасці былі не адзін, не пяць, а 60—70 працэнтаў жыхароў рэспублікі. Трэба правесці такую прыватызацыю. Ну, а проста так дэклараваць лозунгі... Многія дэпутаты быццам бы і хочуць нешта рэфармаваць, але не хочуць адрачыся ад таго, што дала ім папярэдняя ўлада. Не могуць расстацца з размеркавальнай сістэмай, паколькі ім вельмі падабаецца размяркоўваць.

Стан эканомікі сёння абвальны. Больш за тое, ствараюцца ўмовы для агрэсіўнай люмпенізацыі. Людзі шмат дзе атрымліваюць грошы, нічога не робячы. Чалавек павінен патрабаваць справядлівую заработную плату за тое, што ён зрабіў. А ўтрымліваць чалавека, здольнага працаваць, і плаціць яму заробак за кошт тых, хто добра працуе,— значыць, рабіць утрыманства афіцыйнай з'явай.

Дзяржава, калі яна няздольна ў межах дзяржаўнай маёмасці забяспечыць функцыянаванне прадпрыемстваў, павінна ісці на прыватызацыю аб'ектаў. Паглядзіце,

што зрабіў Баладзюр у Францыі. Ён падняў пытанне аб прыватызацыі самых прэстыжных дзяржаўных карпарацый. А мы баімся. У той жа час аддаём на кабальных умовах газаправод расійскаму капіталу. Гэта ганебная палітыка ўрада, які аддае тое, што можа Беларусі прынесці вялікія грошы, аддае, каб зараз атрымаць сродкі і тут жа іх праесці. Такая палітыка накіравана на ліквідацыю беларускай дзяржаўнасці, на кабальную залежнасць ад нашага ўсходняга суседа. Толькі маласвядомы ўрад можа такую палітыку праводзіць.

Наконт аб'яднання грашовых сістэм. Першай пазіцыяй павінна быць пытанне аб мытным саюзе, калі гэтага няма — няма ніякай патрэбнасці ў такім аб'яднанні. Расія, быццам злавіўшы тую рыбку на вуду — а рыбка даволі-такі вялікая, выцягнуць адразу цяжка,— вымучвае яе цяпер. Мы на трыццаць экю болей за сусветны кошт плацім за тону нафты, і яе цана ўкладаецца ў асноўным у тую прадукцыю, якая ідзе ў Расію, сабекошт яе шалёны, яна робіцца неканкурэнтаздольнай. Мы руйнуем сваю прамысловасць. Урад здае пазіцыю за пазіцыяй. Таму я гавару прама: з гэтым урадам да самастойнай Беларусі прыйсці немагчыма.

— *Якім вам бачыцца далейшае развіццё падзей?*

— Калі дэмакратычныя сілы аб'яднаюцца і змогуць растлумачыць большасці люду Беларусі, у чым справа — а я выступаў перад прадстаўнікамі розных партый і ўпэўніўся, што інтэлігенцыя ўсведамляе складанасць сітуацыі,— калі здолеюць павесці за сабой народ, то ён зможа адхіліць ад улады старую наменклатуру. У Беларусі шмат здольных людзей, якія могуць яе павесці па шляху рэфармавання. І я буду імкнуцца ўсё рабіць для таго, каб перамогу атрымаў менавіта такі варыянт. Хаця рэакцыянеры імкнуцца ўсё рабіць для таго, каб застацца пры ўладзе.

Прыняцце Канстытуцыі — гэта вялікі зрух наперад, хаця некалькі пазіцый там мне і не падабаецца, як і ў законе аб выбарах прэзідэнта. Канстытуцыя дае прэзідэнту надзвычай вялікія правы, і на яе падставе ён можа шмат чаго здзейсніць — як у накірунку дэмакратычным, так і ў накірунку антыдэмакратычным. Гэта, я б сказаў, двухбаковавостры меч, і вельмі важна, каб ён трапіў у рукі сумленнага высокамаральнага і кампетэнтнага палітыка. Ва ўсякім разе, ва ўрад ужо не здолеюць трапіць цемрашалы, калі не будзе цемрашалам сам прэзідэнт.



Галоўнае — не спыняцца...

*— І калі азірацца на вашу палітычную кар'еру...*

— Прабачце, што перабіваю, але навошта я буду азірацца? Лічу, што ўсё галоўнае яшчэ наперадзе. Статус пенсіянера мяне пакуль што не задавальняе. Пасля адстаўкі я меў шмат розных прапаноў, але вырашыў, што буду займацца палітычнымі і эканамічнымі даследаваннямі, напрыклад, у якім-небудзь створаным у рэспубліцы фондзе. Так што крыж на палітыцы ў любым выпадку ставіць не збіраюся. І напрацаваны ў свой час палітычны капітал мне зараз добра дапамагае. Некалі, напрыклад, мне даводзілася тыдзень ездзіць па Германіі, каб у рэшце рэшт сустрэцца з асобай высокага дзяржаўнага рангу. Цяпер, хоць я і не пры пасадзе, атрымліваю шмат запрашэнняў за мяжу, і кожны раз праграма прадугледжвае самы высокі ўзровень сустрэч. Таму, незалежна ад вынікаў маючых адбыцца выбараў, спадзяюся, што яшчэ здолею папрацаваць на карысць Беларусі...

* * *

Гэты дыялог адбываўся не ў самых спрыяльных умовах: у кватэры Шушкевіча раз-пораз звінеў тэлефон, заходзілі людзі з «каманды», а ў рэшце рэшт гаспадар, папрасіўшы прабачэння, мусіў закончыць гутарку — час ужо быў спяшацца на чарговую сустрэчу з выбаршчыкамі.

У блакноце засталося шмат пытанняў, да якіх гаворка не дайшла. Зрэшты, можа гэта і натуральна, што кніга пра лёс Станіслава Шушкевіча пакуль што не дапісана...

# ПАСТСКРЫПТУМ

Мы не ставілі на мэце напісаць капітальную, акадэмічную працу ў жанры палітычнай біяграфіі.

Гэта менавіта журналісцкая работа. Пісалася яна даволі хутка, і напэўна ж, не абышлася без тых ці іншых шурпатасцяў.

Толькі не палічыце, што мы гналіся за кан'юнктурай. Іншая справа, што, безумоўна ж, у кнізе прысутнічае пэўны аўтарскі суб'ектывізм. Наўрад ці мы ўзяліся б пісаць працу пра чалавека, да поглядаў і ўчынкаў якога няма ніякіх сімпатый. У кагосьці з чытачоў, натуральна, адрозныя меркаванні і пра Станіслава Шушкевіча як палітычную асобу, і пра тыя падзеі, у віраванні якіх ён апынуўся ў апошнія гады.

Так, сёння ён ужо не Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі, а «просты» дэпутат. Але ж маштаб асобы вызначаецца не пасадай. І бясспрэчна, што Шушкевіч застаецца адной з самых яркіх, неардынарных фігур у палітычным жыцці нашай краіны. Ён не лічыць сваю палітычную біяграфію скончанай.

Як там ні было б, але ягонае імя стала за апошнія гады шырока вядома не толькі на Беларусі, а і ў свеце. І ў той жа час мала хто ведае пра перыпетыі лёсу гэтага чалавека, які прыйшоў у палітыку, адолеўшы ўжо ладны кавалак жыццёвай дарогі.

Мы пастараліся падрабязна распавесці менавіта пра той, папярэдні адрэзак ягонай біяграфіі. Што ж тычыцца апошніх гадоў, то аўтары не імкнуліся пералічыць усе шматлікія мерапрыемствы, у якіх давялося ўдзельнічаць Шушкевічу як кіраўніку дзяржавы. Пра ход работы кожнай парламенцкай сесіі, прыняцце тых ці іншых законаў, афіцыйныя сустрэчы і візіты дастаткова шмат звестак ў газетных падшыўках гэтага часу.

Мы ж паспрабавалі адлюстраваць толькі найбольш важныя, драматычныя моманты палітычнага лёсу Станіслава Шушкевіча, распавесці пра малавядомыя

дэталі асобных падзей (напрыклад, звязаных з падпісаннем пагаднення ў Белавежскай пушчы), а таксама трохі прыадчыніць заслону асабістага жыцця чалавека, стаўшага лідэрам дзяржавы.

Спадзяёмся, што такім чынам дапаможам чытачам больш поўна, рэльефна ўявіць сабе аблічча гэтага чалавека, адчуць, чаму ён менавіта такі, чым дыхае, што ў яго за душою.

Нам жа, у сваю чаргу, вельмі дапамаглі ўспаміны самога героя, ягоных сваякоў, сяброў, былых калег-навукоўцаў. Шчыры дзякуй усім ім за ахвяраваны дзеля гэтага час і цікавыя факты.

Вядома, абапіраліся мы і на публікацыі калег-журналістаў, так ці інакш звязаныя з асобай Шушкевіча.

Вось так і атрымалася гэтая кніга. Напрыканцы ж апошняга раздзела пастаўлена не кропка, а шматкроп'е. Далейшы сюжэт дапіша само жыццё.

*Красавік 1994 г.*

# ЗМЕСТ

Трывожны світанак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Школа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
Выбар пуцявіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Кафедра . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Гарачы красавік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Белавежская пушча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Дайсці да Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
Подых навальніцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Незавершаны раздзел . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 161
Пастскрыптум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 173

Масава-палітычнае выданне

**КЛАСКОЎСКАЯ** Людміла Уладзіміраўна,
**КЛАСКОЎСКІ** Аляксандр Уладзіміравіч

**СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ: ПУЦЯВІНА ЛЁСУ**

**Партрэт палітыка, навукоўца, чалавека**

Рэдактар *А. І. Саламевіч*
Мастацкі рэдактар *І. А. Дзямкоўскі*
Фатаграфіі *С. В. Грыца, С. М. Плыткевіча, В. М. Фядосенкі*
Тэхнічны рэдактар *М. І. Ванкевіч*
Карэктары Л. А. Адамовіч, *Л. І. Жылінская*

Вёрстка выканана на кап'ютэрнай тэхніцы выдавецтва «Полымя». Падпісана да друку 25.05.94. Фармат 84x108 1/32. Папера друкарская. Гарнітура "Тип Таймс". Афсетны друк. Ум. друк. арк. 9,24. Ум. фарб.-адб. 9,45. Ул. выд. арк. 9,20. Тыраж 12000 экз. Выд № 9252. Зак. 990.
Выдавецтва «Полымя» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 432. 220600, Мінск, пр. Машэрава, 11
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23

**Класкоўская Л. У., Класкоўскі А. У.**

К47 Станіслаў Шушкевіч: пуцявіна лёсу: Партрэт палітыка, навукоўца, чалавека.— Мн.: Полымя, 1994.— 175 с.: іл.

ISBN 985-07-0061-0.

У кнізе расказваецца пра вядомага навукоўца і палітычнага дзеяча Станіслава Шушкевіча.

Шырокаму колу чытачоў.

**К $\frac{3230000000 - 025}{М\ 306(03) - 94}$ Без аб'яўл.** **ББК 66.3(4Беи)6**